Беларуская газэта
Naša Niva

# НАША НІВА

№4
сьнежань 1991
кошт 1 рубель

**БІЗНЭС І НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ** с. 3

*1992. Карціна году ў рэтраспэктыве некаторых юбілейных датаў* с. 4-5

**Алесь Разанаў** Новая Паэма с. 6-7

**Наталі Сарот** *трапізмы* с. 17-23

**Асабістыя кантакты зь гітляроўцамі дапамагалі ратаваць ад сьмерці людзей**
*Зоя Каўшанка — пра жыцьцё ў Вільні пад нямецкай акупацыяй* с. 2, 14-15

**ДЗЁНЬНІК** *Максіма Багдановіча* с. 4-5



## З Новым Годам!

*Усім супрацоўнікам і карэспандэнтам, падпішчыкам і чытачам, усім прыяцелям* Нашае Нівы *Рэдакцыя пасылае свае шчырыя зычэньні й павіншаваньне з Новым 1992-м Годам.*

*За што, цікава, падымем мы свае келіхі ў гэтую ноч зь сёлета налета? За новае шчасьце? Але ці станецца наступны год шчасьцем... За новую волю? Але ці станецца наступны год воляй для нас... За новую Беларусь? Але мы яшчэ так мала зрабілі дзеля таго, каб чакаць плёну ўжо ў наступным годзе...*

*А падымем мы келіхі й чаркі за здароўе ды асабістыя посьпехі дарагіх нам людзей, за новы поступ у нашай небезнадзейнай справе. Сёлетні наш набытак — чатыры нумары аднооўленае газэты, тысяча падпішчыкаў, рэгістрацыя закрытага акцыянэрнага таварыства «Наша Ніва» ў Вільні (наш разьліковы рахунак:* UAB «Naša Niva» S-TA № 3467685 KOMERCINIANE BANKE «VILNIAUS BANKAS» S-TA № 161303 LIET. BANKE VILNIAUS SKYR. KODAS 260101541).. *Няшмат, але й не нічога. Налета мы мяркуем выходзіць рэгулярна — прынамсі, раз на месяц, і, не зьмяняючы абранага кірунку, павялічыць наклад газэты й кола падпішчыкаў. А гэта магчыма толькі з вашай падтрымкай. Таму мы падымем нашыя келіхі за вас!*

**З Новым Годам!**

Рэдакцыя.





## Ластаўка

*Ластаўка,*
*так даўно ты ня лётала,*
*павуціну крылом ня ткала,*
*правым ля Неглюбкі, левым ля Моталя,*
*зь любым, ластаўка, не баляваla*

*так даўно, так даўно, так даўно,*
*што аж неба з-за сьлёз не відно,*

*ластаўка,*
*ты ніколі ня бачыла,*
*дык пабачыш, якая сьмерць...*
*сьнег з Расейшчыны,*
*дождж з Палаччыны —*
*будзе цалу й душы балець,*

*ластаўка.*


А.Сыс.

*Здымак Анатоля Клешчука.*

Навэля

## Турэмны дворык

Б.Гартэн



Галава рыцара рэвалюцыі аздабляла сабой квадрат турэмнага дворыку. Гаспадарчы падворак знаходзіўся ў іншым мейсцы. Гэты ж быў прызначаны для шпацыру, як і даўней — дзьвесьцетрыста гадоў таму, калі нічым, апроч малітвы, не занятыя манахі бадзяліся сюды-туды паміж чатырох высозных муроў з думкай, каб гэта перасягнуць вышыню й дастацца да дзяўчат — грудастых і юрлівых. Цяжка стрываць абяцанку, дадзеную Богу... Мужчыны, якія займалі кельлі сёньня, таксама сьнілі самых непрыстойных жанчын, але амаль ня марылі трапіць адгэтуль на волю. Гэта мала каму ўдавалася.

Радаслаў ціхенька, каб не прыцягнуць увагу, стаў на зэдлік і вызірнуў праз краты вонкі. Уздоўж муроў па галярэях, як нежывыя рухаліся вартаўнікі са стрэльбамі ўперавес. На куце цьмелі шыбы кулямётнае вышкі, якое ня зьмеціш з вуліцы.

Новы год.

Заўтра чорнай раніцай дзяжурны пасьля пабудкі зьмяце дзеркачом сьнег з рэдкіх валасоў гіпсавага помнічка, які яшчэ горш за арыштантаў мерз пад небам. Калі ён апынуўся тут, ніхто ня ведае. Вельмі даўно. Сам жа чалавек спыняўся ў горадзе ў далёкім дваццатым, каб дапытаць палоннага польскага генэрала. Стаяла лета варшаўскага паходу. Здавалася, не за гарамі Бэрлін і доўгачаканы пажар сусьветнае рэвалюцыі. Допыт адбыўся ў турме. А мэмарыяльную шыльду праз пяцьдзесят гадоў прычапілі да мура ў іншым мейсцы, дзе ён палымяна прамовіў перад апантанай заляй.

У Радаслава здраньцьвелі ногі. Але злазіць не хацелася. Гэта быў ягоны час. Адбой. Інакш, каб гарэла лямпачка пад стольлю, вартавы заўважыў бы яго. Радаслаў ведаў: ня сьпіць уся турма. Неўзабаве Новы год.

Некалі пасярод двара была мураваная студня. Цяпер — адзін толькі помнічак. Болей — анічога. Усярэдзіне ў Радаслава варухнулася нешта накшталт шкадобы. Адныя скалелыя чуркі-вартавыя ды недарэчная галава нябожчыка. Бездапаможная перад мацнелым паступова сьнегападам. Самотная й голая, як бізун. Ні дрэва, ні кусьціка. Дрэвы маглі вырасьці (хмызы — схаваць?)... Нават кветак не садзілі ўвесну, каб не нагадвалі пра волю. Неба ж, яно паўсюль аднолькавае.

Што, які менавіта сэнс заклаў той колішні турэмны начальнік у гэты акт: крыху бязглуздае, але ўрачыстае адкрыцьцё астрожнага помніка? Шыхты арыштантаў у шэрых куфайках. Салдацкі аркестрык. Імправізаваная трыбуна. Чырвоная стужка. Нажніцы. Чырвоныя таксама гвазьдзікі. Сантымэнтальны напамін пра пачатак раладу. Караючы меч рэвалюцыі і г.д. Або адкрыцьцё задумвалася як сродак супакаеньня арыштантаў? Маўляў,

*(Працяг на старонцы 6)*

# «Fräulein... ад беларускага камітэту»

Зоя Каўшанка

**Вось — пратаколы паседжаньняў Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні ў 1941 годзе — на самым пачатку нямецкае акупацыі. Мы публікуем іх разам з успамінамі супрацоўніцы камітэту Зоі Каўшанкі. Абодва тэксты розныя ня толькі паводле стылю й жанру. Гэта два розныя погляды на адну справу, адзін — з нашых дзён, другі — тагачасны. Успаміны ахопліваюць шырэйшы час і абсяг, чым пратаколы. Магчыма, тут не хапае яшчэ й трэйцяга погляду — дасьледчыка, аналітыка, вучонага. Але ж яго не хапае ня толькі тут, а *ў прынцыпе*. І тое, што мы публікуем сёньня — зусім невядомыя зьвесткі пра мінулую вайну — магчыма, дапаможа дасьледчыку, які некалі прыйдзе.**

**Зоя Каўшанка (нарадзілася ў 1911 г.) паходзіць зь сялянскай сям'і з Гарадзеншчыны, яшчэ яе дзед быў прыгонным мужыком. Яе бацька, Аляксандар Коўш, зь цяжкасьцю здабыўшы сякую-такую адукацыю, працаваў службоўцам у банку, затым стаў сьвятаром і ўсё жыцьцё змагаўся за беларусізацыю праваслаўнае царквы. У вайну быў расстраляны нямецкімі акупантамі. Зоя скончыла Віленскую беларускую гімназію, пазьней — юрыдычны факультэт Віленскага ўнівэрсытэту, удзельнічала ў Беларускім Студэнцкім Саюзе. Гэта ўсё — да вайны. Далей — пад акупацыяй — працавала ў Беларускім Нацыянальным Камітэце ў Вільні, за што на 10 гадоў была зьняволеная ў сталінскіх лягерох, і пра што, уласна, яе сёньняшні аповяд у *НН*. Пасьля хрушчоўскае адлігі Зоя Каўшанка вярнулася ў Вільню, тут і жыве цяпер.**



... Гулі самалёты, рваліся бомбы, людзі хаваліся, дзе хто мог. Быў чэрвень 1941-га. Зноў нас нехта ад нечага ці ад некага «вызваляў».

Калі крыху сьціхла, мне сказалі, што мяне хоча бачыць старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні прафэсар Іваноўскі. Раней мне зь ім не даводзілася сустракацца.

Адказаўшы на маё прывітаньне, Іваноўскі спытаўся: «Вы што скончылі, юрыдычны факультэт?» «Так, пан прафэсар». «Нямецкую мову ведаеце?» «Крыху ведаю», — адказала я менш пэўна. «Ну, вось і добра. Будзеце працаваць у Камітэце юрысконсультам». Я крыху зьбянтэжылася. «Як жа, пан прафэсар, я ж толькі атрымала дыплём. Яшчэ нідзе не працавала. Зусім ня маю практыкі. Баюся, што ня дам рады». «А я вам кажу, што дасьцё»...

Я зразумела, што прафэсар не прывык, каб яму пярэчылі.

На другі дзень я прыступіла да працы й хутка пераканалася, што рады ўсё-ткі дам. Тут не былі патрэбныя ні сьцісла сфармуляваныя параграфы карнага кодэксу, ні завітыя высновы філязофіі Хэгеля. Патрэбнае было толькі шчырае жаданьне працаваць. А гэтага ў мяне было даволі.

* * *

Калі нашыя продкі выбіралі мейсца для сваіх селішчаў, яны не маглі прадбачыць, што гэтая прастора станецца пляцдармам дзеля спрэчак Усходу й Захаду. Дорага каштавала народу самое йснаваньне на гэтых землях. На працягу стагодзьдзяў ён мусіў бараніць сваю самабытнасьць. Сялянская маса рабіла гэта пасыўна, проста не прыймаючы чужое культуры, учэпіста захоўваючы сваю мову й традыцыі. А інтэлігенцыя, якая амаль цалкам паходзіла з гэтае масы й ведала, што трэба рабіць, каб не дапусьціць да нацыянальнае сьмерці, часта мусіла плаціць за гэта свабодай альбо жыцьцём. «Уладары» на нашых землях зьмяняліся, а мы жылі й заставаліся самімі сабою. Так і цяпер глядзелі мы на акупацыю Беларусі нямецкай арміяй як на часовае зьявішча, часовую зьмену «ўладара». Як і раней, так і цяпер, стараліся выкарыстоўваць усе магчымасьці ў новай сітуацыі дзеля свае культурна-нацыянальнае працы. Збройна змагацца супраць тых ці іншых акупантаў не было сэнсу, бо мы невялікі народ, заціснуты паміж шмат большых. Збройнае змаганьне прывяло б толькі да зьнішчэньня людзей. Заставалася змаганьне пасыўнае — ня даць зьнішчыць у народзе ягоную нацыянальную сьведамасьць.

Спрадвеку Вільня была асяродкам беларускага нацыянальнага руху, і цяпер, калі яна апынулася на тэрыторыі генэральнага камісарыяту Летувы ці, інакш кажучы, была далучаная да Летувы, нехта мусіў заапекавацца беларускай спадчынай, прыдбанай мінулымі пакаленьнямі. Гэта і ўзяў на сябе БНК. Найбуйнейшымі нацыянальнымі аб'ектамі былі беларуская гімназія й беларускі музэй. Яны захаваліся, і праца ў іх ішла нармальна.

Зь вялікімі высілкамі БНК дамогся паўгадзіннае радыёперадачы на беларускай мове. Гэта былі першыя беларускія перадачы зь Віленскае радыёстанцыі. На жаль, трывалі яны нядоўга. Аднойчы, калі мы з Аляхновічам прыйшлі чытаць перадачу, нас не пусьцілі. У вакруговым камісарыяце нам растлумачылі: летувісы ня хочуць, каб на Віленскім радыё была беларуская перадача, а паколькі Вільня належыць да летувіскае акругі, немцы ня хочуць зь імі спрачацца. Выглядала так, што летувісы баяліся канкурэнцыі беларускага элемэнту ў Вільні.

Другім дасягненьнем была газэта *Беларускі голас*. Згодна з умовай, палова газэтнае плошчы мелася йсьці пад матэрыял, які даваў аддзел прапаганды, а палову газэта давала свайго, які, безумоўна, праходзіў цэнзуру. Фактычна аддзел прапаганды даваў трэйцюю або чацьвертую частку нумару, пераважна паведамленьні з фронту. Рэшту рэдакцыя запаўняла сваімі тэкстамі культурна-нацыянальнага зьместу.

Камітэт ладзіў таксама канцэрты й лекцыі. Гэта былі, прыкладам, юбілейны канцэрт на 25 ўгодкі гімназіі, выстава абразоў П.Сергіевіча, канцэрт М.Забэйды-Суміцкага. Нашыя культурныя справы немцаў мала цікавілі.

*(Працяг на старонцы 14)*

# Акупанты і партызаны

***з кнігі Генадзя Сагановіча «Невядомая вайна»***

**У мінулым нумары *НН* мы ўжо друкавалі разьдзел з кнігі Г.Сагановіча — пра бітву ля Зялёнага Моста. Сёньня гутарка пойдзе пра яшчэ адну невядомую старонку той «Невядомай вайны» з Маскоўскай дзяржавай 1654-1667 гадоў — пра ўзброенае змаганьне беларускага насельніцтва супраць акупантаў, партызанскую барацьбу:**

Сялянскія аддзелы самаабароны (маскоўскія ваяводы называлі іх «шышамі») паўсталі на Беларусі ўжо ў першыя месяцы вайны, адразу пасьля зьяўленьня тут царскіх палкоў. Ня маючы ані адпаведнага досьведу, ані добрага ўзбраеньня (ваявалі бердышамі, косамі, вілкамі), партызаны баранілі ад акупантаў свае мястэчкі й вёскі, адбівалі палонных. Кіравалі шмат якімі ляснымі харугвамі шляхціцы, але былі сярод камандзераў і сяляне.

На пачатку вайны найбольшы вызваленчы рух разгарнуўся ў Віцебскім, Полацкім, Мсьціслаўскім, Смаленскім ваяводзтвах. Барацьбу падтрымалі нават мясцовыя праваслаўныя сьвятары, за што, напрыклад, любавіцкага пратапопа арыштавалі маскоўскія ўлады.

Беларускія сяляне падтрымлівалі дзеяньні войска свае дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага. Гэтак, падчас апошняй наступальнай апэрацыі Я.Радзівіла за Бярэзінай пад ягонымі харугвамі сабраліся «мужыкі». Праз колькі месяцаў пад Полацкам разам з палкоўнікам Лазоўскім ваявалі полацкія сяляне. Калі на іх рушыла маскоўская коньніца й пяхота, Лазоўскі з войскам адступіў, а сяляне прынялі бой.

Зімой 1655 году паўсталі аршанцы, любавіцкія й азярышчанскія мужыкі. Яны рабілі заставы на дарогах, секлі царскіх ратнікаў, а ваяводаў вязалі й перадавалі войску Княства. У Зьвяровічах тады дзейнічаў партызанскі аддзел у паўтары тысячы чалавек на чале зь некалькімі шляхціцамі, якіх прыслаў Я.Радзівіл. У Красным стаяла некалькі соцень партызанаў. Войт вёскі Калесьнікі з дапамогаю сялянаў захапіў акупацыйнага ваяводу Мсьціслава І.Пушкіна разам з царскай казной і перадаў усю здабычу вялікаму гетману.

Ужо тады, той зімою, на «государевых изменников» Мсьціслаўшчыны — каля трох тысяч паўсталых сялянаў — цар накіраваў са Смаленску моцнае карнае войска. Цікава, што хоць сярод партызанаў тут было 15 шляхціцаў, ролю палкоўніка выконваў мясцовы селянін. А ваявалі яны ня толькі з акупантамі ды шляхтаю, якая прысягнула на вернасьць цару, але хадзілі таксама на вёскі, што перайшлі на бок Масквы.

Карнікі ня ведалі літасьці. Прыкладам, сямёх палонных, захопленых у сутычцы на Мсьціслаўшчыне (гэта былі казак, чатыры селяніны, сялянка й шляхціц), спачатку катавалі («пытали и огнем жгли»), затым аднаго павесілі, а астатніх — «бив кнутьем нещадно и отрезав у них носы и уши, велели послать по-прежнему в деревни, чтоб на то смотря, иным мужикам неповадно было так воровать и в шишах ходить». Але задушыць вызваленчы рух было ўжо немагчыма.

Увесну таго ж году мсьціслаўскія й крычаўскія ўзброеныя сяляне дзейнічалі пад Рослаўлем, каля Полацку вяло барацьбу сялянскае войска шляхціца М.Мажэйкі — 600 чалавек. За бердышы й косы ўхапілася насельніцтва Барысава, Горак, Гораў, Дуброўны, Мсьціслава, Ашмянаў, Смаргоні, Вільні. Пад Магілевам улетку 1655 году, як відаць са справаздачы стралецкага галавы Анічкіна, ягоных стральцоў «у розных вёсках узята (у палон — Г.С.) 7 чалавек, да сьмерці забіта 3 чалавекі».

У наступныя гады партызанскі рух набіраў яшчэ большае сілы. Сяляне й мяшчане хаваліся ў лясы, стваралі свае аддзелы ці далучаліся да казакаў І.Нячая, у войску якога таксама шмат было беларускіх мужыкоў. Асабліва актыўна дзейнічаў казацкі аддзел на чале зь Дзянісам Мурашкам. Ён разьмясьціўся ў Ігумене і не даваў спакою ўсяму Менскаму ды Наваградзкаму ваяводзтвам, нападаў на двары шляхты, якая прысягнула маскоўскаму цару, ставіў залогі на дарогах і не прапускаў сялянаў у Менск, да царскай адміністрацыі, перашкаджаў зьбіраць і вывозіць збожжа. Менскі акупацыйны ваявода Арсеньеў вясной 1656 году накіраваў на партызанаў войска. Карнікі захапілі 56 мсьціўцаў у палон. Усіх нявольнікаў, сярод якіх былі й людзі Мурашкі, кінулі ў менскую вязьніцу, але 30 зь іх неўзабаве ўцяклі праз падкоп. Лёс астатніх вырашыў сам цар, які загадаў «пущих воров 20 человек... повесить». На лета ваявода ізноў выслаў войска на менскіх партызанаў. А пад канец году сялянскім рухам былі ахопленыя ўжо ня толькі Меншчына, але й Барысаўшчына, Віленшчына, Наваградчына, а ў наступным годзе рух яшчэ больш пашырыўся і захапіў Палесьсе, дзе царскія ўлады так і не ўсталявалі свайго кантролю.

**Гэта толькі факты. Аналіз і высновы мы зробім пазьней. А пакуль — толькі факты.**

Ашмянская прысяжная (калябаранцкая) шляхта скардзілася, што пад націскам сялянскай вайны яна гатовая была перайсьці назад на бок Княства (на ўсходзе Беларусі ня раз даходзіла да вяртаньня шляхты менавіта з гэтай прычыны).

Улетку 1657 году паказачаныя сяляне кантралявалі практычна ўвесь Магілеўскі павет. Увосені атрад Багровіча — 400-500 чалавек — спрабаваў вызваліць Барысаў. На Віцебшчыне актыўна дзейнічаў такі ж па колькасьці аддзел С.Лукомскага, у якім былі «шляхта розных паветаў ды валасныя мужыкі, а чаркас украінскіх зь імі няма ніводнага чалавека». Пад Віцебскам жа — дзьве конныя харугвы «воровских казаков» шляхціца К.Храпавіцкага й былога віцебскага студэнта Ст.Шалупіна, у якіх мелася 30 шляхціцаў, астатнія — «мужыкі з кіямі й бердышамі».

Узімку 1657-58 гадоў на Беларусі паміж падданай цару шляхтай і маскоўскай уладай дайшло да адкрытага канфлікту. Шляхціцы, асьмялеўшы, пачалі скардзіцца на гвалты ад раскватараванага на Беларусі чужога войска, патрабаваць зьліквідаваньня залогаў, свабоды касьцёлу, неўмяшаньня праваслаўнага духавенства ў справы каталікоў, а затым — са зброяй выступілі супраць маскалёў. На Гарадзеншчыне толькі пачуўшы пра набліжэньне харугваў вялікага гетмана П.Сапегі, шляхта й мяшчане разам ухапіліся за зброю. Падобна, што гэтаксама было на Наваградчыне. Акупацыйны ваявода Ю.Далгарукі з трывогай паведамляў цару, што «вся присяжная шляхта всех поветов изменили и к ним, к гетманом к Павлу Сопеге и к Гонсевскому пристали и твоих ратных людей везде побивали, и в полон имали, и конские стада отгоняли».

Злучыўшыся зь сялянамі й казакамі Мурашкі ды Нячая, шляхта дзейнічала цяпер толькі супраць маскоўскага войска. Па дарогах ад Смаленску да Полацку былі зробленыя моцныя заставы. Тых ратнікаў, што, ня вытрымаўшы, уцякалі з царскіх палкоў на ўсход, «по Смоленской и Полоцкой дорогам многих побили».

Віцебская, шклоўская, аршанская й іншых гарадоў шляхта, мяшчане й сяляне сабраліся ў вадну групоўку ў Абальцы. Самыя розныя людзі зь Віцебшчыны прыйшлі ў ваддзелы шляхціцаў А.Юньдзіла й К.Храпавіцкага. У Лукам'і стаялі дзьве харугвы палкоўніка С.Лукамскага, тры — Хв. Слонскага, тры — К.Лісоўскага, дзьве — М.Сакалінскага і па адной Лыкі ды Рамаоўскага, а разам усіх было «конных і пешых усякіх людзей з мужыкамі тысячы зь дзьве». Лягеры партызанаў паўсталі ці не ва ўсіх блізкіх да Лукам'я вёсках. Выявіўшы іх, маскоўскія ваяводы правялі карную экспэдыцыю. Стральцы на чале з В.Пушачнікавым «село Биково выжгли», «Мощаное выжгли», «село Городец выжгли», зьнішчылі таксама іншыя паселішчы.

Партызаны заблякавалі Віцебск, не прапускалі туды хлеба й конскага корму, адбіралі ў нарыхтоўшчыкаў харчовыя запасы, перахоплівалі грашовыя зборы. Палкоўнікі Р.Камароўскі й М.Валовіч, у якога было сялян «тысячы са дзьве з косамі й бердышамі», вызвалілі Глыбокае. Шляхта Меншчыны на чале з палкоўнікам Я.Падоскім паспрабавала разьбіць маскоўскую залогу ў Менску, аднак няздужала і ўжо сама мусіла ратавацца ўцёкамі. А ў Камяні-Харэцкім колькі сотняў шляхты злучыліся зь сялянамі й разьбілі аддзел адборнай маскоўскай пяхоты ў 300 чалавек, які адлучыўся ад палкоў Далгарукага й рабаваў вёскі.

У верасьні 1658 году пад Магілёў «на воров и изменников» быў накіраваны моцны карны корпус Г.Казлоўскага. Інструкцыю яму складалі ў «Приказе тайных дел» пад наглядам самога цара. Ад ваяводы патрабавалі разьбіваць і разганяць казакаў і паказачаных сялянаў, мястэчкі й вёскі, якія не падпарадкуюцца акупантам, — паліць і разбураць. Гарады, якія «здрадзілі» цару, ці ў якіх стаялі партызаны, — «повоевать и выжечь и разорить совсем без остатку». Разам з Г.Казлоўскім дзейнічаў акупацыйны магілёўскі ваявода С.Зьмееў. Затым у дапамогу ім быў высланы яшчэ ваявода І.Лабанаў-Растоўскі з войскам. Адначасна на Віцебшчыну са Смаленску выступілі салдаты В.Сукіна і стральцы В.Пушачнікава, зь якімі ў Бешанковічах жорсткі бой правялі аддзелы Лукамскага, Лісоўскага, Слонскага, Прасецкага. Пабітыя карнікі хутка адступілі ў Смаленск.

Маскоўскае войска хадзіла зь Віцебска на харугву аршанскага шляхціца Суліkoўскага й харугву Прудніка. Тыя, кепска ўзброеныя й зусім малалікія, прынялі бой у мястэчку Нераш і пацярпелі паразу.

Налета цар ізноў выслаў карныя сілы пад Вяліж, да Віцебска й Полацка для барацьбы з партызанамі. Тое ж рабілася на Мсьціслаўшчыне, пад Рослаўлем ды ў іншых раёнах.

У 1660-61 гадох са зьяўленьнем значных вайсковых сілаў Рэчы Паспалітай на тэрыторыі Беларусі вызваленчы рух набыў яшчэ большы размах. Выглядала, што ўсё насельніцтва дамагаецца адной мэты — выгнаньня акупантаў. Мяшчане й сяляне ўтваралі дадатковыя фармаваньні войска Вялікага Княства. Прыкладам, на Полаччыне дзейнае войска адзін час складалася з 4 харугваў шляхты, пяхоты, драгунаў і 5 харугваў мужыкоў ды чэлядзі. У дывізіях П.Сапегі ўвесь час было шмат сялян. Пад Дзьвінскам да войска Рэчы Паспалітай, у якім было 5 харугваў, сыйшлося яшчэ 6 харугваў мужыкоў — усе зьбіраліся йсьці на Дзьвінск. Урэшце дайшло да сэрыі паўстаньняў у беларускіх гарадох, калі мяшчане гвалтам ліквідавалі маскоўскія залогі ці прымушалі іх здавацца без супраціву. Так было ў Дзісьне, Себежы, Мсьціславе, Магілеве, Шклове ды іншых местах.

**І гэта зноў — толькі факты.**

**Упартае змаганьне жыхароў Беларусі з акупантамі наблізіла дні яе поўнага вызваленьня. Гэтая барацьба паклала пачатак традыцыі народнага вызваленчага руху на нашай зямлі — традыцыі, якая ці ня стала гістарычным лёсам беларусаў.**

## Толькі пра ВКЛ

*Магчыма, гэта й ёсьць паветра свабоды? Тры дні (22-24 кастрычніка) у Горадні на міжнароднай канфэрэнцыі размовы былі адно пра Вялікае Княства Літоўскае. Дагэтуль перавага аддавалася выключна Вялікаму Княству Маскоўскаму, якое доўгі час не магло сабе даць рады ў змаганьні са сваім заходнім суседам. Ажноператварылася яно ў Расейскую (а пазьней у савецкую) імпэрыю, а ВКЛ насталі капцы, і пераможцы перарабілі ўсю нашу гісторыю на ўласны маскоўскі капыл. Але, як вядома, усе імпэрыі распадаюцца...*

*Такім чынам, не спытаўшы дазволу дзе-небудзь ва ўнівэрсытэце Патрыса Лумумбы, у Купалаўскім унівэрсытэце ды іншых гарадзенскіх установах самі вырашылі правесьці ў горадзе канфэрэнцыю, прычым міжнародную.*

*Высьветлілася, што гісторыю культуры ВКЛ вывучаюць ня толькі на Беларусі, у Летуве, на Ўкраіне ды ў Польшчы, а нават у Расеі. Прыехаў нават адзін лёнданскі прафэсар. Не было толькі са сьпіскавых земляка гарадзенцаў, які зараз прадстаўляе Тэль-Авіў.*

*Найцікавае ў гэткіх імпрэзах — час перад пачаткам. Рэгістрацыя ўдзельнікаў і прадстаўнікоў прэсы, нечаканыя спатканьні, кулуары, у буфэце запарваюць гарбату. Ідзе таксама сякі-такі гандаль:* Наша Ніва №3, *штосьці яшчэ, тры зборнікі дакладаў, выдадзеныя да канфэрэнцыі, коштам 30 рублёў. Можна прыдбаць настольныя мэдалі са Скарынам, якія зрабіў Летувіскі фонд культуры. Баптысты прапануюць бясплатна сваю літаратуру, у тым ліку Эвангельле сьв. Яна ў перакладзе Яна Пятроўскага. Трэба аднак наўзамен укінуць у скрынку ахвяраваньні на баптысцкую бажніцу. Побач яе макет, які нагадвае ленінскі мэмарыял ва Ўльянаўску. Спыняецца старшыня гарвыканкаму, ён нічога ня ведае пра будаўніцтва.*

*А што ж сама канфэрэнцыя? Украінскі калега ганіць гумілёўскую тэорыю этнагенэзу, пэсымістычна выказваецца пра братку-беларуса менскі навуковец: «Гісторыя ня ведае пакуль што прыкладаў рэанімацыі этнасаў, даведзеных да гэткай ступені дэградацыі». Віленскі летувіс*

# Бізнэс і незалежнасьць

**М.С.**

Прозьвішча гэтага чалавека Агейчанка. Ён адзін з тых, хто добра ведае, навошта сёньня езьдзіць за мяжу. Не ў музэі, не па архітэктурныя прыкметнасьці. А так, каб тут ухапіць што-небудзь і абмяняць там на відзікі, двухкасэтнікі, аўтамабілі. Уся справа ў тым — што ўхапіць і адкуль.

Агейчанка ўзначальвае арганізацыю, якая адначасова займаецца хіміяй і экалёгіяй, зьбірае розныя навукова-тэхнічныя распрацоўкі, якія тут яшчэ не знайшлі прымяненьня. Як гэта звычайна, вынайдуць інжынэры нешта неардынарнае, і паперкі на навіну аформяць, і прэмію нейкую атрымаюць, а сама распрацоўка як быццам нікому й непатрэбная. Ляжаць паперкі ў шафах, пакрываюцца пылам.

Скеміў Агейчанка: чаму ж не прапанаваць такія распрацоўкі, напрыклад, палякам? Ці ня тры разы зьезьдзіў ён у гэтай справе на блізкае па профілю польскае прадпрыемства, прапанаваў. Палякі, вельмі ўдзячныя, прэзэнтавалі пану «Форд». Дакладней, не самому пану, каб не было падазраньняў, а ягонай арганізацыі. Потым, праўда, даслалі ўладам ліст: маўляў, памыліліся, маўляў, хацелі зрабіць прэзэнт усё-ткі пану. І Агейчанка выкупіў бы машыну за невялікія грошы.

Але «Форд» належаў арганізацыі, якую ўзначальваў Агейчанка, толькі адзін дзень. Назаўтра машыну забрала сабе міністэрства. Якія тлумачэньні? Тыя самыя, агульныя справы з замежжам. Сьмешна думаць, што высокія міністэрскія чыноўнікі самі не імкнуцца ў бізнэс. Яшчэ як імкнуцца! Брат міністра (зразумейце!) зрабіўся дырэктарам аднаго сумеснага з замежнай фірмай прадпрыемства. Яму й аддалі той «Форд», каб было на чым вазіць гасьцей.

Вось такія справы, такі «бізнэс».

Пакрыўдзіўся Агейчанка сьмяротна, і «бізнэс» ягоны стаў падобны да помсты сваёй роднай зямлі.

... Адзін дырэктар камбінату бэтонных вырабаў таксама зьезьдзіў за мяжу й прывез адтуль адну цікавую рэч з плясмасы. Нешта накшталт ячэістай плястыны. Яна вельмі пругкая, памеры й мейсца кожнай ячэйкі дакладна разьлічаныя. У чым і сэнс. Калі плястыну ўстаўляюць у бэтонныя вырабы, тэрмін іхняй службы значна павялічваецца.

Такое тэхнічнае ўдасканаленьне.

Дырэктар камбінату папрасіў у Агейчанкі дапамогі. Каб ягоная арганізацыя абгрунтавала мэтазгоднасьць вырабу плястынаў на Беларусі. Зразумела, будзе створана сумеснае прадпрыемства...

— Тлумачу як сябру, — даводзіў мне Агейчанка, — дзеля валюты людзі зараз ідуць на ўсё. І мы абавязкова створым сумеснае прадпрыемства. Мы абгрунтуем...

— Давядзецца пабудаваць вытворчасьць чаго? У якім мейсцы? — пытаўся я.

— Гэтага не скажу.

— ?

— Я табе схему прачыняю. Сумесныя прадпрыемствы ўзьнікаюць цяпер усюды. І шмат якія менавіта па гэтай схеме. Глядзі. У чым зацікаўленае замежжа? Ячэістая плястына, сапраўды, патрэбная рэч. Але вытворчасьць гэтай плясмасы надта шкодзіць прыродзе. Захад падсоўвае нам. Дае валюту, абсталяваньне, а сам забірае частку прадукцыі. Зразумеў? Сыравіна выкарыстоўваецца наша, людзі атручваюцца нашы.

— Тады якая наша зацікаўленасьць?

— Мая зацікаўленасьць — валюта. Даюць па сумяшчальніцтву неблагую пасаду ў сумесным прадпрыемстве...

Гісторыя гэта паказвае: нават пры значнай заблытанасьці справаў у вытворчасьці можна вызначыць, чым займаюцца людзі: працуюць на карысьць народу ці рабуюць яго. Агейчанка адбірае ў нас права жыць на чыстай зямлі, дыхаць чыстым паветрам. І нажываецца. Гэта — антыэкалягічны бізнэс.

Яшчэ адзін від бізнэсу я называю ўмоўна бізнэсам вельмі заклапочаных людзей. Яны ўдала знаходзяць тое, што быццам бы прападае без усялякае карысьці, штось «безгаспадарнае», і прадаюць за мяжой.

(Зрэдку нібыта безгаспадарнай выглядае сама валюта. Калі ты займаеш такое становішча, што можаш яе ўзяць, то бяры. Купляй за мяжой тыя ж відзікі й гандлюй сабе ў прыбытак.)

Найчасьцей размова йдзе пра якія-небудзь адыходы, якую нізкаякасную сыравіну. Клясычна тут выглядае апэрацыя вядомага Арцёма Тарасава: атрымаў дазвол на вываз за мяжу нізкаякаснага мазуту, які потым ператварыўся ў высокаякасныя змазкі.

Павелічэньне ў часе транспарціроўкі якасьці тавараў — адзін з законаў бізнэсу вельмі заклапочаных людзей. Прычым павелічэньне можа быць неверагоднае: цацачныя тэлевізары ператвараюцца ў сапраўдныя, мэталёвы лом — у рухавікі. У нармальных людзей гэта называлася б ня бізнэсам, а махлярствам. У нас жа дзеля прыкрыцьця вывазных апэрацый нават прыгожыя лёзунгі прыдумалі: каб дапамагчы сялу, каб палепшыць жыцьцё ў забруджаных зонах.

Бізнэс вельмі заклапочаных людзей квітнее, пра што сьведчыць падзеньне аб'ёмаў вытворчасьці. Яго, падзеньне, увесь час стараюцца сьпісаць на дзяржаўную незалежнасьць былых саюзных рэспублік. Маўляў, ірвуцца некалі адладжаныя сувязі.

Так, ірвуцца, але ж ці сувэрэнітэт у гэтым вінаваты? Сувэрэнітэт — гэта валоданьне сваёй зямлёй, сваімі багацьцямі, сувэрэнная дзяржава аб'ектыўна зацікаўленая ў тым, каб усё сваё і зьберагчы, і прымножыць. Яна імкнецца ня рваць адладжаныя сувязі, а ўмацоўваць іх, з карысьцю гандляваць. А парушае гэты працэс гандаль вельмі заклапочаных людзей. Бо каб аддаць Тарасаву замест нізкаякаснага мазуту высокаякасныя змазкі, трэба некаму іншаму іх не аддаць, трэба зь некім адладжаныя сувязі спыніць.

Яшчэ адзін від сучаснага бізнэсу — пасрэдніцкі рэкет.

Новы мільянэр Андрэй Завідзія (гэта той самы бізнэсмэн, які ў свой час фінансаваў выбарчую кампанію Жырыноўскага) кажа: «У мяне дома стаіць кампутар, і на дыскетах запісана, дзе, што й пачым. Мы злучаем тых, чые інтарэсы супадаюць, маем з гэтага адзін працэнт — і ўсе справы».

Наконт «аднаго працэнту» ў мяне ёсьць вялікі сумлеў, але галоўнае ў іншым. Калі б мільёны можна было рабіць на звычайнай інфармацыі «дзе, што й пачым», тады б кожны разумны забесьпячэнец быў мільянэрам.

У нас існуе манапалізм вытворцаў, якія зрасьліся з сістэмай гандлю. Яны дыктуюць спажыўцам свае ўмовы, тут залатое дно. У сістэму ўключаюцца разгалінаваныя, заблытаныя структуры каапэратываў, малых прадпрыемстваў, дзе безнаяўныя грошы пераводзяцца ў наяўныя. Яны й трапляюць у кішэні магутнага клану з манапалістаў і гандляроў. Часткова — у кішэні пасрэднікаў-рэкеціраў.

Так парушаецца права грамадзтва валодаць той прадукцыяй, якую яно выракляе.

Той жа Агейчанка аднойчы сказаў мне:

— А чаго ты чакаў? Чаго ўсе вы чакалі, калі пачыналі змагацца з апаратам, ягонымі дачамі, санаторыямі й г.д.? Чаго вы чакалі, калі пачыналі патрабаваць прыватызацыі, свабоды прадпрымальніцтва? Вы меркавалі, што мы ня знойдзем сваіх — новых мейсцаў? Пакоцімся наніз? Ха! Бярыце нашыя дачы, нашыя санаторыі, а мы возьмем валюту й будзем адпачываць у Італіі, лячыцца ў Штатах.

Ён мае рацыю.

Ужо склаліся магутныя групоўкі ня толькі сярод ценявікоў. У саветах усіх узроўняў, ува ўсіх структурах кіраваньня народнай гаспадаркай. Частка дэпутатаў сыйшлася з прадпрымальнікамі. Некаторыя нават праз пасады (або пры дапамозе акцый) зьвязаліся з камэрцыйнымі банкамі, рознымі прамысловымі й аграрнымі саюзамі, з новымі гандлярамі. Цяруцца адно аб адно законатворцы й біржавікі. Законы пішуцца па-рознаму, а выконваюцца толькі на карысьць спэкулянтам.

Іншыя дэпутаты блякуюцца з рознымі апаратчыкамі й тымі гаспадарнікамі, якія праводзяць дзікую прыватызацыю. Яны ствараюць асацыяцыі й канцэрны, дзе працоўныя калектывы толькі «адчуваюць» сябе гаспадарамі, а рэ-



альна гаспадараць чыноўныя вярхі. І вядуць яны справу да таго, каб аформіць асацыяцыі й канцэрны як сваю маёмасьць.

Ценявікі-крымінальнікі лезуць ва ўсе групоўкі.

Трэба глядзець праўдзе ў вочы: да цывілізаванага заходняга рынку мы не пасунуліся ні на крок. У нас склаўся псэўдарынак. Ягоны твар — спэкулятыўныя цэны на большасьць тавараў, якія прадумана пераведзеныя ў разрад дэфіцытных. Склаўся новы мафіёзны слой. Ён будзе змагацца супраць эканамічных рэформаў нават з большай жорсткасьцю, чым нядаўна намэнклятура кампартыі. Бо менавіта дэфіцыт і спэкуляцыя даюць яму пануючае становішча ў грамадзтве.

Дай Бог, каб я памыляўся, але мне здаецца, што гэтыя людзі будуць супраць незалежнасьці Беларусі. Ім выгадна мець тое, што называецца адзінай эканамічнай прасторай на тэрыторыі былога Саюзу (і адзіныя грошы таксама). А вось сапраўдная мытная служба на межах незалежнай Беларусі спэкулянту як нож да горла. Бо мытня пачне адбіраць спэкулятыўныя пенкі й вяртаць іх народу.

Блізка да гэтай праблемы й праблема беларускага войска. Бо сапраўдная мытня бяз войска за плячыма наўрад ці магчымая, яна будзе зваленая мафіяй. Як, напрыклад, у часе вайны з наркабізнэсам у Калюмбіі.

Ня трэба блытаць спэкулянта, рэкеціра, мафіёзі — з буржуа, які бярэ грошы ў банку, арганізуе акцыянэрнае таварыства й вытворчасьць якіх-небудзь патрэбных грамадзтву тавараў. Ён нямала бярэ, але ж і дае! Галоўная рыса некрымінальнага буржуа — арганізаваная ім вытворчасьць тавараў. І тое, што ў нас мейсца такога буржуа занялі спэкулянты, рэкеціры, мафіёзі, можа стаць нашай трагедыяй. Бо без нармальнага буржуа няма паўнакроўнай нацыянальнай эканомікі.

Вярхоўны Савет слушна прызнаў права прыватнае ўласнасьці на зямлю, але хто тую зямлю атрымае? Калі работнік, то ён зь цягам часуператворыцца ў фэрмэра й падрыхтуе грунт, на якім узыйдзе нармальны буржуа. Але зямлю могуць захапіць і спэкулянты. Яны абыйдуцца зь ёю, як абыходзяцца зь любым іншым таварам. І спэкуляцыя будзе па-ранейшаму душыць народ, спусташаць край.

Фэрмэрства, прыватызацыя, беларускія грошы, мытня, войска — галоўныя праблемы як эканомікі, так і палітыкі. Іх трэба вырашаць тэрмінова. Расея пры Ельцыне ня вельмі зьмянілася, нацыянальна-вызваленчы рух на яе тэрыторыі выкліча дзесяткі, сотні ваенных канфліктаў. Энэргія распаду абяцае нам новае нашэсьце з Усходу. Такія ўжо тэндэнцыі сёньняшняга расейскага жыцьця.

Трэба сьпяшацца.

*упарта называе дзяржаўную мову ВКЛ «рускай». Слушна, але тады хай сваіх землякоў называе жмудзінамі, а не літоўцамі... Цікавая акалічнасьць: з дакладу й паведамленьняў, заяўкі на якія паступілі пасьля 1 верасьня, большасьць — зь Вільні. Ці гэта не ад боязі, што незалежныя беларусы самі пастаўляюць усе кропкі над «і» ў пытаньнях гісторыі культуры ВКЛ?.. Зрэшты, няцяжка было заўважыць і іншыя цікавыя акалічнасьці. Напрыклад, адзін маскоўскі асьпірант кінуўся ў іншую скрайнасьць, назваўшы свой даклад «Польшча, Літва, Заходняя Русь (?!)», і абгрунтаваў яго выключна польскімі друкаванымі крыніцамі. Усьцешыў хіба доктар філязофіі праф. Дж.Кліэр зь Лёндану ("Значэньне габрэяў Беларусі ў гісторыі габрэйскага народу Расейскай імпэрыі, 1772-1855"), які ані разу не памыліўся, гаворачы «Беларусь, беларускі», хоць яму цяжка давалася расейская мова.*

*На другі дзень для ўдзельнікаў наладзіла гарбату татарскае таварыства Кітаб, пра што паведамляла абвестка на беларускай мове. На гэтыя мэты Кітаб выдзяліў 50 рублёў, а пілі гарбату ў Музэі гісторыі рэлігіі.*

*Лёнданскі госьць у аднаго з мастакоў набыў за 50 даляраў карціну (не пасьпелі яшчэ высахнуць фарбы) з выявай гарадзенскай сінагогі. Дарэчы, нашыя мастакі зразумелі, што маляваць гэтую сінагогу надзвычай выгодна, а яшчэ лепей — мячэці Гарадзеншчыны...*

*Не зважаючы на разьбежнасьць у некаторых пытаньнях, навукоўцы разьвіталіся міралюбна й нават выказаліся за мацаваньне супрацоўніцтва, чаго пры былой дружбе народаў было менш. Будзе й працяг. Прыблізныя тэмы: гістарычная мэнтальнасьць беларусаў, мэханізм міжнацыянальных зносінаў у ВКЛ, гісторыя канфэсій... Мейсца для правядзеньня падобных канфэрэнцый абранае надзвычай удала. Тутака ВКЛ — як частка Рэчы Паспалітай — зьведала росквіт, тутсама атрымала й сьмяротны прысуд.*

Гэранім.

# Папера з канопляў

*Праект*

**А.П.**

Што паўтараць пра экалягічную катастрофу, да якое йдзе сьвет! Трэба нешта рабіць. Беларусь — сярод першых краінаў, дзе парушаны экалягічны балянс. Яшчэ да Чарнобыля край стаўся ахвярай неразумных праектаў асушэньня балот пад земляробчыя комплексы, за чым пайшло забруджваньне рэк ды вазёр. Салігорскія камбінаты калійнае солі зьядаюць навакольныя лясы. Але тым ня менш рэалізуюцца новыя праекты накшталт сьветлагорскага папяровага комплексу й г.д. Зразумела, што трэба забясьпечыць патрэбы на дэфіцытную паперу, але-ж няможна рабіць гэта коштам татальнага зьнішчэньня лясоў.

На жаль, неаглядная высечка лясоў як дармовае сыравіны, галоўным чынам для вырабу паперы, робіцца ў сьвеце шмат дзе. Агрыкультурна-харчовая арганізацыя пры ААН паведамляе, што трапікальныя дажджавыя лясы сьвету зьнікаюць цяпер у два разы хутчэй, чым гэта было дзесяць гадоў таму. А першым, хто выступіў супраць гэтага працэсу стаў кансорцыюм аўстралійскіх фэрмэраў і ахоўнікаў прыроды «Каноплі на Паперу», які ажыцьцяўляе плян замены цьвярдога дрэва канoплямі як асноўнай сыравінай для вырабу паперы.

Кансорцыюм прапанаваў адміністрацыі штату Тасманія засеяць канoплямі прыблізна 15 тысяч гэктараў ральлі, з чаго будзе прадукавацца 100 тысяч тон папяровай пульпы. Аўтары праекту сьцьвярджаюць, што каноплі ў гэтай справе характарызуюцца нашмат лепшымі якасьцямі, чым цьвярдое дрэва. Па-першае, яны перамагаюць пустазельле, не патрабуюць гэрбіцыдаў ды пэстыцыдаў, паляпшаюць плённасьць ральлі, таму зьяўляюцца карыснай ратацыйнай культурай. Па-другое, драўляная папера можа быць перавыкарыстаная толькі тры разы, а канапляная — сем. Па-трэйцяе, канапляная папера не патрабуе шкоднага для прыроды выбяляньня...

Як кажа аўстралійскі спэцыяліст па недраўляных папяровых сыравінах Джан Вуд, да 1850 году ўся сусьветная папера выраблялася амаль выключна з канопляў. Цьвярдое дрэва стала асноўнай сыравінай толькі тады, калі паўночна-амэрыканскія піянэры, карчуючы лясы, шукалі выкарыстаньня для сьсечаных імі дрэваў. Драўляная папера пачала вырабляцца адносна нядаўна, некаторыя яе гатункі прадукуюцца толькі апошнія 80 ці нават 25 гадоў. І вось сёньня 93% усёй паперы ў сьвеце выробляецца з дрэва, з чаго толькі 29% перавыкарыстоўваюцца. Каля 7% паперы выробляецца з бамбуку, траваў, цукровай трасьціны й нават з пажніўных збожжавых адыходаў. У 1988 годзе на паперу пайшло 226 мільёнаў кубамэтраў дрэва. Паводле сучаснага росту патрэбаў у паперы, да 2020 году лічба гэтая патроіцца.

На Беларусі для шмат каго каноплі адразу асацыююцца з наркотыкамі. Але трэба ведаць, што гадаваныя ў халаднейшым клімаце каноплі маюць вельмі нізкі ўзровень наркатычных якасьцяў, і наркатычная небясьпека па-сутнасьці касуецца цалкам. Толькі каноплі трапікальнага паходжаньня зьяўляюцца патэнцыяльным наркотыкам.

У Тайляндыі адна цэлюлёзная фірма выкарыстоўвае канапляную безнаркотную расьліну «кінаф», якая за шэсьць месяцаў вырастае да шасьці мэтраў увышыню. І калі нават тыя каноплі, што растуць на Беларусі, не багатыя на цэлюлёзу, дык цалкам магчыма ўшляхотніць іх, напрыклад, праз сэлекцыйнае скрыжаваньне са згаданым «кінафам». Зразумела, што выраб канаплянай паперы будзе даражэйшы за традыцыйны. Аднак пры цяперашняй рэляцыі цэнаў на Беларусі і ў заходнім сьвеце гэты прадукт можа стаць пасьпяховым экспартным таварам. А плошчы... Калі Беларусь прадукуе неэкспартнай на захад бульбы ў тры разы больш, чым патрэбна для насельніцтва рэспублікі, значыць, дзьве трэйція бульбяных палёў і можна выкарыстаць пад канапляныя пасевы.

Зразумела, што гэты праект мусіць быць увязаны з чарнобыльскай праблемай. На працягу пяці гадоў у забруджаных зонах не спыняецца харчовая сельскагаспадарчая дзейнасьць. Калі нельга зусім не выкарыстоўваць гэтыя зоны, дык ці ня варта адвесьці іх для вырошчваньня нехарчовае сыравіны, як каноплі. Вядома, усё, што прадукуецца там, мае павышаны ўзровень радыёактыўнасьці. Аднак у фінальным нехарчовым прадукце — паперы — узровень радыяцыі можа быць блізкі да прыймальных нормаў, а ў кожным разе, у вадрозьненьне ад харчовых вырабаў, гэтая папера ня будзе сьмерцяносным прадуктам.

Дзеля пераходу на прырода-прыязныя мэтады вырабу альтэрнатыўнае папяровае сыравіны трэба шукаць прыхільнікаў, зацікаўленых спансараваць праводжаньне гэтага экспэрымэнту. А прыхільнікамі такімі могуць быць міжнародныя арганізацыі — ААН, Грынпіс ды іншыя.

*Таронта, Канада.*

# 1992. Карціна году ў рэтраспэктыве

С.П.

Ці можна з гледзішча Новага году
ўбачыць наш край у рэтраспэктыве?
Магчыма, ужо ў гэтых лічбах — 1992 —
закладзены нейкі сэнс, код, пэрыяд...
Згадайма апавяданьне Х.Л.Борхеса
ў *НН* № 2 («Бабілёнская бібліятэка»).
Шукаючы кампрамісу паміж тэзамі
«жыцьцё канечнае» й «жыцьцё вечнае»,
Борхес знаходзіць трэйцяе —
жыцьцё пэрыядычнае.
А калі так, дык усё паўтараецца
з пэўнай пэрыядычнасьцю.
Усё — у тым ліку й наш край.
Але якая ж гэта пэрыядычнасьць,
чым яна вымяраецца?
Ёсьць фармацыі, эпохі,
ёсьць пакаленьні, лёсы...

Па-свойму
такая пэрыядычнасьць
адлюстраваная
ў паняцьці кананічнага *юбілею*.
Гэтым словам
пазначаецца крок гісторыі
памерам у 25 гадоў.
25-50-75-100-125 і г.д.
Вось, скажам, дата нараджэньня
выдатнага паэта,
успомненая й адзначаная кожныя 25 гадоў.
Якраз столькі часу трэба,
каб падсумаваць набыткі паэтазнаўства,
каб насьпела тая пераацэнка,
якую па-свойму зробіць чарговае пакаленьне.
2 ці 3 разы за жыцьцё кожны з нас
супольна з усім грамадзтвам
трапіць у варбіту паэта.
І кожнага разу гэта будзе сапраўды
значная й чаканая сустрэча.
Калі ж адзначаць кожнае 5-10-годзьдзе —
значыць, «загаварыць» паэта.
Калі адзначаць толькі 50-100-годзьдзі —
значыць, пазбавіць нейкія пакаленьні
права на свой погляд і сваю ацэнку.
А крок у 25 гадоў
аптымальны
й дазваляе пільна й сістэмна
ўглядацца ў мінуўшчыну,
не абмінаючы ніводнае важнае даты.

Сёньняшняя выбарка
некаторых юбілейных датаў 1992 году —
гэта толькі эскіз такой сістэматызацыі.
Чытаючы пра нядаўнія й старыя часы,
мы думаем пра Новы год,
які таксама патрапіць
у пэрыядычнасьць жыцьця.
Чым будзе адзначаны ён?
Магчыма, адказ на гэтае пытаньне
мы знойдзем у гістрычных паралелях,
калі вернемся на 25 ці на 250 гадоў назад?..

### *25 гадоў назад*

— быў 1967 год. Вы яшчэ памятаеце? Адзначалася 50-годзьдзе рэвалюцыі. Прынамсі, тады гэта была найважнейшая дата. Заводы, калгасы й вуліцы бралі сабе ганаровае імя — «імя 50-годзьдзя». Некаторыя дагэтуль называюцца так. Мне запомнілася вялікае мноства значкоў — з «Аўрорай», зь Леніным, з чырвоным бантам... Але пра што я тады ня мог ведаць ніяк, — пра тых, хто памёр у 67-м, бо даведаўся пра гэта нашмат пазьней.



І цяпер я пералічваю даты сьмерці з думкай пра тое, што яны — як рыса пад жыцьцём, — важней за даты нараджэньня. Хто там нарадзіўся — яшчэ невядома (сапраўды, што можна сказаць сёньня пра тых, хто прыйшоў у 67-м?), а хто памёр — вось ён, з усім сваім даробкам.

У 1967-м адыйшлі з жыцьця выдатны раманіст **Аркадзь Чарнышэвіч** *(18 студзеня)* і партыйны літаратар **Іван Гутараў** *(8 лютага)*, пачынальнік беларускага савецкага кіно **Юры Тарыч** *(21 лютага)* і артыст **Аляксандар Ілінскі** *(18 сакавіка)*. Памёр таксама філёзаф **Мікола Алексютовіч** *(27 красавіка)*. Ягоны артыкул «А дзе ж ісьціна аб'ектыўная?» у пятым нумары часопіса «Полымя» за 1966 год для многіх стаў першай праўдай пра Беларусь. Я гэты артыкул чытаў па фотакопіі, зробленай з ксэракопіі, але сам чалавек так і застаўся для мяне загадкай. А яшчэ ў 67-м памёр **Фэлікс Стэцкевіч** *(21 чэрвеня)*, вядомы таксама пад псэўдонімам «Аганёк». Адзін з заснавальнікаў Беларускай сацыялістычнай грамады ў 1903 годзе, ён, здаецца, адзіны зь іх і дажыў амаль што да нашых дзён. Склаў эспэранта-беларускі слоўнік.

Што яшчэ адбылося 25 гадоў назад? Драгічын стаў горадам, а Вацлаў Жыдліцкі — доктарам філялёгіі. Магчыма, гэта ўжо й не юбілейныя даты, а толькі прыкметы свайго часу. Рэканструкцыя й пашырэньне старога менскага піўзаводу. Адкрыты Дзяржаўны музэй БССР і 35 новых помнікаў Леніну (звычайны гадавы паказчык). У Полацку створаны гісторыка-археалягічны запаведнік, у Менску пачала выходзіць газэта «Вечерний Минск». Пятрусь Броўка выдаў зборнік «Заўсёды з Леніным», а служкі трох музаў: артыстка М.Захарэвіч, паэт С.Панізьнік і мастак Г.Паплаўскі, — уступілі ў КПСС. Прыкметы часу. Што засталося з творчасьці тых гадоў? Магчыма, «Лісткі календара» М.Танка, ілюстрацыі А.Кашкурэвіча да Купалаўскага «Кургану», «Лацінска-руска-беларускі батанічны слоўнік» А.Кісялеўскага, на вокладцы якога таксама — 1967 год...

### *50 гадоў назад*


была вайна. 1942 год. Амаль усе юбілеі гэтага году пазначаныя крыжыкам — сьмерць. Спаленыя вёскі, выбітыя мястэчкі, па ўсёй тэрыторыі. У **Кажан-Гарадку** *(кастрычнік)* немцы расстралялі 937 жыхароў, у **Шчучыне** *(9 траўня)* — 2060, у **Чарэі** (Чашніцкі раён, *5 сакавіка*) — 800, у **Цімкавічах** (Капыльшчына) — 1018, ва **Уваравічах** (Буда-Кашалёўскі раён) — 247, у **Ракаве** *(4 лютага)* — 950 — спаленыя зажыва, у **Нарачы** — 80, у **Смалянах** (Аршанскі раён, *5 красавіка*) — 800, у **Нясьвіжы** *(кастрычнік)* — 1500...



Трагедыя гэта ці статыстыка?.. Назваць усё і ўсіх? Ва ўсіх тады войнах... Ці ацаніць «у цэлым»? Дасьледваць механізмы — хто, каго й за што — справа гісторыкаў. А справа сумленьня жыхароў таго ж Ракава ці Шчучына — сабрацца ў дзень гібелі землякоў і памянуць іх. Таксама як справа кожнага — ведаць, калі, як і за што загінуў ягоны дзед ці прадзед, ды распавесьці пра тое дзецям.

А каго памяне грамадзтва? Раней такі жалобны мартыралёг заўсёды пачыналі імёнамі Веры Харужай ды Ісая Казінца, павешаных у Менску піянэраў-падпольшчыкаў Кобера й Хаменкі, Канстанціна Заслонава, які, аказваецца, толькі ў 42-м уступіў у КПСС і неўзабаве (14 лістапада) загінуў у вёсцы Купаваць Сеньненскага раёну. Гэтак пачыналі раней. Зрэшты, ці можа быць нейкі ранжыр у мартыралёгу? Каго спачатку назваць, каго ў канцы... Для гэтага спатрэбілася б нейкая новая ідэалёгія, каб, скажам, камуністаў, якіх раней называлі першымі, называць апошнімі ці не называць увогуле. Сьмерць — ня гонар і ня ганьба. Іншая рэч — ШТО чалавек зрабіў для свайго народу?

**Фларыян Ждановіч** *(† 27 студзеня)*, **Часлаў Родзевіч** *(† сакавік)*, **Уладыслаў Галубок** *(† 7 сакавіка)* былі пачынальнікамі беларускага тэатру. **Янка Купала** *(†28 чэрвеня)*... Калі й праўда цяпер адкрываюць архівы КГБ, дык, можа хоць да 50-годзьдзя сьмерці паэта даведаемся пра тое, на чыім сумленьні гэтая сьмерць?.. Загінуў у фашыстоўскім лягеры ў Беразьвеччы беларускі ксёндз **Вінцук Гадлеўскі**, адыйшоў у іншы сьвет ягоны калега **Уладыслаў Талочка**.



Ф.Ждановіч у ролі Серакоўскага

Ня стала эстэтыка **Івана Замоціна** *(25 траўня)* і гісторыка **Зьмітра Даўгялы** *(красавік)*, пісьменьніка **Сымона Баранавых** *(10 лістапада)* і паэта **Алеся Дубровіча**, які, здаецца, так і ня выдаў ніводнае кніжкі. У тыя часы мала хто паміраў сваёй сьмерцю. Адных расстрэльвалі немцы, другіх губілі бальшавікі, трэйція гінулі на фроньце. Гэтак пад Сталінградам назаўсёды засталіся **Хвядос Шынклер** *(25 кастрычніка)*, **Алесь Жаўрук** *(23 жніўня)*, **Аркадзь Гейнэ** *(16 сьнежня)*, а **Рыгор Жалязьняк** загінуў пры абароне Ленінграду. У гэты час асноўны масіў беларускай савецкай культуры — пісьменьнікі, акадэмікі, артысты, кіно — знайшоў прытулак у Татарыі ці Узьбекістане. Што там было створана значнага, адразу й не прыгадаеш. Прынамсі, «Сьцяг брыгады» Аркадзя Куляшова быў напісаны ня там, і першая кніжка вершаў Ларысы Геніюш «Ад родных ніў» таксама выйшла з друку ў іншым мейсцы, у Празе.

50 гадоў назад нарадзіліся паэтка **Вера Вярба** (Гертруда Пятроўна Сакалова, *14 студзеня)*; хормайстар **Міхась Дрынеўскі** *(12 лютага)*; гісторык і старшыня Грамады **Міхась Ткачоў**

# Дзёньнік Максіма Багдановіча

Алесь і С.



*Малюнак Сяргея Харэўскага*

На стагодзьдзе паэта адусюль пазіраюць ягоныя аднолькавыя твары — з карцін, з плякатаў, з керамічных мэдаляў. Пакрыўджаныя сьлязьлівыя вочы і валявыя шырокія сківіцы. Максім Багдановіч. Растыражаваны, ён моцна нагадвае Арнольда Шварцэнэгера. Дзіўна. Дзіўна тое, што зь некалькіх прыжыцьцёвых здымкаў паэта глядзяць зусім розныя твары іншага чалавека.

*

У Ялце, дзе пахаваны М.Багдановіч, зрабілі ўрачыстасьць. Чыталі вершы, выступаў музычны гурт «Сьвята». Дзіўна. Дзіўна тое, як пранікнёна тамтэйшая кабета сказала мне: «А вы знаете, я понимаю каждое слово!»

*

На сваё стагодзьдзе паэт стаў прадметам спрэчак. Напрыклад, ці варта друкаваць ягоны дзёньнік? Сьпісаныя роўнымі радочкамі два аркушы стандартнага памеру — пра сустрэчы з замужняй жанчынай, імя якой Клава. «Я просил ее, чтобы она отдалась мне...», «я взял ее два раза» і г.д. Арыфмэтыка сэксу. Дзіўна. Дзіўна тое, што беларуская культура зусім не гатовая даць рады гэтым мэмуарам.

*

Дзёньнік М.Багдановіча — гэта, бадай, першая нагода для беларускіх эстэтыкаў на ўласным матэрыяле прадметна вызначыць мяжу, што падзяляе эротыку й парнаграфію. Ужо для гэтага дзёньнік варта было б надрукаваць (і напісаць). Калі інтымны тэкст ня мае эстэтычных прыкметаў, тады гэты тэкст — парнаграфія. Дзіўна. Дзіўна тое, што зыходзячы са сказанага, дзёньнік Багдановіча — гэта якраз парнаграфія.

*

Калі б сам паэт хацеў апублікаваць гэты тэкст, ён бы эстэтызаваў яго, у чым, безумоўна, разьбіраўся. У яго шмат вершаў, сапраўдных шэдэўраў з эратычнымі матывамі. Значыць, Багдановіч ня думаў пра публікацыю дзёньніка? Але ўзнавіць кантэкст, у якім ён пісаў свае творы ў 1915 годзе, бяз гэтага тэксту цяжэй, чым зь ім. Таму тэкст мусіць быць апублікаваны (як гэта й робіцца ў сьвеце) у акадэмічным зборы твораў паэта — сумленна, даступна, прафэсыйна... Але дзіўна. Дзіўна тое, што адныя — трымальнікі тэксту — супраць публікацыі, бо, бароначы гонар паэта, разумеюць, што дзёньнік — парнаграфія, а другія — рэдакцыі часопісаў — за публікацыю ў сваіх выданьнях, бо, пад прыкрыцьцём чыстага імя паэта, імкнуцца зрабіць тыраж на парнаграфіі. Скрайнія ўяўленьні пра маральнасьць.

*

У трэйцім нумары *НН* Ул.Арлоў надрукаваў эсэ «Старыя Лівадзійскія могілкі». Цяпер спэцыялісты папракаюць аўтара памылкай: маўляў, Багдановіч пахаваны не на «Старых Лівадзійскіх могілках», а на вуліцы Блюхера. Але гэтак можна паставіць пад сумлеў і ўсё астатняе, што ёсьць у эсэ Арлова. Розныя жанры вымагаюць рознае ступені ўмоўнасьці. І ці ня ўся ўвогуле мастацкая літаратура можа быць «абвергнутая» фактографамі. Тым ня менш яна творыцца, бо — не для таго творыцца. Фолкнэр неяк заўважыў: усё, што я напісаў — я выдумаў, але ўсё гэта праўда. Дзіўна. Дзіўна тое, што часам якраз зь несупадзеньня фактаў жыцьця з думкамі творчае асобы й нараджаецца дзіва мастацтва.

*(10 сакавіка)*; паэт **С.Панізьнік** *(10 траўня)*, для якога нашая пэрыядычнасьць аказалася шчасьлівай, гэтаксама як і сам 1992 год, калі ён адзначыць ажно два юбілеі; *5 чэрвеня* ў спаленым ды паніпчаным Ракаве зьявіўся на сьвет будучы літаратар **Вячаслаў Рагойша** — яркі прадстаўнік вельмі выразнай школы другога, скажам так, беларусазнаўства застойных часоў. Крадком, употайкі, ціпіком гэтая школа навыдавала масу літаратуры па прыватных, быццам бы, пытаньнях, якія не складалі адкрытага фронту супраць татальнай ідэалёгіі, затое капітальна падрыхтавалі глебу, матэрыял для сёньняшніх культуралягічных распрацовак і абагульненьняў.

Крыху вылучаецца з гэтых доўгіх і аднастайных сьпісаў 1942 году дата *30 жніўня*, калі ў Менску пачаўся царкоўны сабор, які пастанавіў стварыць аўтакефальную беларускую праваслаўную царкву й прыняў адпаведны статут. Трэба думаць, што ў шырокім сэньсе гэты сабор яшчэ не закончыўся.

### *75 гадоў назад,*

у 1917 годзе Кастрычніцкая рэвалюцыя, напэўна, не выглядала такой значнай, галоўнай падзеяй году, як яе 50-годзьдзе ў 67-м. Былі бо і ўсялякія іншыя істотныя падзеі. Напрыклад, *8 траўня*. У гэты дзень малодшы унтэр-афіцэр 24-й асобнай тэлеграфнай роты Язэп Мамонька сабраў у Рызе першы гурток беларусаў-вайскоўцаў. Магчыма, гэта быў першы крок у арганізацыйнай падрыхтоўцы I Усебеларускага кангрэсу, які адкрыўся *ў сьнежні* ў Менску. А яшчэ *24-25 траўня* ў Менску прайшоў першы зьезд беларускага каталіцкага духавенства. Менская Саборная плошча стала называцца Пляц Волі...

Чаму ўсё пра Менск? Таму, што менавіта ў 1917 годзе Менск стаў цэнтрам палітычнага жыцьця Беларусі. Налета тут будзе абвешчаная незалежная Беларуская Народная Рэспубліка.

***16 лютага*** **нарадзіўся народны артыст Хведар Шмакаў, які аднолькава таленавіта выконваў ролі Леніна, Гарацыо і графа Мураўёва.** А *9 верасьня*, танцуючы лявоніху ў вёсцы Палачаны каля Маладэчна, раптоўна памёр бацька беларускага тэатру **Ігнат Буйніцкі**. У часе Лютаўскае рэвалюцыі ў Петраградзе *(28 лютага)* загінуў **нашаніўскі аўтар Уладзімер Хлябцэвіч, які пакінуў пасьля сябе рукапіс зь цікавай назвай «Прамежкавая ступень паміж беларусамі й маларосамі».**

Улетку, *22 ліпеня* й *10 жніўня*, адзін за адным прыйшлі ў сьвет народны пісьменьнік Янка



Брыль і народны паэт **Пімен Панчанка**, а перад тым, *12 траўня*, памёр дваццаціпяцігадовы **Максім Багдановіч**, які ў лютым пераехаў зь Менску ў Ялту. Багдановіч памёр, а нарадзіўся **Мікола Сурначоў**, верш якога «У стоптаным жыце» прызнаны за хрэстаматыйны:

*Ніколі ня ехаць*
*Хлапцу маладому*
*Да роднага гаю,*
*Да блізкага дому.*

*Над ім асыпаюцца*
*Слуцкія краскі,*
*Абсмалены колас*
*Схіліўся да каскі.*

*Ляжыць ён, як віцязь,*
*У стоптаным жыце.*
*Маці спаткаеце —*
*Ёй не кажыце...*

**А пражыў Сурначоў не нашмат болей за Багдановіча, можа, на год-два. Гэта лёс паэтаў? ці лёс нацыі? ці час такі бурны, шалёны, рэвалюцыйны?..**

Яшчэ адна прыкмета гэтага часу: В.Бялыніцкі-Біруля сканчае карціну «Ціхая восень»...

### *100 гадоў назад*

1892 год. Усяго толькі тры сьмерці — археоляга, спэцыяліста па Пуцілкавічах на Ушаччыне, а таксама па народнай мэдыцыне **Франьцішка Вярэнькі** *(4 сакавіка)*, мастака-пэйзажыста **Міколы Атрыганіева** *(2 чэрвеня)* і паэта **Фэлікса Тапчэўскага** *(17 сьнежня)*. Яшчэ ў канцы мінулага стагодзьдзя Тапчэўскі напісаў верш «Саўсім ня тое, што было». Гэткі фатальны матыўчык расчараваньня ў сучаснасьці, які таксама зьведвае ці ня кожнае пакаленьне, калі вуснамі лепшых сваіх паэтаў паўтарае: няма таго, што раньш было... у капцох паснула, зельлем зарасло... I да т.п.

Гэта памерлі, а нарадзіліся... Ну, скажам, толькі ў *студзені* — **Адам Станкевіч** *(6)*, **Рыгор Шырма** *(8)*, паэт-камуніст, нашанівец і ўдзельнік штурму Зімняга **Алесь Гурло** *(19)*, **Браніслаў Тарашкевіч** *(20)*... Пачаўся рух на Менскай конці, у Магілеве адкрылася школа паліцэйскіхураднікаў. Адам Багдановіч паступіў на службу ў зямельны банк у Горадні. Праз чатыры гады ён



Кс. Адам Станкевіч

пераедзе ў Ніжні Ноўгарад, а летась у яго ў Менску нарадзіўся сын Максім. *30 верасьня* нарадзілася (лёгка здагадацца, чытаючы дату нараджэньня) **Зоська Верас**... Шышкін піша на Палесьсі краявіды... Яшчэ нарадзіўся беларускі гісторык **Міхал Мялешка** *(красавік)*, пра лёс якога нічога ня ведаюць нават тоўстыя энцыкляпэдыі.

**Шмат чаго друкуецца. Напрыклад, «Тралялёначка» Ф.Багушэвіча, першае беларускае апавяданьне, якое выйшла ў Кракаве, у друкарні В.Анчыца. Цікавая падзея году — Радашкавіцкая тэатральная задума. Што гэта такое? Некалькі ініцыятараў задумалі ў Радашкавічах паставіць п'есу Ядвігіна Ш. «Злодзей», паказаць яе пры ўдзеле аўтара, а на выручаныя грошы адкрыць лякарню. Пастаноўку давялі да генэральнае рэпэтыцыі. Але спэктакаль на «забароненай» мове забаранілі мясцовыя ўлады. Задума толькі й засталася.**

### *125 гадоў назад*

*5 сьнежня 1867 году* нарадзіўся **Язэп Пілсудзкі**. Добрая нагода нарэшце нешта сказаць пра яго і на Беларусі. Выйшаў царскі цыркуляр, які забараняў выдаваць беларускія кніжкі лацінскім шрыфтам. Нарадзіўся **Мітрафан Даўнар-Запольскі** *(14 чэрвеня)*, кажуць, самы беларускі са «старых» гісторыкаў. **Іван Насовіч** выдаў «Зборнік беларускіх прыказак», а **Мсьціслаў Камінскі** — цэлую сэрыю артыкулаў, зь якіх запомнілася назва аднаго: «Аб паэтычных уяўленьнях літоўска-крывіцкага народу ў яго песьнях». 1867 год. Адыйшлі скульптар **Казімер Ельскі** (гэта ягоныя статуі ў парталах Віленскай катэдры) і **Ігнат Легатовіч** *(28 верасьня)*, паэт, які служыў у сістэме адукацыі, а калі страціў зрок, дык пасяліўся ў Менску й напісаў па-беларуску верш «Скажы, вяльможны пане...», які надрукаваў у віленскім альманаху «Баян», за што гэты альманах і сканфіскавалі. А ўвогуле ня надта яркі год. Тры гады, як край ляжаў утаймаваны й павержаны...

### *150 гадоў назад*

1842-гі. Ужо зусім ненамацвальны, зусім далёкі. Хіба што нейкія ймёны, падзеі, творы, якія сталі для цябе блізкімі, касуюць гэтую адлегласьць.

*12 траўня* ў Парыжы памірае ад сухотаў менскі мастак **Валянтын Ваньковіч**, аўтар знакамітых партрэтаў Міцкевіча, Пушкіна, Напалеона. А перад тым *12 студзеня*, там жа, у Парыжы, у лекцыі ў Колеж дэ Франс Адам Міцкевіч называе беларускую мову «самай гарманічнай і з усіх славянскіх моваў найменш зьмененай». Што ў гэты час адбываецца на Беларусі? На мейсцы Берасьцейскага замку дабудоўваюць новую крэпасьць, Адам Плуг сканчае Слуцкую гімназію, Тадэвуш Гарэцкі (вучань, дарэчы, Ваньковіча) піша карціну «Унутраны пэрспэктыўны від Лютаранскай царквы сьв. Пятра», Франц Савіч уцякае з Каўказу, куды яго выслалі ў салдаты, а Юліяна Бакшанскага яшчэ толькі высылаюць у Разанскую губэрню. Яму 15 гадоў. Беларусь яшчэ зусім ня звыклася з новай для сябе роляй — паслухмянае калёніі. Выходзіць настальгічная праца Міхала Балінскага «Даўняя Віленская акадэмія», апублікаваны верш Яна Пашкевіча «Полска квітнее лацінаю...», зьяўляецца першы том



В.Ваньковіч.
Аўтапартрэт.

*(Працяг на староньцы 12)*

*

Арлоў ужо пісаў пра спрэчку вакол праху паэта — ці перанесьці яго ў Менск, ці пакінуць у Ялце. У першым выпадку можна было б зрабіць перазахаваньне моцнай акцыяй нацыянальнага адзінства. У другім — трэба было б думаць пра шматлікіх аматараў творчасьці Багдановіча — пілігрымаў да праху паэта, і пра прыгожую легенду (ужо ж без такой дэталі, як «вуліца Блюхера»). Дарэчы, у іншых краінах такое пытаньне — перанос ці неперанос праху вялікага паэта нацыі — вырашае парлямэнт. Дзіўна. Дзіўна тое, што калі б у нас гэтае пытаньне вырашаў Вярхоўны Савет, дык, як бы ён ня вырашыў, у безумоўнай меншасьці засталіся б тыя дэпутаты, якія хоць некалі чулі гэтае прозьвішча — Багдановіч.

*

Архіў Максіма Багдановіча страчаны. Кажуць, ён можа быць у Мюнхене, у эмігрантаў. Але дзіўна. Дзіўна тое, што цяпер быццам і не запатрабуеш, як раней, у благія часы, бо абсалютна адмоўная прысутнасьць эмігрантаў у нашай культуры стала абсалютна станоўчай. Скрайнія ацэнкі.

*

Падобна, што Максім Багдановіч на гэты свой юбілей задаў беларускай культуры некалькі невырашальных задач. Але якраз гэта, бадай, і ня дзіўна.



*Здымак Алеся Крыштаповіча.*

## *Героі тайнаў, плётак і музэяў...*

*Цяпер у гэтым доме на вуліцы Талстога ў Менску адкрыты філіял музэя Максіма Багдановіча. А некалі дом называлі па прозьвішчу ягонага гаспадара — Рэдзькі, і вуліца была Мала-Грыгор'еўская. Да 80-х гадоў на сьцяне будынку вісела шыльда: «У гэтым доме з 1916 па 1918 гг. жыў Зьмітрок Бядуля». Пра тое, што тут жыў М.Багдановіч, амаль ніхто ня ведаў. Як ня ведалі й пра тое, што Беларускі камітэт помачы ахвярам вайны ў 1915 годзе наняў гэты дом пад бясплатную сталоўку для ўцекачоў. Сябрамі Камітэту былі Зоська Верас, Ул.Галубок, Зьмітрок Бядуля, Ванда Лявіцкая. Якраз увосені 1916 г. яны атрымалі вестку ад М.Багдановіча пра тое, што ён зьбіраецца ў Менск і просіць знайсьці яму працу й кватэру. Адразу падумалі пра дом Рэдзькі. У былой сталоўцы пасяліўся З.Бядуля зь сёстрамі, а яшчэ адзін, сьветлы пакой, вырашана было адвесьці М.Багдановічу. Тут паэт і пражыў пяць месяцаў. У 1917 г. у Рэдзькавым доме пасялілася яшчэ Зоська Верас са сваёй маці. Тут увесь час зьбіраліся людзі беларускай культуры й палітыкі, тут адбывалася шмат цікавых гістарычных падзеяў... Але, на жаль, вельмі мала пра гэта сказана й паказана ў новым філіяле.*

*Доўгі час гэта быў толькі «дом Бядулі», цяпер — толькі Багдановіча.*

*Яшчэ адна старонка гісторыі гэтага будынку — барацьба за яго. У 1984 г. на гэтым мейсцы пачыналася будаўніцтва новага мікрараёну. Старая драўляная забудова ішла пад знос. Калі дайшла чарга да гэтага будынку, улады прызадумаліся й вырашылі, што «дом Бядулі» цяпер ужо непатрэбны. Па-першае, «какой-то белорусский писатель», па-другое, даўно памёр, па-трэйцяе, жыд, па-чацьвертае... Нехта з чыноўнікаў адшукаў гадавік «Вольнай Беларусі», дзе З.Бядуля пісаў: яшчэ ўчора Менск кішэў ад брудных бальшавіцкіх шынялёў, — сёньня гэтага смуроду няма... Магчыма, гэтыя словы й вырашылі лёс дома Рэдзькі. Зьнесьці! Усе намаганьні Зоські Верас, яе лісты з доказамі таго, што ў доме жыў Максім Багдановіч, засталіся без увагі. Тут спрычынілася яшчэ й пазыцыя сваякоў Бядулі. Па-першае, яны абурыліся на Зоську Верас, якая выкрыла няпраўду ў Бядулевым «Страцім-Лебедзі», дзе той пісаў, што жыў з Багдановічам у вадным пакоі. Па-другое, сваякі хацелі бачыць у доме Рэдзькі музэй Бядулі, які «на нейкі час прытуліў Багдановіча ў сябе». I супрацоўнікі музэя Багдановіча тады падтрымалі гэткую пазыцыю Бядулевых сваякоў, што ледзь не загубіла дом, бо музэю Бядулі на той час ніхто не зьбіраўся рабіць.*

*Увосені 1983 г. Зоська Верас папрасіла мяне сфатаграфаваць дом Рэдзькі й зрабіць плян пакояў. Сфатаграфаваў я дом увосені, а плян зрабіў толькі ў лютым 1984. Тады ж жыхары сказалі мне, што праз які месяц дом будзе зьнесены. Трэба было хутка нешта рабіць.*

*Першы, да каго я дазваніўся, быў Генадзь Бураўкін. Ён сказаў мне: напішы хутка ў ЛіМ, спашліся на лісты Зоські Верас, а я затэлефаную рэдактару ЛіМа, яны хутка надрукуюць, а далей паспрабуем нешта зрабіць.*

*Так і атрымалася. Ліст хутка надрукавалі, а потым з нумарам ЛіМа й лістамі Зоські Верас быў абход установаў. Урэшце ў гарвыканкаме вырашылі дом пакінуць і зрабіць у ім літаратурна-мастацкую гасьцёўню імя Багдановіча...*

*Цяпер, калі ўсё ўладкавалася, зьявілася шмат герояў і новых плётак. Каб гэтага не было, я й вырашыў напісаць вам, у НН, гэтую гісторыю.*

Анатоль Наліваеў

# Турэмны дворык

*(Працяг са старонкі 1)*

маем халодную галаву, але гарачае сэрца. І чыста вымытыя рукі. А можа, начальнік быў некалі настаўнікам і хацеў такім чынам нагадаць лішні раз пра ўсяго толькі перавыхаваўчую функцыю ўстановы? Жалезны Фэлікс меў спагаду да беспрытульных дзяцей. Бязьлітасны ён быў адно да разьюшаных ворагаў, да контррэвалюцыі. Цікава, ці атрымаў палёгку ў сваім лёсе той, як казалі, зьняволены скульптар, які рупліва зьляпіў бюст?

Думка пра тое, што Дзяржынскі, якога Радаслаў зараз бачыў, ніколі ня ведаў волі, бо, пакуль не нарадзіўся ў турме, быў толькі гіпсам, уразіла вязьня. Ён зьлез з зэдліка і, стараючыся не рыпець, прылег на ложак. Ён ляжаў і думаў пра гіпсавага арыштанта.

Радаслаў прачытаў усю турэмную бібліятэчку, большасьць кніжак у якой — ці выпадкова? — апавядала пра яго й ягоную гвардыю.

За імклівым наступам кавалерыі ён ледзь пасьпяваў спыняцца ў гарадох і мястэчках, каб прамовай узьняць рэвалюцыйны энтузіязм працоўных. Ужо ў Польшчы ягоны спальны вагон траха не зрашэцілі кулямі легіянэры, якія ваявалі чырвоныя тылы й перастрэлі цягнік. Неўзабаве давялося ўвогуле вяртацца назад, дбаючы толькі пра тое, каб не апынуцца ззаду коньніцы. Што сталася з падрыхтаваным маніфэстам рабоча-сялянскага ўраду й загадам аб прызначэньні Фэлікса Эдмундавіча ягоным старшынём, невядома. Ён вез гэтыя важныя паперы ў кішэні сваёй славутай скуранкі.

Яшчэ ў бібліятэцы быў поўны збор твораў У.І.Леніна, але ніхто ў турме, нават нампаліт, не чытаў ПЗТ. Радаслаў узяўся вывучаць спадчыну правадыра й неўзабаве ўжо на палітзанятках прымушаў чырванець маёра, задаваў пытаньні, зь якім той ня мог даць рады. Скончылася тым, што Радаславу забаранілі чытаць Леніна, які, аказалася, ня толькі аддаваў бульбу дзетдомаўцам і пісаў пра складовыя часткі марксізму, але й заклікаў «рабаваць нарабаванае» ды, нібы звычайную справу, красамоўна пяяў тэрор і расстрэлы. Ніхто ў турме пра такое ніколі не падазраваў, і быў засмучаны сам нампаліт, якому, паводле службовага абавязку, належала ведаць першакрыніцы. Далажылі па каманьдзе — начальніку, і той таксама ня даў веры, нават калі яму прынесьлі кніжкі з закладкамі на адпаведных старонках. Збор твораў забралі зь ленінскага пакою й арыштавалі, замкнуўшы ў незгаральнай шафе, а Радаслава пасадзілі ў карцар, каб не падбухторваў вязьняў.

Вось-вось настане Новы год. Сьвята, якога міжволі чакаеш, але, прыждаўшы з келіхам у руцэ скончэньня біцьця крамлёўскіх курантаў і выпіўшы шампанскае, ня ведаеш, да чаго прыкласьці рукі. Калі не трапляў у сябрыну, Радаслаў зазвычай адразу залазіў у ложак. Чаго можна чакаць ад жыцьця: яшчэ большай шэрасьці? Новы год. Ну й што? Шампанскае. Што там шампанскае, калі марыць, дык сапраўды. Палову б жыцьця зараз за шклянку кавы са згушчонкай і бутэрброд з галяндзкім пажадана сырам. Але ў турме не даюць кавы, нават жалудовай.

У маленстве ён чытаў апавяданьнейка пра Фэлікса Эдмундавіча, яшчэ рэвалюцыянэра-пачаткоўца. Некалькі дзён той ня меў каліва ў роце. А потым яму пашчасьціла трапіць з грашыма ў кішэні ў рэстарацыю, дзе папрасіў яешню з шынкай і каву з малаком. Страву прынесьлі. Пах смажаніны й пах кавы казытаў у носе... Але ён ужо заўважыў шпега, што сядзеў за іншым столікам. Абыякава ўстаць, не пакаштаваўшы ежы, нібы толькі на хвілінку, у прыбіральню і, не апрануўшыся, уцячы праз вакно ў зімовы дзень... Жалезны чалавек. «Гвозьдзі бы дзелаць із эціх людзей».

# Алесь Разанаў

## Паэма парушанай мяжы

*На стол насьцелем карту —*
*не абрус.*
*Мінулае адсутнічала.*
*Страты*
*загойваліся самі.*
*У хаўрус*
*нас аб'ядноўваюць нетры інтэрнату.*

*Час рухаўся то ўраз,*
*то пакрысе.*
*Каб гартавацца,*
*варта быць са сталі.*
*У вокнах дом:*
*у ім жылі мы ўсе.*
*А па-за домам дрэвы падрасталі.*

*Пакоі ўсьцяж:*
*тут вучымся і сьпім,*
*і сілу падначальваем бясьсільлю.*
*А не хапіла,*
*з вокнамі,*
*усім —*
*нас,*
*чатырох,*
*у цёмным пасялілі.*

*Чатыры ложкі,*
*тумбачкі ля сьцен,*
*стол пасярод*
*ды крэслы,*
*ды ў зеніце*
*гарэла бляклая лямпачка:*
*ўзамен адсутных сонцаў.*
*Скажуць: «Пажывіце».*

*Адмежавала новае жытло*
*нас раптам ад знаёмага наўкольля.*
*І разам з намі ў поцемкі ўвайшло,*
*чым самі*
*не былі яшчэ ніколі.*

*Што разумелі —*
*мучылася.*
*Сьвет*
*быў па-за намі,*
*быццам чыйсьці досьвед.*
*Як зь ім зьяднацца?*
*Кімсьці неўпрыкмет —*
*ці дзень, ці ноч —*
*над намі вёўся досьлед.*

*Казаў настаўнік:*
*«Зло й дабро — адно.*
*Каб не памерці —*
*мусім мець дзьве веры».*
*А думка*
*апускалася на дно*
*і адчыняла*
*ў невядомасьць дзьверы.*

*Зьнікалі межы:*
*думаем?*
*ці сьпім?*
*ці сьнім сябе?*
*Той самы —*
*не мінае, не настае:*
*у нас — ён,*
*мы — у ім:*
*час, што прыкмет і воблікаў*
*ня мае.*

*Зьдзяйсьняючы таемную імшу —*
*прашамацяць то шоргаты,*
*то ўзмахі, —*
*нас працямнялі,*
*джалячы душу,*
*нібы рэнтгены —*
*ўражваючы —*
*жахі.*


*Ляжаў на ложку,*
*быццам нежывы,*
*адлучаны —*
*было нібы чужое —*
*не варухнуцца —*
*з ног да галавы —*
*ад цела —*
*невядомаю мяжою.*

*Што з намі адбываецца?*
*Плюсы*
*зьмяняліся на мінусы.*
*Спадсподу,*
*прабіўшыся,*
*гучалі галасы:*
*адны — пра зьезд,*
*другія — пра свабоду.*

*О колькі ў сьвеце белым*
*адрасоў,*
*разьмешчаных усьцяж,*
*па небасхіле!..*
*Мы думкай зазіралі ў вокны слоў,*
*а іх,*
*каб іх ня чулі мы,*
*глушылі.*

*Калі мы ў згодзе,*
*мы — учатырох.*
*Калі ў нязгодзе —*
*нас чатыры чвэрці.*
*Сьціраў змрок мяжы,*
*ды ніяк ня мог*
*мяжу,*
*што парушала душы,*
*сьцерці.*

*Вачамі іншых бачыў,*
*хто я сам.*



*Малюнак С.Харэўскага*

*З завучаных здабыткаў,*
*быццам з клеткі,*
*я вырываўся.*
*Абяцалі снам,*
*што будуць бачыць праўду толькі,*
*сьведкі.*

*У невядомасьць*
*творачы прарыў,*
*гарачай думкай набракалі словы:*
*такіх яшчэ ніхто не гаварыў...*
*У цемры — час,*
*а цёмнае — часова.*

*Душа жадала*
*шчасьця і пакут,*
*каб вырвацца*
*з надзённасьці жабрачай*
*у новы час.*
*Ды сьведчылі:*
*я — тут,*
*ці ноч, ці дзень —*
*чыесьці справаздачы.*

*Казаў настаўнік:*
*«Зло: а перамнож —*
*і зьявіцца дабро.*
*Сусьвет адзіны:*
*мы — ў ім,*
*і ў нас — ён».*
*Усьміхаўся нож,*
*чакаючы прызначанай гадзіны.*

*Сталелі дрэвы ў карані і ў ствол.*
*Навошта знацца*
*з доляю нявартай?*
*Учатырох —*
*пасланая на стол —*
*сьцяржка нахіляліся над картай.*

*Так многа межаў!..*
*Вастрыё нажа*
*паказвала магчымасьці.*
*Прыязна*
*нас клікаў сьвет.*
*Ды ёсьць адна мяжа:*
*пакуль не перайшлі яе —*
*мы вязьні.*

*Кароткае задоўжвалася.*
*Урок,*
*прыдуманы знарок,*
*каб не ляцела*
*душа, як птушка,*
*паглыбляў у змрок.*
*На сьцэны наштурхоўвалася цела.*

*Скіроўваўся ў сябе і зрок,*
*і слых.*
*У будучыню клікаў голас чыйсьці*
*і патанаў у воплесках.*
*Па ўсіх*
*тужыла не дасягнутае выйсьце.*

*Канчаўся зьезд.*
*Пад цьмянаю карой*
*бруіліся разбуджаныя сокі.*
*Зьмянялася адна пара другой.*
*Мы — не другія.*
*Мы зьдзяйсьнялі ўцёкі.*

Стары чорна-белы кінафільм, таксама бачаны ў дзяцінстве, апавядаў пра турэмную жытку гэтага чалавека. Сапраўды, ня зломак. Аднак, сядзець за кратамі, каб потым садзіць іншых... А цяпер ягоны бюст зноў у турме, у дворыку, які трымае ў прыцэле кулямётчык, што на працягу варты ня зьмежыць вока.

Адсюль не ўцячэш, і гэта не перабольшаньне. Быў, праўда, выпадак, першы й апошні. Апавядалі пра яго навікам неяк знарок абыякава, аднак і сам апавядач, і слухачы — кожны сабе думаў: ужо я не спудлаваў бы, ня трапіў, як шчупак у юшку.

Знэўтралізавалі ахову. Завалодалі зброяй. Рэцыдывісты. Увесь горад трымцеў у страху... Іх напаткалі ў пятнаццаці кілямэтрах, за горадам, у лесе. Абрабавалі вясковую крамку: гарэлка, закуска. Стрывалі толькі да лесу. Нажлукціліся й паснулі. Учулі сьлед сабакі-ваўкарэзы...

Бюст укрывала сьнегам у пераднавагоднюю ноч. Так будзе цяплей ператрываць надранішнюю халадэчу.

Апроч яго ў турме быў яшчэ адзін гіпсавы небарака-вязень. Невялікі бюсьцік самога Іліча. Ён стаяў у ленінскім пакоі на засланым чырвоным абрусам стале каля трыбункі з чаканным дзяржгербам. На вокнах, як і ва ўсіх іншых памешканьнях, былі краты, нават жалезныя дзьверы мелі закратаванае акенца-"вочка". Адзінае што: і дзьверы, і краты былі пафарбаваныя ў белы колер...

Кім ён быў, той, што зараз на вуліцы, пад сьнегападам? Тутэйшы чалавек. Са шляхты. Твар татарскі. Прозьвішча... Паляк, адным словам. Радаслаў ужо паспытаў карцару. Празь яго. Вырашыў бліснуць эрудыцыяй. А ці знаеце, спытаў у нампаліта, што напісалі польскія газэты, калі Дзяржынскі памёр? «Іздэхл едэн пес, хоцяж походзі з польскей крві...»

Напэўна, ужо дзесьці бяз чвэрці дванаццаць, бо наглядчык пачаў абыход калідору, каб, відаць, пасьпець да навагодняга віншаваньня савецкаму народу. Грук у акутыя дзьверы ботам. «С коек не вставать, к окнам не подходить! С Новым годом, (...) вашу мать!»

З калідору пачуліся гукі дынаміку: бой гадзіньніка Спаскай вежы. Звонку, з вышыні, яго раптам заглушыў вежавы звон на касьцельнай званіцы, што стаяла адразу за турэмным мурам.

Бах! Бах! Тук-тук-тук-тук. Бах! На беленай столі вязьніцы блякла адбіўся празь нямытыя шыбкі каляровы букет навагодняга салюту й млява растаў. Турэмны дворык паглынула цемра. Муры й вокны пачаў насьцярожана абмацваць пражэктарны прамень.

Настаў Новы год.

1-2 студзеня 1991 г.



*Творы сучасных беларускіх скульптараў: «Ахвяра» і «Першы чакіст».*

*Туды, туды —*
*дзе зьзяе небасхіл,*
*дзе беды растваракоцца бязь сьледу,*
*дзе сіла не адлучана ад сіл,*
*жыцьцё — ад жыцьцяў,*
*дзе ня хлусяць веды...*

*Што сталася*
*і не —*
*як спарышы.*
*Цяжар прадбачыць будучыя крылы.*
*Калі змаўкалі ў сьвеце і ў душы*
*усе гаворкі —*
*цемра гаварыла.*

*І ведаў я:*
*вясною ці зімой —*
*з усіх абмежаваньняў,*
*нібы зь ямін,*
*расьці належыць.*
*Сутнасьці самой*
*усе здаем*
*усё жыцьцё*
*экзамэн.*

*Што цяжыла,*
*спадзе, нібы рызман.*
*Я паўтару,*
*што ўведаю,*
*усім чвэрцям:*
*ня сьведчы крыва,*
*не ўваходзь у зман,*
*не прысягай багам, —*
*каб не памерці.*

*Нас,*
*распазнаных джаламі жуды,*
*нацэленых на подзьвіг невядомы,*
*расьселяць па адным —*
*каго-куды.*
*А мне парадзяць:*
*«Ты ідзі дадому».*

*Бы хто кране*
*патайную струну —*
*з душою загавораць парушэньні.*
*У чатыры столкі*
*карту я згарну,*
*нож пакладу,*
*усьміхнуўшыся,*
*ў кішэню.*

*Ня рупячыся,*
*колькі дзе гадзін,*
*жыцьцём зьяднаны,*
*быццам рэкі з морам,*
*з тым часам,*
*што ня дзеліцца,*
*адзін*
*пайду па апусьцелым калідоры.*

*Кім стаў ужо?*
*Кім яшчэ мушу стаць?*
*Нязьведаная будучыня кліча.*
*І будуць доўга ў вокнах пагасаць —*
*смуткуючы —*
*знаёмыя аблічча.*

1991

# Лісты пра сучасную літаратуру

Франьцішак Эн.

1.

Так атрымалася, што гэты ліст я пачаў абдумваць, седзячы ў невялічкай кавярні на авеню Мак-Магон, у Парыжы. Ззаду засталіся тры дні працы на канфэрэнцыі Рады Эўропы ў Ліёне, бадзяньні па парыскіх кнігарнях, букіністычныя яткі на беразе Сены, Нотр-Дам, сьцежкі Картасара. Тое, што пяць гадоў таму было знакам культуры, «вялікай мэтафарай», прачытвалася жыцьцём, пражывалася й расшыфроўвалася тут і цяпер. У гэтым цёплым і крыху вільготным паветры размываліся, гублялі пэўнасьць усялякія межы, усялякія акрэсьленасьці: я зразумеў, што знаходжуся ў Сталіцы сьвету. Але, калі гэта сталіца ўсяго сьвету, значыць і беларусаў таксама, і вось праз пэўны час я піў каву й сьмела думаў пра беларускую савецкую літаратуру (далей — БСЛ)*.

Першае, што я падумаў (зьдзівіўшыся ўціхую сваёй памяркоўнасьці), — гэта тое, што БСЛ мае свой сэнс і свае падставы, а патас аблічэньняў і прысудаў у дачыненьні да яе сёньня сьмешны й няплённы. Яна чакае ня судзьдзяў, а аналітыкаў, каб слова «савецкі» перайшло з паняцьцяў эмацыйна-ідэалягічных у паняцьці культурна-гістарычныя.

Другое — сам я ня здатны быць на вышыні гэтай мудрай ідэі, да таго ж я не мазахіст і большасьць тэкстаў гэтага літаратурнага корпусу ніколі ў жыцьці не прачытаю.

Далей мая думка рушыла ў стыхіі парадоксаў, якія я занатоўваў паводле мяйсцовай традыцыі на сурвэтцы:

«Гэтая літаратура ўсьведамляла сябе як народную, хоць на самай справе была суперэлітарнай: апісвала соврэчаіснасьць, якой не было, на беларускай мове, якая зьнікала**.

Яна дэкляравала сваю беларускасьць псэўда-этнаграфічным «сувэнірным» наборам, і сваю лаяльнасьць — адмовай ісьці ўглыб чалавечае душы.

Яна не была аднастайная: былі больш таленавітыя й менш таленавітыя, былі геніі й былі графаманы, але, як і ў кожную культурную эпоху, існавала нейкая сістэма правілаў, кодэкс жанру, які няўхільна выконваўся, існавала нейкая агульная мэнтальнасьць, агульны «тып пісьма». Тое, што пісалася па-за гэтымі правіламі, выганялася са сфэры літаратуры ў сфэру прыватнага жыцьця.

Самыя гэтыя правілы не заўважаліся й не ўсьведамляліся, ім не вучылі й іх не прапагандавалі; яны былі як паветра — імі трэба было дыхаць...

Як кожны культурны фэномэн, БСЛ мела сваё нараджэньне й свой скон. Яна нарадзілася ў дваццатых і амаль дзесяцігодзьдзе была хутчэй літаратурным андэграўндам. У трыццатых (з дапамогай пісталету) яна стала вядучым, а потым і адзіным напрамкам. Пасьляваенныя часы — «высокая клясыка» гэтай літаратуры: Куляшоў, Глебка, Панчанка, Гілевіч, Шамякін і іншыя. Потым паступова пачынаецца размываньне канону: зьяўляецца акопны псыхалягізм Быкава й рамантызм Караткевіча, нэо-клясыцызм Стральцова й мэтафізыка Разанава. Вядома, БСЛ спрабуе ўсё гэта засвоіць і прыручыць, і шмат у чым ёй гэта ўдаецца, але, засвойваючы ўсё гэта, яна ўрэшце страчвае сваю «чысьціню», жанрава-ідэалягічную акрэсьленасьць. Васьмідзесятыя гады — канон пачынае загніваць. Зьяўляецца група «камсамольскага дэкадансу» — У.Някляеў, А.Дудараў і група «імітатараў» — Мятліцкі й інш.

Калі пачынаеш уважліва ўглядацца ў імёны й тэксты, выяўляюцца досыць дзіўныя й нечаканыя рэчы. Напрыклад: на Беларусі не было сацыялістычнага рэалізму. Але гэта дзіўна толькі на першы погляд. Рэч у тым, што стрыжань сацрэалізму — гэта станоўчы герой, які перарабляе рэчаіснасьць пад пэўную ідэю. Але ж любы герой — гэта заўсёды суб'ект, а Беларусь усе гэтыя часы была аб'ектам, каленіяй, і БСЛ адбіла гэтае становішча самым непасрэдным чынам: яна была ў гэтым сэньсе безыдэйная і агераічная. Самыя ўдалыя літаратурныя вобразы былі больш увасабленьнямі вялікага міту Зямлі, чым суб'ектамі пэўнае чыннасьці, перабудовы...

Можна было б шмат чаго знайсьці ў беларускай савецкай літаратуры, але я спыніўся. Апошняе, што пра яе падумаў, — гэта тое, што ўсе гэтыя людзі засталіся, і, па інэрцыі, спрабуюць гуляцца ў клясыкаў, не хочучы заўважаць, што БСЛ даўно ўжо знаходзіцца на пэрыфэрыі духоўнага жыцьця нацыі.

Але больш за ўсё, калі ўглядаесься ў тыя часы, не хапае высокага й чыстага голасу, асобы, якая зь нетраў свае эпохі паўстае супраць, ахвяруе й растрачвае сябе на гэта. Тое, што зрабілі Венцлава й Мілаш, Бродзкі й Салжаніцын, Хмара й Айгі, Гавэл і Кундэра. Тое, чаго тут, на Беларусі, не зрабіў ніхто. Вядома, нельга патрабаваць ад людзей гераізму самазабойцы, дый палітычным пратэстам не заменіш літаратуры, але... Тая інэрцыя палітычнага й інтэлектуальнага канфармізму, тая духоўная й душэўная сьпячка прывяла да таго, што сёньня, калі магчымыя й проста неабходныя навацыі — і яны адбываюцца ва ўсіх сфэрах жыцьця — у БСЛ мёртвы сэзон.

Больш таго, на сёньня часопісы «Маладосьць» і «Полымя» — гэта кампрамэтацыя беларушчыны, асяродак былой савецка-пісьменьніцкай намэнклятуры дый проста «сваіх людзей». І, самае жахлівае, гэты асяродак пашыраецца за кошт таленавітых і здаровых.

Вось ужо А.Федарэнка, як на службу, ідзе з партфелем на вечарыну С.Законьнікава... Вось ужо А.Казлоў*** робіць лісьлівае інтэрвію з «мэтрам»... Вось ужо...

Такім чынам я сядзеў у невялічкай кавярні на авеню Мак-Магон і думаў пра Юліяну Крысьцеву****.

У сьвядомасьці ўсплыла ідэя, аўтарам якой, магчыма, зьяўляецца Лао-Цзы, і якая ў XX стагодзьдзі была выразна й правакатыўна сфармуляваная Жакам Дэрыда. Ідэя дэцэнтрацыі. Справа ў тым, што знаходзячы сябе сярод размаітых апазыцыяў (белае — чорнае, мужчына — жанчына, розум — пачуцьці, захад — усход), мы ўвесь час выбіраем адно, цэнтруючы сваю сьвядомасьць і выцясьняючы другое на пэрыфэрыю — жыцьця, культуры альбо тэксту. Але, магчыма, больш сапраўдны спосаб існаваньня сярод апазыцыяў (якія ёсьць анталёгія нашае сьвядомасьці) — не барацьба й выбар, а суіснаваньне й гульня. На гэтай ідэі-інтуіцыі паўстала ўся культура Далёкага Ўсходу, а ў Эўропе нашага стагодзьдзя яе прынялі ды пражылі Гесэ, Рыльке, Хайдэгер...

Прыгадваючы ўсё гэта, я зразумеў, што для нас гэта зусім не абстрактныя развагі.

Рэч у тым, што пасьля краху камунізму былы Цэнтар умомант стаў Пэрыфэрыяй, але захаваў у сваіх руках усю інфраструктуру, усе формы культуры і, у пэўным сэньсе, паразытуе сёньня на гэтых формах, імітуючы культурную дзейнасьць. Вядома, савецкая беларускасьць ужо нікога ня цешыць, але маразм беларускага тэлебачаньня, імітацыя беларускай палітыкі й антыінтэлектуалізм беларускай савецкай літаратуры засталіся. Высьпявае новая апазыцыя — не паміж беларускім і не-беларускім, а ўсярэдзіне самой беларушчыны, — паміж самазадаволенай імітацыяй духоўнага жыцьця, што засвоіла дэкарацыі нацыянальнага адраджэньня, перафарбаваўшы сябе ў бел-чырвона-белы колер, — і доўгай і цяжкай чарнавой працай дзеля стварэньня аўтаномнай прасторы беларускай духоўнасьці.

У гэткай сітуацыі мы проста ня маем правоў адхіляцца ў змаганьні й выпіхваньні, **НАМ НЕЛЬГА ПЕРАМАГЧЫ Й СТАЦЬ УЛАДАЙ.** Беларускае адраджэньне — гэта не паход «шчыльнымі радамі» і пад адзіным сьцягам — гэта пашырэньне прасторы магчымасьцяў усярэдзіне самае культуры. Толькі рэалізуючы сябе й па сваіх правілах, мы рэалізуем сваю беларускасьць...*****

Такім чынам, я сядзеў у невялічкай кавярні, у Менску, і са сьвядомасьці выплывалі зусім іншыя словы...

*Дзьверы шкляныя*
*Бачу: сьвет у аблоках*

*Імклівых, як быццам неба*
*Пустых, зьнікомых*


*Але не дарэмных*
*Усё ж такі*

*Сьмерць?*
*О, божа...*

*Усё ж не дарэмных.*

Заўвагі аўтара:

*Тонкая алюзія на тэму «людзьмі звацца».
**І.Б.Зінгер: «Нішто так не спрыяе прывідам, як мова, што памірае. Чым больш мёртвая мова, тым больш жывы прывід».
*** Маладыя беларускія празаікі.
**** Францускі сэміётык.
***** «Так казаў Абдзіраловіч».



# Ordo Sancti Benedicti

Алег Дзярновіч

**Кожны, хто хоць крыху**
**зацікавіцца архітэктурай Беларусі,**
**адразу сутыкнецца**
**з назвамі каталіцкіх кляштараў,**
**якія належалі розным ордэнам**
**(законам). Можна проста патануць**
**у гэтай фактуры,**
**так і не зразумеўшы спэцыфіку**
**кожнага закону,**
**але адчуўшы,**
**што каталіцкая царква —**
**гэта зусім не маналіт,**
**яе гісторыю нельга ўспрымаць**
**толькі як гісторыю**
**татальнага наступу на Ўсход.**
**Унівэрсум каталіцтва**
**ўключае ў сябе**
**розныя ўнутраныя плыні,**
**якія часам разыходзіліся**
**як у сьветапоглядных пытаньнях,**
**так і ў арганізацыйных.**
**Без уліку гэтай спэцыфікі**
**нельга зразумець культуру**
**Старабеларускай дзяржавы,**
**яе дыпляматычную сытуацыю,**
**разьвіцьцё адукацыі...**
**У мінулым нумары *НН***
**была гутарка пра картузаў,**
**картузіянскі закон**
**і Картуз-Бярозаўскі**
**картузіянскі кляштар.**
**Сёньня размова пра бэнэдыктынаў.**



*Кляштар бэнэдыктынак у Менску. Рэканструкцыя В.Сташчанюка.*

У даведніках пішуць, што першы манаскі ордэн быў бэнэдыктынскі. Але на самай справе кляштары йснавалі й раней. Проста ў эпоху Вялікага перасяленьня народаў сувязь паміж асобнымі кляштарамі парушылася, а манаскія звычаі заняпалі. Дэградацыю ўзяўся спыніць Сьвяты Бэнэдыкт з Нурсіі. Ён засноўвае кляштар Монтэ-Касіна, дзе апрабоўвае свой праект манаскага жыцьця*. Гэты праект — «540 Правілаў» — своеасаблівы статут кляштарнага ладу. Грунтуючыся яшчэ на ерархіі каштоўнасьцяў Сьв.Базыля (пастаяннае знаходжаньне ў кляштары; падпарадкаваньне абраннаму абату — «паслухмянасьць»; агульнасьць маёмасьці, адмаўленьне ад уласнасьці — «чысьціня»), Сьв.Бэнэдыкт улічыў такія моманты, якія сьведчылі пра ягонае глыбокае веданьне чалавечае натуры. У прадбачаньні небясьпекі, да якой магло прывесьці аднастайнае й самотнае жыцьцё, уведзена разумнае разьмеркаваньне часу, прысьвечанага ня толькі малітвам, але й фізычнай працы. З улікам больш суровага клімату заходніх краінаў дазваляліся й некаторыя сьвецкія радасьці, напрыклад, ужываньне віна. І бэнэдыктынскія законьнікі, выпрабляючы свае гатункі напояў, мелі посьпехі. Упершыню ў вабацтве Фэкан у Ніжняй Нармандыі быў выраблены бэнэдыктынскі ліквор — каньяк, настаяны на зёлках, што сабраныя на беразе мора**.

Добра распрацаваны статут ды чалавечныя прынцыпы яго спрыялі хуткаму пашырэньню бэнэдыктынскіх кляштараў па Эўропе — у 12-14 стагодзьдзях іх стала больш за 15 тысяч. Але ня толькі колькасьць вылучала бэнэдыктынаў у эўрапейскай цывілізацыі. Яны стварылі свой Сусьвет. Пачалося з абавязковага правіла кожнаму кляштару мець бібліятэку. Пасьля сьмелай практыкі Касідора*** бэнэдыктыны пачалі перапісваць паганцаў. Выходзіла, што ва ўнутраным жыцьці манахі не выконвалі нормаў ізаляцыі ад нехрысьціянскага. Гэтую дылему бэнэдыктыны пераадолець не змаглі. І іхнія бібліятэкі ператвараліся ў сховішчы замкнёнай вучонасьці. «Неверагоднае багацьце ведаў, назапашаных кляштарам за стагодзьдзі, цяпер ператварылася нібы ў тавар, у падставу дзікай ганарлівасьці, пагарды да сабе падобных; як рыцары выхваляліся адзін перад адным кірасамі ды штандарамі, таксама абаты пахваляліся аздобленымі тамамі»****. Такім чынам, бэнэдыктыны стварылі такую бібліятэку, дзе ў цэльнасьці захоўваліся тэксты, але гэтыя старыя тэксты не былі грунтам для стварэньня новых. Бібліятэкі бэнэдыктынаў — гэта лябірынт, зь якога не было выйсьця, але тупікі якога прываблівалі. Атаесамленьне Розуму й Памяці характэрнае для культур, што заснаваныя на запамінаньні мноства тэкстаў, а не на стварэньні новых. (Зрэшты, мы й зараз маем тую самую праблему, пазбаўляючыся ад савецкай мадэлі сьвету, зыходным момантам якой зьяўляецца «Спецхран».)

Такая дактрына вяла й да абмежаваньня кола тых, каго маглі прыймаць у бэнэдыктынскія кляштары — а гэта былі толькі дзеці шляхты. Наступствы сталіся нечаканымі — кляштары запоўнілі людзі, якіх найперш цікавілі зброя ды паляваньне... Той час — 12-13 стст. — характэрны ўзьнікненьнем новых манаскіх законаў. Шматлікія кангрэгацыі ўтвараліся і ў межах бэнэдыктынскага закону. Новыя структуры ўзьнікалі пераважна паводле тэрытарыяльна-нацыянальных прыкметаў, што адпавядала глыбінным зрухам у эўрапейскай сьвядомасьці.

Поўная інтэграцыя Беларусі й Літвы ў эўрапейскую прастору супала з новым пэрыядам гісторыі кантынэнту. Калі каталіцкія законы пачалі актыўную місыянэрскую дзейнасьць у нашым краі, існавалі ўжо й больш дынамічныя ордэны дамініканаў ды францішканаў, і бэнэдыктыны ня сталі самым распаўсюджаным законам у Вялікім княстве. Існавалі наступныя бэнэдыктынскія кляштары:

1. у Старых Троках — заснаваў у 1410 г. Вялікі князь Вітаўт;
2. у Гарадзішчы каля Пінску. Фундаваў троцкі ваявода Караль Капец у 1659 г. Быў заселены манахамі са знакамітага Монтэ-Касіна, чаму й атрымаў назву Castrum Cassinum. Будынак гэтага кляштара захаваўся;
3. пад Нясьвіжам. Фундаваў Міхал Казімер Радзівіл;
4. у Менску заснаваны ў 1700 г. менскім харунжым Статкевічам;

Адначасова з мужчынскімі бэнэдыктынскімі кляштарамі ўзьнікалі й жаночыя. Першы такі кляштар заснавала Сьв.Схалястыка — сястра Сьв.Бэнэдыкта з Нурсіі. На Беларусі жаночыя бэнэдыктынскія кляштары йснавалі ў наступных мейсцах:

1. Нясьвіж — фундаваў у 1590 г. Мікалай Радзівіл Сіротка. Сёньня ў будынку месьціцца пэдагагічная вучэльня;
2. Вільня — захаваўся;
3. Ворша;
4. Менск — зараз на гэтым мейсцы пракуратура й кінатэатар «Перамога»;
5. Драгічын-Падляскі — захаваўся;
6. Смаленск. У сувязі з расейскай акупацыяй перанесены ў Слонім, дзе за манашкамі замацавалася назва axulantkae smolensensae (смаленскія выгнаньніцы). Будынак кляштара ў Слоніме захаваўся.

У 17 стагодзьдзі пад час расейскага генацыду ды швэдзкіх наездаў (а швэды ўжо былі пратэстантамі й глядзелі на каталікоў, як на іншаверцаў) на Беларусі шмат бэнэдыктынскіх законьніцаў было замардавана, асабліва ў Вільні й Нясьвіжы. З таго часу бэнэдыктынкі Вялікага княства мелі прывілей нашываць на адзеньне крыж з кармазінавага аксаміту — як напамінак пра пакуты іх сёстраў.

Яшчэ на пачатку 19 ст. (ужо за расейскім часам) бэнэдыктыны (як у Слоніме) будавалі на Беларусі свае камяніцы. Архітэктурная спэцыфіка іхніх комплексаў у тым, што касьцёл абавязкова сумешчаны з будынкам кляштару, а сам кляштарны будынак звычайна выцягнуты, не замкнёны... Але ўжо пасьля паўстаньня 1831 г., якое падтрымалі многія манахі, усе кляштары гэтага закону былі зачыненыя.

Новая старонка гісторыі бэнэдыктынаў на Беларусі пакуль не перагорнутая.

* кляштар Монтэ-Касіна заснаваны каля 529 г., знаходзіцца на сярэдзіне шляху з Рыма ў Нэапаль, на мейсцы сьвяцілішча Апалёна. Гэта галоўны кляштар бэнэдыктынаў. Тут пахаваныя Сьв.Бэнэдыкт і ягоная сястра Сьв. Схалястыка. Менавіта пад сьценамі гэтага кляштару ў 1943-44 гадох загіне шмат хлопцаў з Заходняе Беларусі, якія пад англа-амэрыканскім камандаваньнем будуць доўга й крывава браць захопленую нацыстамі цьвярдыню.

** ліквор «Бэнэдыктынас» можна й сёньня набыць у Вільні.

*** Касідор Флаві Магн Аўрэлі (каля 490 — каля 585 гг.) — стварыў узорны сярэднявечны навуковы цэнтар, абгрунтаваў ды ўвёў у манаскую практыку перапісваньне кніг, што асабліва істотна — паганскіх рымскіх ды грэцкіх аўтараў.

**** цытата з раману Умбэрта Эко «Імя ружы».

*Vieršy dla zavučvańnia*

## NAŠY PTUŠKI

U našym krai Biełarusi —
jość busły, saroki, husi,

kački, čybisy, sakołki,
čapli, sovy, pierapiołki,

dziatły, čyžyki, ziaziuli,
kuliki, siaŭcy, žaŭnuli,

kala rečak, na łužajkach
jość hłušcy, stryžy i čajki,

i viaducca na bałotach
žuraŭli ŭ hustych čarotach;

pa nadvorku, kala chaty,
chodziać kury j kuraniaty.

Chto sakoča, chto kudachča,
chto pa strechach sprytna skača,

chto na kuśćiku ŭ sadočku,
chto na poli, chto ŭ lasočku.

Pačnuć choram — nie ździvicca.
Jość dzie pieć i viesialicca!

*(A.Hurło)*

## PINHVIN

Zapytaŭsia ŭ maci syn:
— Mama, dzie žyvie pinhvin?
Adkazała maci synu:
— U Vantarktycy pinhviny.
Treba lod im cely hod,
Kab davać nyrca pad lod.
Tam im choraša kupacca,
Zahartoŭvacca, nyrać —
Kožny raz viaśnie ździŭlacca,
Pinhviniatak hadavać.

*(I.Juklajeŭski)*

## Otis tarda

*«Вось сымбаль твой, забыты краю родны!»*

У Новай Зэляндыі ёсьць адзін сумны сымбаль. Гэта — моа, самая вялікая птушка сьвету (3 м у вышыню), што была выбітая ў часы Асьветніцтва. Яе амаль сваячка — драхва (Otis tarda), самая высокая птушка Беларусі, напэўна зьнікла ўжо на прыканцы 60-х гадоў нашага стагодзьдзя.

«Гэта той, хто ў Вафрыку пешкам ходзіць» — кажуць пра драхву на Гомельшчыне. І маюць пэўную рацыю. Па-першае, апошнія віды яе сямейства сапраўды жывуць у Вафрыцы ды Арабіі, а па-другое, драхва сапраўды нядрэнны хадок. Перад тым, як узьляцець, ёй трэба добра разьбегчыся. Ну, рыхтык стравус, які ўвогуле ня лётае!

Беларуская драхва калісь была звычайнай жыхаркай паплавоў, палёў ды лесастэпаў ад Горадні да Гомля, па ўсім поўдні Беларусі. Але такая маса птушынага мяса (пад 20 кг) была надта вабная для спажыўца-чалавека... Апошнюю птушку забілі ў 1926 годзе каля вёскі Вялікі Бокаў Мазырскага павету.

Сёньня ў сьвеце зробленыя сур'ёзныя захады дзеля ўратаваньня драхвы. На Беларусі, магчыма, ужо позна... А калісь гэтая пералётная птушка часам нават не адлятала ў чужыя краі з роднае зямлі. І над палямі лунаў яе ціхі роспачны голас. А пад вясну ў самцоў вырасталі доўгія «вусы» з валаскоў-пёркаў, расквечваўся іхні руда-жоўты ўбор. І зноў у непрыкметных лунках на палёх птушкі адкладалі 2-4 аліўкава-зялёныя яйкі, каб новае пакаленьне пярнатых аўтахтонаў пабачыла нашую зямлю.

Было...

H.S.



## Зь Беларусі й Літвы

### Вільня

У канцы кастрычніка старшыня ВС Беларусі С.Шушкевіч разам з цэлай экіпай народных дэпутатаў прыляцеў самалётам на адзін дзень у Вільню, каб падпісаць дэклярацыю зь Летувіскім бокам. У рамках усяго гэтага Шушкевіч каротка сустрэўся з прадстаўнікамі беларусаў Вільні, дзе запэўніў, што даўно абяцаная камісія ВС Беларусі ў справе дапамогі віленчукам абавязкова прыедзе, што пытаньне летувіскага грамадзянства для беларусаў будзе вырашанае на перамовах, што ці не галоўнай умовай міждзяржаўнага пагадненьня будзе пранікальная мяжа... Мінуў час. Камісія з дапамогай так і не прыехала, тэрміны атрыманьня грамадзянства прайшлі, і газэты паведамілі, што памежны рэжым Летувы з СССР (у тым ліку і з Рэспублікай Беларусь) будзе вызначаны на перамовах летувісаў з Масквой... Чаго прылятал?

У былым генэрал-губэрнатарскім палацы адбылася выстава працаў, аўтары якіх — студэнты Менскае мастацкае акадэміі Валеры Дашкевіч, Анатоль Саковіч, Алесь Поклад, Уладзімер Юрчанка, Дзяніс Раманюк, Сяргей Бабарыка й Вольга Кірэева. Як заўважана ў летувіскім друку, іхні «жывапіс адлюстроўвае традыцыі менскай мастацкай школы», а як сказаў адзін паспаліты наведнік, «такія маладыя, а занадта ўжо прафэсыйныя, стрыманыя». З'арганізаваў выставу віленскі мастак Сяргей Поклад.

### Навагрэдак

Пачынаючы з наступнага году, у траўні ў Навагрэдзкім замку будуць праводзіцца Мяндоўгавыя Чытаньні, — піша *Kurier Wileński*. — Удзел у імпрэзе возьмуць літаратары й гісторыкі зь Беларусі й Летувы. А ў 1993-м, да 640-й гадавіны хрышчэньня Мяндоўга, гэтаму князю ў Навагрэдку плянуецца адкрыць помнік.

### Радунь

Тут будзе закладзены этнаграфічны музэй з экспазыцыяй пра Людвіка Нарбута, Караля Падчашынскага, Станіслава Юньдзіла. Будынак ужо знайшлі, цяпер яго рамантуюць.

### Лагойшчына ў 1991 годзе

18 красавіка ў Лагойску праводзілася вечарына «Пазнай сябе сынам Лагойшчыны», на якой мясцовыя таленты некалькі гадзінаў чыталі вершы, сьпявалі песьні ды спрачаліся пра гісторыю й сучаснасьць.

Упершыню за апошняе паўстагодзьдзе ў вёсцы Юркавічы афіцыйна сьвяткавалі Сёмуху. Былі ксёндз і каля 4 тысяч народу. Сабраныя ахвяры на будаваньне касьцёлу.

13 чэрвеня ў вёсцы Корань ужо другі раз людзі афіцыйна адзначылі дзень сьв. Антонія на мейсцы былога касьцёлу, збудаванага Вітэбскім капітулам у 1605 годзе й спаленага партызанамі ў 1943. Тут, побач з магілаю Дамініка Луцэвіча — бацькі Янкі Купалы — ксёндз Уладыслаў Завальнюк адслужыў імшу па ўсіх памерлых. Людзі, якіх было каля трох тысяч, сабралі грошы на адбудову касьцёлу.

У траўні-ліпні ў Лагойску добраўпарадкавалі былое касьцёлішча й мейсца пахаваньня роду графоў Тышкевічаў. З дошак зрабілі каплічку, пачалі будаваць плябань.

У вёсцы Харужанцы ў музэі Янкі Купалы рыхтуецца музэйная экспазыцыя да 110-годзьдзя паэта. Даводзяць да парадку хутар Акопы, дзе Купала напісаў шмат твораў.

Верасень. Дзякуючы намаганьням мяйсцовых жыхароў, у вёсцы Дзьвіносе пачалося аднаўленьне Пакроўскае царквы, збудаванай у 1913 годзе на грошы беларусаў, якія выехалі па заробкі ў Вамэрыку.

17 верасьня ў вёсцы Корань адбылася вечарына «Жыве Беларусь» з нагоды вяртаньня гістарычных сымболяў: бел-чырвона-белага сьцягу й Пагоні. Адбылося набажэнства. Госьці глядзелі ткацкія вырабы мяйсцовых майстроў, слухалі народныя сьпевы, частаваліся традыцыйнымі дранікамі, пернікамі, журам...

27 кастрычніка ў вёсцы Міхалкавічы праводзіўся дзень памяці братоў-асьветнікаў Казімера й Язэпа Гладкіх — заснавальнікаў першай беларускай школы ў Барысаўскім павеце. Казімер Гладкі быў расстраляны ў 1937 у Курапатах. Язэп выехаў у Вамэрыку, дзе выдаў «Лемантар для школаў і хатняга навучаньня» ды іншыя школьныя падручнікі, а таксама кніжкі «Краёвы слоўнік Лагойшчыны», «Прыказкі Лагойшчыны», зборнік песьняў «Дудар» і іншае. Шмат што са спадчыны Язэпа Гладкага (Адама Вярлыгі) яшчэ ня выдадзена ў друку. На хаце, у якой нарадзіліся й жылі асьветнікі, прымацаваная мэмарыяльная дошка, а ў школе, што збудаваная іхнімі рукамі, мяркуецца быць музэй.

Толькі за два месяцы, жнівень і верасень, у нашай і суседняй вёсках здарыліся ажно тры самагубствы. Першы накінуў на сябе пятлю 27-гадовы А-і, двое другіх былі ў гадох — А-ч і Б-х. Мала гора родным і блізкім, дык яшчэ ксёндз адмаўляецца служыць па памерлых імшу. «Раней, — кажа, — самагубцаў наогул хавалі за агароджай могілкаў».

В.К.

## Pamiaci Mirki

*Ludvika Sivickaja-Vojcik (Zośka Vieras) była apošniaj z aūtaraū kolišniaj* Našaj Nivy, *dzie jana drukavałasia pad pseūdonimam Mirka*

**Aleh Abłažej**

Niadaūna stała viadoma, što častka załatoha zapasu Lietuvy ūsie piaćdziesiat hadoū akupacyji zachoūvałasia ū Francyji. Adnak źniavolenyja krainy musiać dzieś u biaśpiečnym miejscy zachoūvać nia tolki zołata; u budučyni im spatrebicca nia tolki toje, što možna źbierahčy ū braniavanych sejfach, ale j toje, što chavajecca ū dušy.

Biełaruś mieła svaje «banki duchoūnaści», paraskidanyja pa ūsim śviecie. Častka hetaha skarbu zachoūvałasia ū viadomaj «lasnoj chatcy» pad Vilniaj. Ale siońnia niama ūžo j samoj chatki, i haspadyniu jaje — Zośku Vieras — pravodzili niadaūna ū vapošni šlach...

Kali žyćcio piśmieńnika paraūnoūvać z knihaj, dyk žyćciovaja kniha Zośki Vieras była značna bolš jomistaja, čym tyja ścipłyja tvory, što jana napisała. Adnak kniha jaje žyćcia ūsio adno kryūdna abarvałasia na samym cikavym miejscy — joj nia sudžana było ūbačyć plonu svaje pracy.

Słovy «Viečny adpačynak daj joj, Boža» — u dadzienym vypadku nie alehoryja; jaje žyćcio, asabliva ū vapošnija hady, było pakutaj dla jaje i zmušała da samaachviarnaści jaje blizkich, i śmierć pryjšła zbavicielkaj, čornym aniołam suciašeńnia, jak jaho malavali staražytnyja majstry. Zośka Vieras **była**. Kali niščyłasia ūsio biełaruskaje, a Biełaruś upeūniena kročyła da kamunizmu, možna było naviedacca da jaje, u chatku, dzie pachła ziołkami j starymi knihami, dzie žyćcio zastavałasia takim, jakim i było, a čałaviek žyū, dumaū i adčuvaū tak, jak žyli, dumali j adčuvali jahonyja prodki. Naviedniki najbolš uražvalisia z hetaha: možna žyć, možna być samim saboju, možna...

Jana šmat listavałasia, jaje knihazbory j archivy pryciahvali mnohich cikaūnych. Ale ūsio ž hałoūnaje było toje, što jana **była.**

I «lasnuju chatku» akalała nie abyjakavaja pryroda. Usie hetyja drevy, kusty, travy byli dahledžanyja jejnym kłopatam. Jana j sama nahadvała kareńčyk — tajamničy j žyvatvorny — kareńčyk z toj kolišniaj *Našaj Nivy*.

Škada, što jana nie paśpieła patrymać u rukach, pahartać adnoūlenuju *NN*... Pamiataju jaje horkaje pytańnie: «A ci jość ciaper biełaruski narod?» Ale nia pamiataju, jak my adkazali — i nia viedaju, jak by adkazaū ciapier.

I kali padčas vandrovak pa Biełarusi, pa jaje haradoch i miastečkach, dzie amal nie zastałosia kabiet i žančyn, a jość tolki «ženščyny», kali hladziš mienskaje telebačańnie, słuchaješ i bačyš hetych dyktaraū, kali stanovicca



*Zdymak Alesia Kryštapoviča.*

zusim nievynosna — tady varta tolki prypomnić mudraje abličča, cichi, trochi skrypučy hołas — i znachodzicca siła žyć dalej. Hetak ratuje toje, što zastałosia ciapier užo tolki ū dušy.

## *Рыскі трактат у новай рэдакцыі?*

18 кастрычніка ў Горадні БНФ, Грамада ды ТБМ склікалі сход інтэлігенцыі, каб абмеркаваць яе ролю й шляхі ўмацаваньня незалежнасьці новага на мапе Эўропы краю — Рэспублікі Беларусь. Быў цікавы рэфэрат, былі ня новыя, чутыя ўжо прамовы, былі нарэшце прынятыя тры звароты: да ВС (Беларусь — бязьядзерны абшар), да гарсавету — аб умацаваньні беларушчыны і падобны ж — да саміх гарадзенцаў.

Спынюся аднак на іншым. Прафэсар Клейн выступіў з уласнай эканамічнай праграмай. Перадусім ён сьцьвердзіў, што народ і большая частка інтэлігенцыі абыякавыя да БНФ, які, маўляў, аддае перавагу пытаньням мовы й культуры, чаго людзкім гушчам замала, бо іх абыходзіць палепшаньне побыту, жыцьця. Гэты тэзіс, дарэчы, пазьней быў абвергнуты іншымі прамоўцамі: апазыцыя мае добрыя эканамічныя праграмы.

Кволасьць нацыянальных пачуцьцяў ён зьвязаў зь недаацэнкай рэгіянальных патрыятычных пачуцьцяў. Заходняя Беларусь існуе па-ранейшаму. Калі яна была далучаная да БССР, а асабліва па вайне, зьявілася паняцьце,ператворанае ў адмоўную мянушку «заходнік». Усходнія выкрывалі яго наступна: індывідуаліст, «хозяйчик», не кампанейскі (ня любіць піць), скупы (беражлівы), любіць спажыву (працаваць), чапляецца за рэлігію.

У 1938 г. у Заходняй Беларусі ўраджаі збожжа былі вышэйшыя, чым у ЗША і амаль як у Францыі. У нас не было нагэтулькі гвалтоўнае калектывізацыі, якая разбурыла Ўсходнюю. Мы яшчэ маем гаспадара. Заходняя корміць усю Беларусь... Аднак Кебіч ня бачыць гэтага рэальнага падзелу. Трэба скасаваць вобласьці, стварыць два рэгіёны: Усходні й Заходні, і ўзалежніць першы ад другога, які мацнейшы... Можна было пачуць і некаторыя ня дужа карэктныя словы на адрас «усходнікаў».

У некаторых з наступных выступаў у цэлым прапанова ацэньвалася станоўча. Запярэчыў праф.Клейну дацэнт беларускае філялёгіі унівэрсытэту Янкоўскі. У Пінску выдаецца газэта, у якой прапагандуецца адарваньне ад Беларусі Палесься, на адным з ваўкавыскіх заводаў прыймаюць зварот, каб нам адыйсьці пад юрысдыкцыю Расеі, а тут прапануецца яшчэ падзяліць край надвая. Няможна разрываць маладую рэспубліку на часткі. Гэта была б выдатная магчымасьць, адзначалі прамоўцы, справакаваць апэтыты абодвух нашых суседзяў. Ваня пагатоў апошнім часам паказаў, што ён будзе ня супраць. Яшчэ Кастамараў заўважыў, што расейцы — нацыя цякомая. Жыць і працаваць на адным мейсцы, на радзіме, яны ня могуць, а ўвесь час распаўзаюцца па абшарах навокал. Што ж датычыць палякаў, дык апошнім часам крэсовыя настроі значна ўзмацнелі, і ня толькі на пабытовым узроўні. «Рэгіянальны» патрыятызм тут цалкам зможа ператварыцца ў крэсовы, г.зн., польскі.

Дарэчы дадаць, што аўтар канцэпцыі абнародаваў яе не ўпершыню. Яшчэ нядаўна яе ахвотна падтрымліваў першы сакратар абкаму Сямёнаў. Прафэсар Клейн зьяўляецца таксама чынным удзельнікам прапольскага руху на Гарадзеншчыне. Такія факты надаюць ягонай канцэпцыі пэўную афарбоўку.

Лепей усё ж пагадзіцца з старшынём Грамады прафэсарам Ткачовым, які падсумаваў абмеркаваньне эканамічнага пытаньня: патрэбная эканамічная спэцыялізацыя Ўсходняй ды Заходняй Беларусі, а не яе падзел.

**Homo S.**

## Зь Летувы й Польшчы

### *В.Чапайціс аб'яўлены агентам КГБ*

Папулярная тэма летувіскага друку ў канцы лістапада — публічнае выкрыцьцё агента КГБ «Ёзаса» — лідара Партыі незалежнасьці, буйнога летувіскага палітыка Віргіліюса Чапайціса. Скандал, як звычайна, пачала газэта *Respublika*, якая апублікавала даносы «Ёзаса», намякнула, што належаць яны неардынарнаму палітыку, і паставіла гэтаму палітыку ультыматум: каб за некалькі дзён адмовіўся ад дэпутацтва ў Найвышэйшай Радзе, а інакш — назаве... Праз колькі дзён Чапайціс ужо выступаў у парляманьце. Ён сказаў, што ня быў агентам КГБ, хоць «Ёзас» — гэта сапраўды ён. На думку Чапайціса, уся гэтая каша завараная з тым, каб разбурыць правае крыло Найвышэйшае Рады. Самае галоўнае, пра што ня пішуць, — ці ёсьць у даносах «Ёзаса» інфармацыя, якая магла б выклікаць нейкую рэальную шкоду...

А працяг гісторыі такі. Пасьля таго, як «левая» *Respublika* выкрыла «правага» Чапайціса, «правая» *Lietuvos Aidas* узялася за «левага» Алёйзаса Сакаласа. Два старыя палітвязьні на старонках гэтай газэты засьведчылі, што калі ў 1950 г. сядзелі ў ковенскай турме, Сакалас быў падсаджаны да іх як даношчык КГБ. Сёньня Сакалас — дэпутат, старшыня летувіскіх сацыял-дэмакратаў... Вядома, ўсе гэтыя «гульні» мала чаго даюць і незалежнасьці, і дабрабыту, і дэмакратыі. Як трапна заўважыў рэдактар яшчэ адной газэты — *Gimtasis Kraštas* — Альгімантас Чакуоліс: «Кожны тыдзень па Чапайцісу — і перазімуем».

### *Хаўрусуюцца Вітаўтасы*

У дзень каранацыі Вітаўта ў Коўне выйшаў 1 нумар выданьня *Vitautas*, у якім сябры клюбу, што носіць імя Вялікага князя, надрукавалі статут і плян дзейнасьці. Клюб уфундаваў стыпэндыі дзеля спрыяньня гістарычным досьледам, вывучэньню часоў Вітаўта.

### *Некаторыя перавагі незалежнасьці*

Англія згадзілася вярнуць Летуве золата, якое да вайны мела ў вангельскіх банках Летувіская дзяржава. Летува, Латвія й Эстонія прынятыя ў міжнародную арганізацыю сельскай гаспадаркі й харчаваньня, у якой прадстаўленыя 160 краінаў, а Савецкі Саюз пакуль толькі назіральнік. 24 дзяржавы Эўрапэйскае супольнасьці пастанавілі да канца наступнага году даць Латвіі, Летуве й Эстоніі эканамічную дапамогу ў памеры 15 млн экю (1 экю = $1,25), зь якіх Летува атрымае 6 млн...

### *Закон пра ўзнагароды Летувы*

З гэтага аб'ёмістага дакуманту, які тутэйшыя газэты друкавалі з працягам у трох нумарох, прывядзем толькі назвы галоўных дзяржаўных узнагародаў. Гэта ордэны: Вітаўтаса Вялікага, Крыжа Віціса (Пагоні), Вялікага Князя ЛітоўскагаГедымінаса. Медалі: «Дабрахвотнікаў-заснавальнікаў Летувіскае арміі», «Незалежнасьці Летувы», Зорка стралкоў ды іншыя.

### *Грошы для Палёніі*

Польскі ўрад разгледзеў справу дапамогі палякам, якія стала жывуць за межамі Польшчы, — паведаміла газэта *Sztandar Młodych*. — На ўтрыманьне нацыянальнае культуры землякоў у наступным годзе будзе выдаткавана 5 млрд злотых, у тым ліку 3 млрд для польскай дыяспары на Ўсходзе. Агенцтва ELTA называе іншыя лічбы фундацыі палякаў на Ўсходзе — 200 млрд злотых сёлета і яшчэ 100 млрд налета. Зразумела, што калі ня ўсе, дык большая частка гэтых грошай пойдзе на Гарадзеншчыну й Віленшчыну.

### *«Крэсы Всходне пад акупацыямі 1939-1945гг.»*

Конкурс на мэмуары такога зьместу абвясьцілі Ўсходні Архіў і Польская Акадэмія Навук. Трэба апісаць звычайны дзень пад акупацыяй (савецкай, нямецкай ці летувіскай), формы адпору, зьмены ў вадносінах уласнасьці, нішчэньне польскіх гаспадарчых, культурных, асьветных ці касьцельных установаў, асадніцтва з глыбіні СССР на Крэсы.

### *Курсы для палякаў Летувы*

адкрыліся ў Вольштынскай школе арганізацыі й кіраваньня. Яны арганізаваныя пры падтрымцы Фонду польскай культуры ў Летуве. 40 чалавек зь Віленскага краю 10 дзён навучаюцца асновам арганізацыі й тэхнікі зьнешняга гандлю, эканамічнаму й банкаўскаму аналізу, маркетынгу.

### *Пасьмяротная маска Пілсудзкага*

на аукцыёне ў Нацыянальным музэі ў Варшаве была прададзеная за 100 мільёнаў злотых.

# Алесь Чобат

Чатыры вершы

*1.*

*Заўсёды так. Спачатку звычка вечная,*
*за ёй прасьвет ды ісьціна бясспрэчная,*
*за ёй імёны ўсіх сьвятых яе.*

*І хлапчукі з надзеямі зялёнымі*
*ідуць сьляпой калёнай за імёнамі,*
*а не за ісьцінай — бо што яна дае.*

*А потым між сьвятымі цесна станецца,*
*адзін стаўчэ другога — і прагляне́цца*
*другая ісьціна і трошкі іншы лад.*

*А хлапчукі, увагі не зьвяртаючы*
*на гэткі дробязг, йдуць не разважаючы —*
*назад, набок, наперад і назад.*

*2.*

*Змаганьне. Крыкі. Сваркі. Парахункі.*
*Прамовы. Прафэсура. Сапляკі.*
*Сустрэчы. Крыўды. Плёткі. Пачастункі.*
*Суседзі. Цёткі. Дзядзькі. Сваякі.*

*Сябры. Прыблуды. Здані. Утрыманцы.*
*Спакой. Трывога. Плынь і глыбіня.*
*Дарога. Поле. Баба на фурманцы.*
*Зіма. Адліга. Вобраз. Чысьціня.*

*Прыдуркі. Чэргі. Клопаты. Згрызоты.*
*Падзел. Вымена. Лекі. Мітусьня.*
*Сустрэчы. Выпіванкі. Анэкдоты.*
*Айчына. Памяць. Праўда і хлусьня.*

*3.*

*Калі пачнецца нешта ў гэтым брудзе,*
*загіне край і нас даўно ня будзе —*
*і гэта лепш, чым да канца дажыць.*

*Нам не даруюць судзьдзі маладыя,*
*нас не дапусьцяць новыя сьвятыя*
*раней за іх з Айчынай разам быць.*

*Як быццам тут не на касьцях забытых,*
*зноў загарлаюць зграі новых сытых —*
*пра Бацькаўшчыну, веру і народ!*

*Хто той мастак з бародкай вечнамоднай?!*
*Што плача ён па Беларусі роднай?*
*Нашто ён трушчыць той крывавы лёд...*

*4.*

*Паэты разьвіталіся са славаю,*
*а з болем галавы ды з чорнай каваю*
*жыцьцё іх разьвітае назаўжды.*

*Таварышы пайшлі зь вялікай партыі,*
*і толькі дзядзькі з прынцыпамі ўпартымі,*
*як з багны, лезуць з крыку і нуды.*

*Вакол так сумна. Нават глупства соннае.*
*Адзін народ працуе і выконвае,*
*то церпіць, то буяніць — як калі.*

*Таму для ўсіх паэтаў і пісьменьнікаў*
*прасьвет адзін — падацца да Друскенікаў,*
*пакуль чагосьці вартыя рублі.*

## *Што пішуць?*

### Пра «зараз» і «цяпер»

*Ян Замкоўскі з-пад Вільні:*

Гэтыя словы ведаюць усе. Але ж ці ўмеюць іх правільна ўжываць? Вельмі часта кажуць: «зараз гэтае мейсца завецца йначай»; «зараз мы робім на будоўлі»; «вы стаіцё зараз на мяжы вялікіх бедаў і катастрофаў»; «зараз палова дзесятае гадзіны». Ва ўсіх гэтых прыкладах зроблена памылка — замест слова «цяпер» ужытае «зараз». Мусі, каб правільна ўжываць нейкіх словаў, трэба, перад усім, добра ведаць іхняе значэньне. Слова «зараз» мае некалькі значэньняў: 1. паказуе, што нешта мае адбыцца неўзабаве, хутка, у кароткім часе (зара прыйду, зараз зробім, зараз пачнецца дождж); 2. паказуе, што нешта адбылося, трэба каб адбылося, альбо адбудзецца пасьля чагосьці (я захварэў зараз пасьля сьвята; як скончыш працу, дык зараз вяртайся дадому; яны прыедуць зараз пасьля Новага году). Як бачым, слова «зараз» у цяперашнім часе не ўжываецца і сэнсу «цяпер» ня мае. З гэтага вынікае, што словы «цяпер» і «зараз» ні ў якім разе ня ёсьць сынонімы, і іх няможна ўжываць адно замест аднога. Інакш зьменіцца сэнс сказу альбо атрымаецца нейкая нісянеціца. Вось прыклад: «Цяпер шостая гадзіна». Усім зразумела, што цяпер ёсьць шостая гадзіна, менавіта ў той момант, калі тое кажацца. Сказ «Зараз шостая гадзіна», якім часта паслугуюцца дыктары беларускага радыё, значыць што іншага. Ён значыць, што шостае гадзіны яшчэ няма, але неўзабаве, за хвілінку, у хуткім часе будзе. Такім чынам, сказ «Зараз шостая гадзіна» значыць, што зара будзе шостая гадзіна, але ні ў якім разе ні што цяпер ёсьць шостая гадзіна. Другі прыклад: «Зараз сьвятыня стаіць зруйнаваная». Калі было б сказана: «Сьвятыня зара будзе зруйнаваная» (крый нас Божа ад гэтага), то ўсё было б зразумела: яшчэ не зруйнаваная, але зара будзе. Калі было б сказана: «Бальшавікі як зайшлі, дык зараз сьвятыню зруйнавалі», то таксама было б зразумела. Але што значыць «зараз стаіць зруйнаваная» зразумець цяжка. Хутка стаіць зруйнаваная? Ці, можа, неўзабаве стаіць зруйнаваная? Абы што. Відавочне, што трэба выправіць памылку й казаць: «Цяпер сьвятыня стаіць зруйнаваная». А каб хутчэй засвоіць гэтае правіла, ды пазбавіцца ад звычкі замест «цяпер» ужываць «зараз», трэба паўсюль і заўсёды ўжываць «цяпер». Там, дзе спатрэбіцца ўжыць «зараз», слова «цяпер» не прамовіцца аніяк.

### Пра Алеся

*Мікола Нікалаеў (СПб):*

Чаму так упарта дамагаюцца некаторыя, каб Вільню ўвесь сьвет называў Вільнюс, Гедыміна — Гядымінас, а Замкавы завулак у нашых Паўночных Афінах — ня йначай як завулкам Пілес? — думаў Алесь, едучы ў ваўтобусе з Наваградка ў Вільню. Потым ён пачаў думаць пра кнігу, якая напісаная на дзьвюх мовах, але каштуе ўсяго 60 капеек — кніга называецца «Инструкция по транскрипции фамилий, имен и географических названий с русского языка на литовский язык и с литовского языка на русский язык». Уражлівая кніга: слова «язык» на тытуле напісанае ажно чатыры разы!.. Урэшце, хто вельмі вучоны, хай сабе й ведае, што ні адна з жонак Альгерда не называла яго Альгірдас, а найвышэйшы канцлер Вялікага княства Літоўскага не падпісваўся Мікалоюс Юрго Радвіла, а віленскія месьцічы руплівa брукавалі не Діджëі, а Вялікую вуліцу... Інструкцыя бо не для вучоных пацукоў, а для людзей простых, — падумаў Алесь. І прыгадаў выслоўе аднаго пісьменьніка: «Нечаканае багацьце — разбэшчвае, атрыманае ў спадчыну — выхоўвае»... Калі аўтобус заяжджаў у Вільню, Алесь думаў пра добрае: ён успамінаў нямоглага фізычна, але больш за маладых энтузіястычнага акадэміка Юргініса, які даводзіў: «літоўцы» й «літвіны» — назва грамадзянства, а не народа!..

### Пра сябе

*Віктар А. (Талачын):*

Я лічу, што Лёс быў літасьцівы да мяне, бо я ўбачыў сьвет у прыгожым краі, дзе жывуць цудоўныя людзі. Тут жыву я і цяпер, у тым доме, дзе нарадзіўся — а гэта вялікае і рэдкае шчасьце. І мой лёс афарбаваны першымі дзіцячымі ўражаньнямі ад прыгожай да болю прыроды роднай Талачыншчыны, і заўжды стаяць перад вачыма буйныя кветкі пад сьпякотным сонцам пасьлянавальнічнай мройнасьці і сьнежнае харaство казачных зім «пяцідзясятых». І часам мне здаецца, што я здолеў зьберагчы да сёньняшніх сваіх «сарака» дзіцячую даверлівасьць позірку і сваё дзіцячае сэрца, насьцеж расчыненае для прыгажосьці, праўды, дабрыні, усё жыцьцё прагнучае Сапраўднага — у жыцьці, мастацтве, літаратуры. І ўсё лепшае з накопленага ў душы хочацца вярнуць людзям, таму я пішу вершы з апошняга класа сярэдняй школы — часу першага каханьня, першай надзеі і роспачы. Затым былі праца і вучоба ў любым да цемры ў вачах Менску — горадзе майго юнацтва, зноў праца на Талачыншчыне. І хочацца аддаць душу ўсяму — дарагім людзям, працы, творчасьці, і хораша на сэрцы, калі гэта атрымліваецца.



Здымак Анатоля Клешчука

# Сяргей Астраўцоў

Мэлянхалічныя лісты

**1.**

Напачатку верасьня над адной установай зьявіўся раптам беларускі бел-чырвона-белы сьцяг. Побач на райвыканкаме матляўся афіцыйны сьцяжок. Беларускі не чапалі з тыдзень. І зьняты ён быў тымі ж рукамі, якімі вывешаны. Завадатар не стрываў сьлёзных умольваньняў свайго начальніка...

Адначасова беларускі сьцяг парушыў соннае жыцьцё Шчучына. Быў зьняты загадам начальніка мяйсцовае міліцыі, як «незарэгістраваны».

А ў мястэчку з моцнымі прапольскімі настроямі — Луньне — на пажарнай вышцы сьцяг убачылі сёлета яшчэ на ўгодкі БНР. Правісеў з гадзіну. Дзядзькі лезьці адмовіліся, а штрэйкбрэхера, які гэта выканаў, потым пагардліва лаялі. Зараз на Луньнецкім сельсавеце б.ч.б.

Апавядаў адзін знаёмец пра калгаснае сьвята песьні. 1974 год. Валожынскі раён. Сярод гледачоў стаіць дзядзька ды ўзіраецца зь непаразуменьнем на сьцяг, што над сельсаветам. Пытаецца ў суседа: «А чый гэта сьцяг?» «Як чый? Беларускі». «Не-э, — зь недаверам, — наш бел-чырвона-белы...»

Шкада, што мала было ў нас гэткіх дзядзькоў, але дзіва таксама, што яны наогул былі.

**2.**

У палове месяца БНФ сабраў мітынг. Люду, як на Горадню, скупілася прылікова: 500-600 чалавек, можа крыху болей або меней. Пераважна, зразумела, мужыкі. Карцела выгаварыцца. Прамаўлялі трошкі лепш за ранейшае, але часам зноў шматслоўна, нудна й блытана.

Па-над мітынгоўшчыкамі ўздымаўся вялікі Ленін. Да масыўнага пастамэнту прытуліліся сьцяжнікі з б.ч.б. Ззаду на будынку ўчорашняга гаркаму дрэвамі затуліўся прыгожы шрыфтавы вітраж з луду: «КПСС». Адзін час даўней надпіс у цемры нэонава сьвяціўся.

Непадалёк заўважыў жыдка. Пляскаў у далоні. Год назад на вайсковым зборы ён у курылцы з мытнікам на пару ганіў БНФ. Часы зьмяняюцца...

Была адна прамова па-польску.

Пры канцы вылезла нейкая кабета з клункамі. Паскардзілася на жаночы лёс, на чэргі. Потым раптам кажа: прачытала, маўляў, у газэце пра балтыйска-чарнаморскі саюз, ды давай лемантаваць, што ня хоча жыць у вадной дзяржаве з гэтымі літоўцамі й латышамі!

Да яе з кулакамі кінуўся натоўп разьятраных мужыкоў.

**3.**

За плячыма Леніна апроч будынку гаркаму — спалучаны зь ім будынак колішняга ленінскага райкаму. Райкамы ў горадзе не йснуюць больш за год. Але на буфэтным мэню, якое мяняецца штодня, нязьменна надрукавана: «Буфэт райкаму партыі». Ядальня гэтая знаходзіцца ў паўпадвале. Тым самым камуністычная ідэя працягвае жыць у падпольлі.

**4.**

Каля паўночы брыгада са старой пажарні на Замкавай вул. выехала гасіць пажар. Калі вярнуліся, убачылі на сьцяне сьвежы надпіс, зроблены з балёніка: «Polsko, wróć!»

Наступная зьмена змываць напісанае адмовілася. Маўляў, хто праваронiў, той хай сам гэта робіць. Надпіс прайснаваў з тыдзень. За справу давялося брацца намесьніку начальніка пажарнае часткі.

Цікава, што, паводле ягоных словаў, мяйсцовыя грамацеі ня здолелі б гэтак слушна праставіць дыякрытычныя знакі й захаваць у першым слове форму звароту.

Выснова: парупіліся госьці-гандляры. Яны штодня, прадаўшы на рынку транты, балююць у паблізкім рэстаране «Зубр», а пасьля закрыцьця — паўз пажарню пхнуцца са сьпевамі ды шампанскім на Нёманскі бераг дагульваць. Славэтны «экспарт рэвалюцыі»?..

У Беластоку бачыў таксама балёнікавы надпіс на муры: «Жыве Беларусь!» А побач: «Po co takie życie?» Талеранцыя.

У каталіцкую вёску на Мастоўшчыне прыехаў сваяк з РП. Моцна падпіўшы, пачаў уголас марыць пра Польшчу «od morza do morza». Гаспадар, ляснуўшы па стальніцы кулаком, мовіў да таго: «Я табе, тваю маць, пакажу Польску!» Неталеранцыя?..

**5.**

У панядзелак даведаўся, што па-над гарвыканкамам узьвіўся Дзяржаўны б.ч.б. сьцяг. Нешта перашкодзіла схадзіць паглядзець. Назаўтра ішоў дождж. Толькі трэйцяга дня я стаяў на Савецкай вуліцы пад дрэвам і, начапіўшы акуляры, узіраўся ў наш сьцяг. Потым спыніўся каля ленінскага райвыканкаму, ізноў узіраўся. Уразіла, што болей ніхто з процьмы мінакоў не ўзьняў галавы. Абыякавасьць? Нармальнасьць? Або папросту людзі нашыя — ні да рады, ні да звады.

Сусед не дайшоў да кватэры. Ляжаў на прыступках у пад'езьдзе. П'яна хрыпеў: «Рускія — сволачы! Вой, паміраю...» Мяйсцовы сэпаратызм?

**6.**

Кажуць, у горадзе на здымцы кінафільма памёр актор, які выконваў ролю Мікіты Сяргеевіча. І выканаўца, і сам герой былі самыя жыцьцярадасныя ў кінатройцы: Сталін — Хрушчоў — Брэжнеў. Не зважаючы, што ўсьмешка падаўжае жыцьцё, сугнеі часам трываюць долей. Сэ ля ві.

**7.**

Быў на сходзе ў школе, дзе ўзбунтаваліся бацькі. Не жадаюць беларускага навучаньня для сваіх першаклясьнікаў. Прадстаўнік гарвыкан-

# Уладзімер Арлоў

## Сьцягі над горадам

***Гераічны абразок часоў незалежнасьці***

•

ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ:

паэт і бард Сяржук Сокалаў-Воюш;

старшыня Полацкае рады БНФ Анатоль Кулік, асуджаны за бел-чырвона-белы сьцяг у гады перабудовы;

сябра паэта і барда дый усіх астатніх Базыль Храмцоў, асуджаны за тое самае ў тыя самыя гады;

карэспандэнтка абласной газэты «Народнае слова» Ларыса Малашэня;

аўтар гераічнага абразка;

намесьнік старшыні гарсавету тав. Камароў;

вахцёрка, міліцыянты, людзі ў цывільным.

•

*Дзея адбываецца перад будынкам Полацкага гарсавету, у ягоных нетрах, а таксама на гарышчы й на даху.*

*Субота, трэйці дзень, як сэсія Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь зацьвердзіла новы Дзяржаўны сьцяг.*

*Над гарсаветам ціхамірна лунае чырвона-зялёны, сярпаста-малаткасты, бальшавіцка-мусульманскі «флаг» БССР.*

*У выпадку сцэнічнага ўвасабленьня твору можа гучаць Дзяржаўны гімн БССР або папулярная народная песенька: «Зьлева молат, справа серп, Гэта наш савецкі герб. Хочаш жні, а хочаш куй...» і г.д.*

### 1-я дзея

*Пяцёра першых дзейных асобаў зь бел-чырвона-белым сьцягам шпарка падымаюцца па сходах і заходзяць у кабінэт намесьніка старшыні гарсавету тав. Камарова, які ў выхадны дзень дбае пра палачанаў на сваім працоўным мейсцы.*

**СТАРШЫНЯ РАДЫ БНФ** Спадар Камароў...
**НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ** *(зацкавана азіраецца, магчыма, думае, што яго прыйшлі забіраць)* Что такое?
**ПАЭТ І БАРД** Чаму гарсавет не выконвае пастанову Вярхоўнага Савету пра Дзяржаўны сьцяг?
**НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ** *(відавочна супакойваючыся)* Какой пастановы? Никакой команды не было, вот и не выконваем *(перакрыўляе)*. Будет команда — будем выконваць.
**ПАЭТ І БАРД** Сярод нас двое асуджаных за гэты сьцяг.
**НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ** Я ничего не знаю. Не мешайте мне работать *(робіць выгляд, нібыта нешта піша, а ў сапраўднасьці колькі разоў абводзіць на сваёй паперыне загадкавае слова «повысить»)*.
**СТАРШЫНЯ РАДЫ БНФ** У вас свая праца, у нас — свая.
**НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ** *(у позірку, далікатна кажучы, нялюбасьць да візытантаў, а разам зь ёю — нямоглая злосьць: такога ў жыцьці тав. Камарова яшчэ не было)* Кто вы такие?
**ПАЭТ І БАРД** Я — сябра сойму БНФ Сокалаў-Воюш.
**НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ** *(махае рукамі)* Кто вас не знает!
**СТАРШЫНЯ РАДЫ БНФ** *(сувора)* Спадар Камароў, нам трэба ключ ад выхаду на дах.
**НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ** *(падазрона пазіраючы на карэспандэнтку)* Чем вы там будете заниматься?
**СЯБРА ПАЭТА І БАРДА** Уздымаць Дзяржаўны сьцяг.
**НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ** Будет команда, тогда и вздымем.
**АЎТАР** *(залішне пафасна)* Спадар Камароў, мы ведаем, што вы гэты сьцяг ненавідзіце, але праз 10 хвілінаў ён будзе вісець над вашым кабінэтам.
**НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ** Кто вы такой?

*Аўтар прадстаўляецца.*

**НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ** Вы вообще не полочанин и не имеете права здесь находиться.
**АЎТАР** А вы мяне дэпартуйце.
**НАМЕСЬНІК СТАРШЫНІ ГАРСАВЕТУ** Вы — хуліганы!
**СЯБРА ПАЭТА І БАРДА** *(з адценьнем зларадасьці)* А вы не выконваеце пастановы Вяхоўнага Савету.

*Пяцёра візытантаў выходзяць. Тав. Камароў ліхаманкава хапаецца за тэлефон.*

### 2-я дзея

*Загаджанае галубамі гарышча. Кавалак нейкага транспаранту са словамі «Дадим больше...»*

*Старшыня рады БНФ разам з паэтам і бардам вылазяць праз вакенца на дах. Паэтаў сябра і аўтар сядзяць на гарышчы. Карэспандэнтка застаецца ўнізе перад будынкам.*

*Бальшавіцкі сьцяг паўзе долу. Карэспандэнтка занатоўвае гістарычную падзею ў нататнік. Пад'яжджае варанок з нарадам міліцыянтаў, якія кідаюцца да карэспандэнткі.*

**ПЕРШЫ МІЛІЦЫЯНТ** Где здесь поднимают фашистское знамя?
**КАРЭСПАНДЭНТКА** *(з усьмешкай)* Гэта не фашысцкае «знамя», а наш Дзяржаўны сьцяг. Яго прыняла сэсія Вярхоўнага Савету...
**ПЕРШЫ МІЛІЦЫЯНТ** *(яўна паўтараючы нечыя словы)* Как приняла, так и отнимет.

*З партатыўнае рацыі на плячы ў старшыны чуецца: «Доложите обстановку!»*

**ПЕРШЫ МІЛІЦЫЯНТ** *(паглядзеўшы ўгару, усьцешана)* Докладываю: их всего двое.

*Пад'яжджае яшчэ адна міліцэйская машына і машына зь людзьмі ў цывільным. Усе глядзяць угару. Над будынкам на асноведзі навальнічнага неба падымаецца бел-чырвона-белы сьцяг.*

### 3-я дзея

*З ганку бадзёра сыходзяць чацьвёра тых, што былі на гарышчы й на даху. Паэт і бард ідзе, паклаўшы рукі на патыліцу, у запазусе ў яго — зьняты сярпаста-малаткасты «флаг» БССР.*

**СТАРШЫНЯ РАДЫ БНФ** *(да першага міліцыянта)* Віншую з узьняцьцем Дзяржаўнага сьцягу.
**ПЕРШЫ МІЛІЦЫЯНТ** *(не пасьпявае, як астатнія, схаваць рукі за сьпіну і зьбянтэжана прымае поціск)* Там посмотрим... *(перахопліваe ўважлівы позірк падпалкоўніка й зусім ніякавее)*.
**СЯБРА ПАЭТА І БАРДА** Віншуем вас, таварыш падпалкоўнік.
**ПАДПАЛКОЎНІК** *(зь велізарным задавальненьнем загнаў бы нацыяналістаў, як зусім нядаўна, у варанок, але цяпер ня ведае, што рабіць, і, мабыць, моўчкі кляне сэсію й дэпутатаў)*. Отойдите, у нас служебный разговор.
**КАРЭСПАНДЭНТКА** *(да першага міліцыянта)* Калі ласка, вашае прозьвішча для гісторыі.
**ПЕРШЫ МІЛІЦЫЯНТ** Пожалуйста: старшина Кащеев.

*Нацыяналісты вясёла й шматзначна пераглядаюцца.*

**КАРЭСПАНДЭНТКА** Кашчэеў...
**ПЕРШЫ МІЛІЦЫЯНТ** *(зазіраючы ёй цераз плячо)* Кащеев — через «о».
**КАРЭСПАНДЭНТКА** Я па-беларуску пішу.
**ПЕРШЫ МІЛІЦЫЯНТ** А вы поправьте, чтобы правильно было.

*«Доложите обстановку!» — зноў хрыпіць у яго на плячы рацыя.*

**ПЕРШЫ МІЛІЦЫЯНТ** Докладываю: обстановка в целом дружелюбная.

*Адчыняюцца дзьверы гарсавету. Углыбіні відзён тав. Камароў. Яўна па ягонай каманьдзе да ўдзельнікаў урачыстага ўзьняцьця сьцягу подбегам кіруецца бабуля-вахцёрка.*

**ВАХЦЁРКА** *(запыхана)* Где наша знамя?
**ПАЭТ І БАРД** А вось *(выцягвае з запазухі сярпаста-малаткасты «флаг»)*.
**ВАХЦЁРКА** Отдавайте имущество *(учэпіста хапае «флаг», гэтаксама подбегам вяртаецца ў будынак гарсавету і зачыняе зь сярэдзіны дзьверы на засаўку)*.

*Удзельнікі ўзыходжаньня на дах прапануюць падпалкоўніку скласьці пратакол. Таму гэтая ідэя відавочна падабаецца, але абсурднасьць сітуацыі разумее нават ён.*

**ПАДПАЛКОЎНІК** Отойдите, у нас служебный разговор.
**ПАЭТ І БАРД** *(падступна)* Таварыш падпалкоўнік, а які ў вас сьцяг над аддзелам?
**ПАДПАЛКОЎНІК** *(зьнячэўлена)* Пока никакого.
**ПАЭТ І БАРД** Зараз мы вам дамо новы, у нас яшчэ ёсьць.
**ПАДПАЛКОЎНІК** *(не чакаючы небясьпечнага падарунка, хутка сядае ў машыну)* В отдел!

*Усьлед за падпалкоўнікам ад'яжджае машына з маўклівымі людзьмі ў цывільным, потым — дзяжурны варанок. Па пустым пляцы перад будынкам застаюцца пяцёра тых, з каго пачыналася дзеяньне. Адчуваецца, што ўсіх мучае смага.*

*У выпадку сцэнічнага ўвасабленьня можа гучаць гімн Макара Краўцова: Мы выйдзем шчыльнымі радамі...*

*Над гарсаветам лунае бел-чырвона-белы сьцяг.*

*Усё.*



---

каму рабіў экскурсы ў гісторыю, спасылаўся на прыклад нарвэгаў, якіх прымусам адвучылі ад швэдзкай — акупацыйнай — мовы й якія жывуць ня горш за беларусаў... Слухаць яго ня дужа хацелі. Тады яму давялося скончыць: школа будзе беларуская паводле Закону, не падабаецца — зьвяртайцеся ў суд...

Як я заўважыў, часьцей гавораць тыя, каму сказаць няма чаго. Найбольш лемантаваў нейкі рабацяга. «Ды вы самі мовы ня ведаеце. Паспрабуйце, як Пазьняк, чыста гаварыць!.. А хто з вас (з начальства) ведае, як будзе па-беларуску: Раўняйсь! Сьмірна!?» Ён штораз пры гэтым нагадваў: «Я паляк, але я не хачу польскай школы, я патрабую рускай!»

Непадалёку для дзяцей вайскоўцаў зрабілі ажно дзьве расейскія школы. Наш паляк, вычарпаўшы ўсе аргуманты, выгуквае апошні: «Там палкоўнікі, маёры. Цывілізацыя! А як ты рабацяга, дык вядзі дзіця ў беларускую!..»

Напісаў я пра гэта справаздачу ў газэту, назваўшы «Чым мы горшыя за палкоўнікаў?» Здарыўся казус. Калі надыйшоў час падпісваць газэту да друку, заўпарціўся... цэнзар.

Цэнзура, як вядома, у нас больш за год як «скасаваная». Таму цэнзар вычытвае газэтныя нумары, адно не прыціскае сваёй пячаткай, як раней. Такім чынам, цэнзар загадаў замяніць загаловак. Інакш, маўляў, у якім-небудзь цэрэу давядаюцца, што ў нас ёсьць палкоўнікі. Згадзіліся на кампраміс. У тэксьце перад словам «палкоўнікі» ўдрукавалі «адстаўныя». Страна чудзес.

Мне нічога не было вядома.

Цяпер мне не дае жыцьця адзін адстаўны палкоўнік, піша, тэлефануе, патрабуе. Паспрабуй такому давесьці, што ты не вярблюд. Таварыш палкоўнік! Я пераканаяы, што вы з жонкай даўно не сваволіце й ня робіце супольна першаклясьнікаў, таму меў на ўвазе зусім ня вас. Дальбог!

8.

Адная кабета езьдзіла ў Смаленск да апанэнта свае дысэртацыі. Смаленчукі нецярпліва чакаюць, калі іх далучаць да Беларусі. Хоць пад'есьці можна будзе, кажуць... Ня толькі, аказваецца, на Курылах сэпаратысцкія настроі.

9.

Знаёмы мастак, абураны тым, што гаёк побач зь ягоным лецішчам ператварылі ў сьметнік, пастаўляў тамака шыльдачкі: «Памятай! Лес — ня сьметнік». І падпісаў: «БНФ». Кажа, што цяпер нібы сьмецьця ня кідаюць.

10.

Ехаў цягніком. Побач адбывалася размова на тэму «Ці падслухоўваюць? Падслухоўвалі й падслухоўваюць!» Часам усё было падобнае да показкі. «Таварыш маёр (у радыёдынамік або кратку вэнтыляцыі)! Прынясіця, калі ласка, нам па кубачку кавы (гарбаты, па сто грамаў і г.д.)». Аднак адзін аповяд запомніўся.

Некалі ў віленскім рэстаране «Нерынга», дзе паўнютка бывала замежнікаў, служыў адзін чалавек. У ягоных абавязках было сядзець у залі, піць каву, моцныя напоі, закусваць, ну, і зразумела, мець вушы тырчма. Штодня яму з казны выдзяляўся на гэтыя мэты чырвонец. Немалыя грошы, як на той час, а калі яшчэ й сваіх дадаць... Жыцьцё — што таму сыру ў масьле.

Той чалавек неўзабаве сьпіўся.

11.

У палове 70-х служыў у сталіцы ў войску адзін мой сябрук. Днямі ўспамінаў, як іх прыгналі ў суворaўскую вучэльню, каб зрабілі ў муры браму. Далі ў рукі мэталёвы кій. Ён дзёўб падмурак і ўбачыў цагліну з кляймом «Менск». Паказаў камандзеру. Той у непаразуменьні зьвярнуўся да нампаліта. Нампаліт кіем, цаляючы ў літару «е», сам асабіста раструшчыў цагліну з надпісам, як ідэалягічна небясьпечную.

12.

Езьдзілі ў Вільню на пахаваньне Зоські Верас.

Шафёр вясковага аўтобусіка, які нас вез, прызнаўся, што ўпершыню за мяжой. Але на віленскіх вулках кіраваў зухава.

Хтосьці побач сказаў, што яна ляжыць у труне на баку, нібыта заснула.

Пасьля пахаваньня мы скіраваліся на гарэлішча ў лесе, дзе была хатка пісьменьніцы. Смутнае відовішча. Нібы ніхто пасьля пажару тут і ня быў. Друз кафлянае грубкі. Збуцьвелыя нямецкія кніжкі. Мы выбралі кафляў, адшукалі дзьве патэльні, серп. Для Гудзевіцкага музэю.

Знайшлі студню з дажджавою вадой.

Выпілі гарэлкі. Захмялеўшы, нехта прапанаваў: давайце закапаем парожнія бутэлькі, а праз год прыедзем і адкапаем... Ёсьць яшчэ дзівакі. Але вярнуцца сапраўды пагадзіліся. Каб прымацаваць памяткавую шыльду.

На дарогах у Летуве расейскія надпісы замаляваныя. На беларуска-летувіскай мяжы мэталёвыя літары «Литовская ССР» даўно сьпілавалі самі летувісы, а новага надпісу дагэтуль няма. Беларусам, зразумела, усё адно. Дзякуй, вядома, за своечасовую праўку тэксту — са свайго боку летувісы зрэзалі на шыльдзе «Белорусская ССР» дзьве вялікія «С». А можа, пакуль адныя адных чакаць будуць, дык і надпісы не спатрэбяцца?..

13.

Днямі завітаў сябрук, літаратар Л. Больш за год, як зьехаў ён да сталіцы, жадаючы аднаго — пісаць. А вымучыў тамака дагэтуль адно-адзінае апавяданьнейка. Відавочна, што ў сталіцы натхненьне не разьлітае па асфальце.

А калісьці мы зь ім езьдзілі да яго дадому, на рачны млын, пілі собскае, з чорнага мяйсцовага вінаграду, віно, закусвалі духмянай шынкай... Нічога гэтага ў Менску, вядома, няма.

м.Горадня,
верасень-кастрычнік.



Здымак Алены Адамчык

## Прачысьценскі сабор

Лявон Луцкевіч

**У трох папярэдніх нумарох *Нашае Нівы* мы распавялі пра Пятніцкую царкву, пра Віленскую вуліцу і пра касьцёл сьв. Мікалая. А сёньня гутарка пойдзе пра адзін з найстарэйшых праваслаўных храмаў Вільні — сабор Прачыстай Божай Маці, званы карацей — Прачысьценскі сабор.**

Знаходзіцца ён па-над рэчкаю Вялейкай, каля маста, які вядзе ў раён горада — Зарэчча (цяпер Ужупіс). Паблізу месьціцца адразу некалькі каштоўных помнікаў архітэктуры. Тут і славуты касьцёл сьв. Ганны, і касьцёл сьв. Міхала, збудаваны намаганьнямі й коштам Льва Сапегі. Тут жа цягнецца ўздоўж вуліцы і палац самога Сапегі. Насупраць палацу — сучасны помнік А.Міцкевіча. Нарэшце, ва ўсёй сваёй велічыні паўстае перад намі Прачысьценскі сабор.

Паводле летапісаў, на мейсцы, дзе цяпер сабор, яшчэ ў палове XIV ст. другая жонка Вялікага князя Альгерда, цьвярская князёўна Юліяна, заклала царкву, мабыць, драўляную, бо пад той час мураваных будынкаў у Вільні, бадай, яшчэ не было. Летапісы кажуць, што ў гэтай царкве быў пахаваны сам князь Альгерд.


За часоў Вялікага Вітаўта тут ужо стаў галоўны праваслаўны храм Княства. Праваслаўная царква Літвы атрымала тады статус незалежнай мэтраполіі, падпарадкаванай непасрэдна Візантыі, што было зацьверджана на саборы ў Навагрудку ў 1414 г. Першым мітрапалітам стаў Рыгор Цамбляк, а царква з таго часу пачала называцца мэтрапалітальнай. Вітаўт багата яе абсталяваў і збудаваў палац для мітрапалітаў.

Ёсьць зьвесткі, што ў гэтай царкве пахаваныя многія выдатныя асобы: той жа мітрапаліт Цамбляк; каралева польская й вялікая княгіня літоўская Алёна — жонка Аляксандра й дачка Івана III, вялікага князя маскоўскага; у 1517 годзе — мітрапаліт Язэп Салтан, у 1564 — Пётар Шуйскі, забіты ў вайне пад Вільняю, ды шмат іншых дзяржаўных і рэлігійных дзеячоў.

Пажары не аднойчы нішчылі гэты храм. У 1514 годзе гэтман Вялікага Княства Літоўскага Канстантын Астрожскі ў памяць пра сваю слаўную перамогу над маскалямі пад Воршай цалкам яго адбудаваў і абсталяваў. А ў пачатку XVII ст. храм быў перададзены ўніятам. У палове XVIII ст. ён ізноў значна пацярпеў ад пажару, затым быў моцна разбураны падчас захопу Вільні расейскім войскам у канцы таго ж стагодзьдзя.

Доўгі час будынак зусім не выкарыстоўваўся для багаслужбаў. Тут была анатамічная лябараторыя ўнівэрсытэту, пасьля закрыцьця якога — вайсковыя казармы, затым склады, нейкія рамесьніцкія майстроўні. Урэшце толькі ў 1868 годзе будынак быў адрамантаваны, адноўлены як царква, вакол зроблена ўпарадкаваньне тэрыторыі, берага Вялейкі, пракладзеная новая вуліца, якая мела назву сьв. Ганны, а цяпер называецца — Майроніса. Калі вялі вуліцу, зьнесьлі нават некалькі будынкаў, у тым ліку званіцу Бэрнардынскага касьцёла.

А ўжо адносна нядаўна — у міжваенны час — у Прачысьценскім саборы рэгентам быў Рыгор Шырма. Дарэчы, жыў ён насупраць сабора, у царкоўным доме. Беларускае грамадзтва Вільні зьвярнулася да гарадзкіх уладаў аб дазвол устанавіць на гэтым доме мэмарыяльную табліцу да 100-годзьдзя Шырмы ў студзені 1992 году.



*Тры вакны на першым паверсе — кватэра, у якой жыў Рыгор Шырма.*



*Прачысьценскі сабор да рэстаўрацыі.*

# 1992. Карціна году ў рэтраспэктыве

*(Працяг са старонкі 5)*

альманаху «Рубон», які выдаваўся ў Вільні, але прысьвечаны быў Падзьвіньню, бо Рубон — гэта старажытная назва Дзьвіны (як, дарэчы, Кранон — Нёмна, а Барысфэн — Дняпра)... Браты Тышкевічы яшчэ толькі адкрываюць у Лагойску свой музэй старажытнасьцяў, які стане апірышчам беларускае навукі.

Год як год. А што, скажыце, асацыюецца ў вас з 1817-м годам?

### *175 гадоў назад*

**Філяматы й філярэты.** Пачатак іх дзейнасьці ў Віленскім унівэрсытэце. А яшчэ што? Памёр **Тадэвуш Касьцюшка.** У Швайцарыі. Па тастаманту пакінуў волю сваім чорным рабам у Вамэрыцы й сваім беларускім сялянам.

Тамаш Зан напісаў камэдыю «Грэцкія піражкі», дзеяньне якой адбываецца ў Менску. У Полацку выйшаў зборнік Міхала Крыцкага «Песьні». Нарадзіліся **Ігнат Храпавіцкі** *(31 ліпеня)* і **Антон Глінскі**. Першы — адзін з аўтараў згаданага «Рубону», у 1850 годзе распрацаваў праект скасаваньня прыгону й правёў яго на Віцебскім губэрнскім дваранскім зьезьдзе. Цікавая асоба. Другі — пісьменьнік, апрацоўшчык беларускіх народных казак, жартаў ды апавяданьняў, якія пасьля 11 разоў выходзілі пад назвай «Польскі казачнік» (?) па-польску, а таксама ў перакладзе на чэскую, францускую, ангельскую й нямецкую мовы. А сам чалавек быў мяйсцовы, са Шчорсаў. Яшчэ ў 1817 годзе памёр Язэп Міцкевіч — прафэсар экспэрымэнтальнае фізыкі Віленскай акадэміі. Але найбуйнейшыя даты, зьвязаныя зь беларускай навукай, у нас наперадзе. Ці ззаду? Дзіўнаватая сітуацыя. Забраўшыся сюды, у 1817 год, адчуваеш сябе, як у глыбокай шахце. І ўжо карціць назад, на сьвятло, але трэба «закапвацца» яшчэ глыбей..

### *200 гадоў назад*

1792 год. Падзелы Рэчы Паспалітай. Ужо ва ўсю ваюе з канфэдэратамі Касьцюшка, і перамагае, за што беларуская шляхта называе сваіх навародкаў ягоным імем — Тадэвуш. Пра гэта ў камэнтарах да «Пана Тадэвуша» напіша пасьля Адам Міцкевіч. А вось будучага дасьледчыка беларушчыны, гісторыка **Калайдовіча** бацькі назвалі Канстанцінам. Мусіць таму, што ён нарадзіўся *(21 траўня)* зусім не на Беларусі. Яшчэ аднаго гісторыка — **Грыгаровіча**, хоць ён і нарадзіўся *(6 верасьня)* ў Прапойску, бацькі назвалі Іванам Іванавічам. Адбілася праваслаўная традыцыя. Цяпер пра самую навуку.

Выяўлены Рагвалодаў камень. Выйшаў з друку падручнік прафэсара Варшаўскай рыцарскай школы Я.Хюбэ «Фізыка для нацыянальных школаў», па якім вучыліся на Беларусі. Таксама зьявіліся «Лекцыі па экспэрымэнтальнай фізыцы» гарадзенскага прафэсара Яна Стырпэйкі. Здаецца, суцэльная фізыка. Але гэта толькі здаецца. У Францыі выйшла кніга Э.Жылібэра «Практыкаваньні ў фіталёгіі», дзе аўтар параўноўвае расьліны сьвет Беларусі з флёрай у ваколіцах Ліёну. Рэч у тым, што Жылібэр, клясык эўрапэйскай батанікі, быў заснавальнікам Гарадзенскага каралеўскага батанічнага саду. Сад высечаны бальшавікамі.

Што яшчэ? Улетку Слонімская балетная школа пераведзеная ў Целяханы. Прыкметы часу...

### *225 гадоў назад*

1767. Агульнае тло — вялікая краіна сыходзіць у нябыт. Даты гэтага году нібы падкрэсьлена пышныя, як адзеньне астатніх беларускіх вяльможаў і самога Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Вось ягоная грамата з пацьверджаньнем Мсьціславу магдэбурскага права (дзеля ўмацаваньня духу ў памежным з Расеяй горадзе?), вось ён сам на высокім цырыманіяле надае Віленскай абсэрваторыі найменьне «каралеўская», а Марціну Пачобуту — «каралеўскага астранома». Скончанае будаўніцтва **касьцёлу й кляштару місыянэраў у Сьмілавічах**. Цяпер гэта Чэрвеньскі раён, а згаданы будынак — шэдэўр ракако — даўно зьнішчаны бальшавікамі... Яшчэ адна «архітэктурная» дата. *3 сакавіка* памёр архітэктар **Ян Крыштап Глаўбіц** — стоўп беларускага ракако — так званага віленскага барока. Сёньня жывы музэй Глаўбіца — старая Вільня. А яшчэ ён — аўтар праекту перабудовы Полацкае Сафіі. Застаецца назваць Слуцкую **канфэдэрацыю**. Гэтая дата не навуковая й не мастацкая. Гэта інсьпіраваны расейцамі бунт, адзін з мэтадаў падзелу Рэчы Паспалітай — зь сярэдзіны. Гісторыкі пішуць так: *20 сакавіка* ў Слуцку некаталікі абвясьцілі канфэдэрацыю, патрабуючы ад кіравецтва Рэчы Паспалітай адмяніць усе дыскрымінацыйныя нормы ў адносінах да праваслаўных і пратэстантаў... Барацьба за правы чалавека? Ці за развал уласнае дзяржавы? На карысьць суседняе імпэрыі... Ох, пакажа вам Расея верацярпімасьць!

### *250 гадоў назад*

Юбілейных датаў робіцца ўсё менш, быццам мы йдзем ад вусьця да вытоку ракі. Недзе там усё скончыцца апошняй крыніцай...

У 1742 — толькі адна дата. Нарадзіўся **Францішак Нарвойш.** Прафэсар вышэйшае матэматыкі Віленскае акадэміі, інжынэр. Лекцыі Нарвойша былі прысьвечаныя матэматычнаму аналізу і ўключалі аналітычную геамэтрыю, вышэйшую альгэбру, дыфэрэнцыяльнае й інтэгральнае вылічэньні, пачаткі тэорыі верагоднасьцяў. Тры гады па даручэньні ўраду Рэчы Паспалітай Нарвойш кіраваў расчысткай рэчышча Нёмна. На адрэзку ад Горадні да вусьця Вяльлі раскалолі і ўзарвалі каля трох мільёнаў валуноў...

### *275 гадоў назад*

**1717. Нарадзіўся архітэктар Людвік Грынцэвіч, прадстаўнік позьняга барока, аўтар кляштару дамініканаў у Нясьвіжы й яшчэ колькіх дамініканскіх будынкаў.**



Заснаваная **Налібоцкая шкляная мануфактура**, якая рабіла посуд на магнацкі й каралеўскі стол. Памёр **Станіслаў Незабітоўскі**, аўтар ўспамінаў пра падзеі 1682-1700 гадоў на Наваградчыне й Случчыне. У Браслаўскім павеце нарадзіўся пэдагог, аўтар падручнікаў па гісторыі й геаграфіі **Кароль Вырвіч**, а ў Нежыне *(9 лістапада)* — праваслаўны артадокс **Георгі Каніскі.**

### *300 гадоў назад*

У Менску, у школьным тэатры пры калегіі езуітаў, прайшлі першыя тэатральныя паказы. У Барунах заснаваны базылянскі кляштар.

### *325 гадоў назад*

1667 год. **Андрусаўскі мір з Расеяй**. Скончылася самая стратная для Беларусі 13-гадовая вайна з маскалямі. Зьнішчаная большая палова насельніцтва краю, спаленыя й разрабаваныя амаль усе беларускія гарады. Смаленшчына й Севершчына перайшлі пад маскоўскую ўладу. «Навсегда»...

Сымон Полацкі пакідае панішчаны родны край і перасяляецца ў Маскву, дзе становіцца настаўнікам царскіх дзяцей. Такі добраахвотны крок. Сотні астатніх па сёньняшніх мерках спэцыялістаў — рамесьнікаў, дойлідаў, кафляроў, разьбяроў, збраяроў — маскалі гвалтам гоняць да сябе, на будоўлю й аздабленьне Маскоўскага крамля, Нова-Ерузалімскага манастыра пад Масквой, царскага палацу ў сяле Каломенскае ды іншых шэдэўраў расейскага мастацтва. Выглядае, што на Беларусі не засталося ніводнага майстра. Аж не. У 1667 збудаваныя Траецкі касьцёл і кляштар бэрнардынаў у Глуску, Траецкі касьцёл у Вашмянах...

### *350 гадоў таму*

1642. У Горадні скончана будаўніцтва касьцёла й кляштара Брыгітак, а ў Полацку — пажар. «Моцным пажарам, які адбыўся па неасьцярожнасьці п'яных людзей у верхнім замку, усе пабудовы замка з навакольнымі драўлянымі сьценамі й вежамі ператвораныя ў попел» (М.Без-Карніловіч). Адбылася своеасаблівая пераьменка ў мэмуарыстаў. Памёр аўтар «Дыярыюша» **Самуіл Маскевіч**, нарадзіўся аўтар «Дыярыюша» **Тодар Абуховіч.** Час росквіту мэмуарнае літаратуры. Яшчэ да гэтага году належыць віленская сатыра «Вітаньне на ўезд», якую Максім Багдановіч назваў «ці ня першым беларускім вершам». А пра «першае апавяданьне» я ўжо згадваў. Юбілеі жанраў...

### *375 гадоў таму*

1617. Тут — спрэс рэлігійная тэматыка. Л.Карповіч пастрыг Максіма Сматрыцкага ў манахі пад імем Мялеція. 12 лістапада Язахват Кунцавіч стаў Біскупам. Збудаваныя: Юраўскі касьцёл у Крамяніцы Дольнай каля Зэльвы (унікальны помнік беларускага рэнэсансу, адзіны на Беларусі касьцёл, дзе захаваўся надгробак — Вольскіх) і Траецкі касьцёл дамініканаў у Ружанах — помнік нацыянальнага маньерызму, пры якім сёньня йснуе адзіны на Беларусі касьцельны музэй. У Слуцку адкрылася першая на Беларусі гімназія — кальвінская школа. А *3 сакавіка* нарадзіўся Ян Цадроўскі. Мэмуарыст. Зрэшты, можна, напэўна, назваць і так — пісьменьнік, літаратар. Мэмуарысты — пісьменьнікі сярэднявечча.



Слуцкая кальвінская гімназія

* * *

*Вострая брама. Атвор*
*у нязвыклую глыб,*
*дзе нэафіт пачувае сябе*
*як на Марсе,*
*ну, а заўсёднік*
*утульных кавярняў, прынамсі,*
*можа сядзець за ажурнымі*
*кратамі шыб,*
*каву смакуючы і пазіраючы на*
*шыльду насупраць,*
*якая цямнее на муры*
*помніка вельмі далёкае архітэктуры,*
*і, не стрываўшы, міжволі ўздыхнуць*
*— даўніна...*

А.М.

У лістах, якія атрымлівае *НН*, багата вершаў. Але не для друку. Нехта піша, бо зачараваны гучаньнем словаў яшчэ бацькамі забытае мовы, нехта падумаў, што — паэт, накідаў чарнавік і — сюды, нехта наадварот — «пераседзеў». Напэўна, гэтая вершаваная плынь ня скончыцца, а яшчэ павялічыцца. І вось, каб неяк падахвоціць аўтараў крытычна ставіцца да сваіх твораў і больш працаваць над імі, каб даць прызнаным мэтрам сьвежую тэму, а таксама каб узнавіць старую традыцыю беларускае паэзіі — ад Багушэвіча, Коласа, Багдановіча, Жылкі, Танка... Рэдакцыйная Рада *НН* пастанавіла абвясьціць наступнае: хто напіша найлепшы сучасны верш пра Вільню, той стане пераможцам у паэтычным спаборніцтве *НН* і атрымае ўзнагароду, а таксама ганаровае імя ляўрэата *Нашае Нівы*.

*Рэдакцыя.*



# Dom na Antokalskaj, 30

**Lavon Łuckievič**

Hety budynak cikavy dla nas nia tolki svajoj architekturaj, bahatym fasadam i paŭkruhłym balkonam, jakija nahadvajuć pra Vilniu minułaha stahodździa, i nia tolki dvuma kamiennymi sfinksami, što vartujuć uvachod. U hetym domie ŭ kvatery № 3 amal paŭsotni hadoŭ nazad pasialiŭsia mastak Piotra Sierhievič. Tut prajšła asnoŭnaja častka jahonaha tvorčaha žyćcia, tut jahonaje žyćcio i skončyłasia ŭ listapadzie 1984 hodu.

P.Sierhievič (nar. u 1900 h.) pachodziŭ ź vioski Staŭrova Dzisienskaha pavietu. U 1920-m z dapamohaj Ferdynanda Ruščyca staŭ volnym słuchačom mastackaha fakultetu ŭ Vilenskim universytecie. Paśla praciahvaŭ studyji ŭ Krakaŭskaj akademii mastactvaŭ i jašče dva hady — u praf. Ślańdzinskaha ŭ Vilni, dzie Sierhijevič i zastaŭsia na ŭsio žyćcio. Tut jon byŭ siabram Biełaruskaha Navukovaha Tavarystva, tut pracavaŭ u Biełaruskim muzei. Bahata pisaŭ. Ź jahonych histaryčnych abrazoŭ najlepiej vidać, što byŭ mienavita biełaruskim mastakom. Ale pašanu jon mieŭ najpierš ad lietuvisaŭ — staŭ zasłužanym dziejačom mastactvaŭ Lietuvy. Z pośpiecham prachodzili ŭ Vilni persanalnyja vystavy P.Sierhieviča. A adna, jubilejnaja vystava, była ŭ Miensku.

Jašče za žyćcia mastaka jaho majsternia j kvatera stali asiarodkam biełaruskich žyvapiscaŭ, bo pryciahalnaja była asoba haspadara. Siudy prychodzili, pryjaždžali, tut spynialisia. Ale minuŭ čas. I paśla śmierći mastaka nia ŭsie byłyja siabry zachavali viernaść pamiaci majstra. Što ž, mnohaje zabyvajecca...

Memaryjalnaja kvatera P.Sierhieviča na Antokalskaj, 30 maje sionnia duža niepryvabny vyhlad. Tyja pracy mastaka,



*Piotra Sierhievič kala svajho domu ŭ 1968 h.*

što składzienyja ŭ majsterni, ekspanavacca nia mohuć, bo pamieškańnie avaryjnaje. Dyj samomu ich zachavańniu pahražaje niebiaśpieka. Udava majstra, spadarynia Stanisłava, užo niemaładaja kabieta, jana nia ŭ stanie damahčysia ramontu i biezdapamožnaja, kab źbierahčy spadčynu muža. Urešcie, i sama kvatera aficyjnaha statusu «muzeja-kvatery Piotry Sierhieviča» nia maje. Kab niejak źmianić takoje kiepskaje stanovišča, patrebnaja chutkaja dapamoha ŭsich zacikaŭlenych asobaŭ i arhanizacyjaŭ. A pakul...

Takija voś nieviasiołyja spravy sionnia ŭ domie №30 pa Antokalskaj.

### *400 гадоў таму*

1592. У Менску заснаванае першае праваслаўнае брацтва мяшчанаў-аднаверцаў. Хведар Еўлашоўскі абраны на пасаду падсудка земскага наваградзкага суда. Гэтую пасаду ён будзе займаць да канца свайго жыцьця.

### *425 гадоў таму*

1567. Ідзе Полацкая вайна з Масковіяй. Ёю выкліканы вайсковы перапіс у Вялікім Княстве Літоўскім. Пад Маладэчнам сабрана каля 50 тысяч вояў. Гэта была самая вялікая мабілізацыя за ўсю гісторыю Княства. Астатнія даты гэтага году таксама зьвязаныя з Полацкай вайной. Дзісна атрымала герб з выявай трох мураваных вежаў. Абарончы герб. Паблізу вораг. Філон Кміта-Чарнабыльскі заступае на пасаду старосты аршанскага. Заступае на 20 гадоў. Упершыню згадваюцца Мёры.

### *450 гадоў таму*

1542. Заснаваны Пінскі касьцёл і кляштар дамініканаў. Ці ня першы такі на Беларусі?

### *475 гадоў таму*

1517. Гэтая дата адназначна выклікае ў памяці імя **Скарыны** й назву першай беларускай друкаванай кнігі — **«Псалтыр»**, якая выйшла *6 жніўня* ў Празе, там, дзе й цяпер расьце цытрына, якую пасадзіў першадрукар.



А яшчэ гэта год Кастуся Астроскага. Ягоная **бітва з Масквой пад Апочкай** каля Пскова. Ягоная фундатарская дзейнасьць. У 1517-м Астроскі перабудоўвае Барысаглебскую царкву ў Наваградку. Паводле паданьня, у гэтай царкве хрысьціліся й вянчаліся вялікія літоўскія князі.

А яшчэ была аблога Полацка. Войска, якое прывялі маскоўскія ваяводы, пабілі й патапілі ў Дзьвіне самі палачане.

### *500 гадоў таму*

Гісторыя настолькі далёкая і ўмоўная, што ўжо выходзіць за межы ўсялякага жывога ўспрыйманьня. Яна ўжо не адчуваецца, як не адчуваецца, напрыклад, тое, што малекула складаецца з атамаў, што Зямля круглая, як не адчуваюцца радыёхвалі... Проста людзі дамовіліся, што ўсё гэта так і што ўсё гэта ёсьць, што гісторыя 500 гадоў таму — была такая й такая. (Зрэшты, ёсьць тут і нацыянальны чыньнік. Мы ня маем палітычнае гісторыі Беларусі XX, XIX, XVIII... стагодзьдзяў, таму ў далёкае сярэднявечча спускаемся не спакваля, а безаглядна скокнуўшы цераз прорву адсутнай гісторыі туды, дзе мала зьвязаны з сучаснасьцю край, дзе невядома чаго хочуць насельнікі гэтага краю, дзе ўсё выглядае прыдуманым. Магчыма, гэта і ёсьць галоўная прычына ўмоўнасьці).

Між тым, якраз 1492 год разьвейвае спакусьлівую думку пра ўсялякія містыфікацыі (а ці было ўвогуле тое Вялікае Княства Літоўскае?) сваімі зусім рэальнымі падзеямі, якія дазваляюць добра разабрацца ў тым, што такое была Старабеларуская Дзяржава, у яе структуры, узаемадачыненьнях, праблемах. Што ж тады адбывалася?

У Горадні памёр Вялікі князь Літоўскі і польскі кароль **Казімер.** «Гэты манарх, — піша пра яго гісторык П.Урбан, — заняўшыся выключна справамі Польшчы, зьвёў на нішто ўсходнюю палітыку Вялікага Княства Літоўскага». Вынік гэтага — пачатак сэрыі войнаў з Маскоўскай дзяржавай, які таксама датуецца 1492-м годам. На княства заступае сын Казімера *Аляксандар.* І Паны-Рада, тагачасны парлямант Княства, змушаюць Аляксандра падпісаць **прывілей,** паводле якога кампэтэнцыя Вялікага князя абмяжоўваецца, а кампэтэнцыя Паноў-Рады пашыраецца. Гэта на выпадак, калі й Аляксандар зоймецца выключна справамі Польшчы, будзе каму бараніць інтарэсы Літвы. Зрэшты, у 1492-м кіравецтва Старабеларускае Дзяржавы катэгарычна адмовілася абіраць адзінага з Польшчай манарха. Гісторык Язэп Юха падкрэсьлівае канстытуцыйны характар таго згаданага прывілею Аляксандра. І гаворыць пра Аляксандраву грамату 6 жніўня, якая замацоўвала сувэрэнныя правы Княства, забараняла даваць землі, маёнткі, пасады, чыны й званьні чужаземцам, асабліва ўраджэнцам Польшчы. Цікава, ці будзем мы калісьці адзначаць юбілей масавага засяленьня этнічных палякаў на тэрыторыю Беларусі? Хто б падказаў дату...

### *525 гадоў таму*

*1 студзеня* 1467 году нарадзіўся **Жыгімонт І Стары**, якога з усіх вялікіх князёў найбольш любілі ў Княстве, пра што чытаем у Прамове Мялешкі: «Але Жыгімонта першага, — салодкая памяць яго. Той немцаў, як сабак, не любіў і ляхаў зь іх хітрасьцю вельмі не любіў, а Літву і Русь нашу любіцельна мілаваў». У вадрозьненьне ад Казімера. А яшчэ нарадзіўся Ян Галер — кнігавыдавец, які, кажуць, натхніў сваім прыкладам Скарыну.

### *600 гадоў таму*

*4 жніўня* 1392 году — яшчэ адна з найважнейшых датаў беларускай гісторыі. **Востраўскае пагадненьне Вітаўта зь Ягайлам**, паводле якога Ягайла перадаў усю ўладу ў Княстве Вітаўту. Княства стала незалежнай дзяржавай. Вось тут пачынаецца (для нас, бо мы йдзем у адваротным кірунку) надзвычайны ляканізм гістарычных падзеяў. Амаль зусім прападае гісторыя культуры й побыту чалавека, саступаючы мейсца гісторыі палітычнай і ваеннай. Усё менш «стварыў, набыў, аддаў» чалавек, усё больш — «забіў, захапіў, напаў»... Я думаю пра тое, ці характэрная гэта рыса менавіта беларускае гісторыі? ці так усё гэта было на самой справе? ці гэта толькі ад няведаньня й адсутнасьці нармальнай гістарычнай навукі? Некаторыя выпадковыя зьвесткі мінуўшчыны сьведчаць пра іншае. Жылі людзі, ня горшыя й не дурнейшыя за нас. Але застаўся адно ляканізм...

### *650 гадоў таму*

1342. У вайне зь лівонскімі рыцарамі забіты **Любарт** — адзін з васьмі сыноў Гедыміна.

### *675 гадоў таму*

1317. У Наваградку створаная **праваслаўная аўтакефальная мітраполія** Вялікага Княства Літоўскага.

### *725 гадоў таму*

1267. **Войшалк**, сын Мяндоўга, перадае вялікакняскую ўладу **Шварну** (Сварамiру Данілавічу). Упершыню згадваецца **Магілёў**.

### *750 гадоў таму*

1242. Бітва на Чудзкім возеры. Вылучыўся Якаў Палачанін.

### *825 гадоў таму*

*Травень* 1167-га. У Ерузаліме памерла **Эўфрасіня Полацкая.**

### *850 гадоў таму*

1142. Першыя згадкі пра **Гомель і Рагачоў.**

### *900 гадоў таму*

1092. У Друцку — моравая язва.

### *925 гадоў таму*

*3 сакавіка* 1067 году. **Бітва на Нямізе.** Усяслаў Полацкі змагаецца з паўднёвымі князямі Яраславічамі. З гэтай падзеяй зьвязаная й першая згадка пра **Воршу.** Калі Усяслаў вяртаўся да Полацку, Яраславічы кінуліся рабаваць ды паліць усё навокал. Новая сустрэча з Усяславам адбылася ў іх якраз пад Воршай, куды ён прыйшоў на бітву, але Яраславічы яго падманам узялі ў палон і завезьлі да сябе ў Кіеў, у вязьніцу... Далей што было, вядома з савецкае нават школы.

### *975 гадоў таму*

1017. Першая згадка **Берасьця** (Ул.Салаўёў).

**Усё. Гэтым, зразумела, рэтраспэкцыя не сканчаецца. Але далей ужо чыста «фізыка-тэхнічныя» характарыстыкі, перасяленьне народаў, першабытныя стаянкі. Хоць мне здаецца, што ў сьвеце гістарычная навука, якая, скажам, перастала цурацца такіх «неакадэмічных» тэрмінаў як мэнтальнасьць і бяз колішняе агіды спліцчваецца ў розныя кангілямэраты, кшталу гісторыязофіі, — гэтая навука йдзе да чалавечага разуменьня самых аддаленых часоў. Магчыма, некалі такое адбудзецца й на Беларусі, калі вучоныя-гісторыкі выйдуць нарэшце са свайго абэцэдарскага шыняю, адкінуць свой «аб'ектывізм», які на справе зьявіўся як маскіроўка скрайняе ідэалягізацыі гісторыі, і аддадуць перавагу гісторыку, як творчай індывідуальнасьці. Але ж яшчэ так далёка да гэтага. Яшчэ толькі-толькі наступае 1992 год...**

С.П.

## 7 пратаколаў у школьным сшытку

З архіву НН

**Напэўна,**
**шмат што ў гэтых пратаколах**
**шмат каму будзе новае**
**й незразумелае.**
**Але мы ня будзем нічога тлумачыць,**
**камэнтаваць і расшыфроўваць.**
**Мэта публікацыі зусім іншая.**
**Гэтыя дакументы**
**нясуць да нас атмасфэру свайго часу,**
**адбіваюць настроі,**
**псіхіку, адносіны людзей,**
**якія ў вакупаванай Вільні**
**наладжвалі**
**беларускае нацыянальнае жыцьцё.**
**Гэтыя людзі — усё, што засталося**
**ад соцень і тысяч**
**беларускіх інтэлігентаў, актывістаў**
**пасьля сталінскага тэрору.**
**А гэтае жыцьцё зноў,**
**як тое было вякамі,**
**пачыналася зь Вільні**
**ды йшло ва ўсе куткі**
**па ўсёй Беларусі...**
**Словам,**
**будзем чытаць гэтыя пратаколы**
**як адбіткі часу.**
**Пры перадруку**
**тэксты пакінутыя бязь зьменаў.**
**У арыгінале ўсе пратаколы**
**напісаныя адной рукой**
**у школьным сшытку.**

**ПРАТАКОЛ** *надзвычайнага паседжаньня сяброў Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, Гэдыміна 4-11. 24.IX-1941 у собскім памешканьні.* На парадку дня: справа беларуска-рускай гімназіі ў Вільні. Прысутныя: інж. Клімовіч Адольф, спаўняючы абавязкі старшыні Камітэту; кс. Станкевіч Адам, сябра шк. сэкцыі; адв. Стэцкевіч Фэліцыян, сябра шк. сэкцыі; мгр. Шутовіч Ян; Найдзюк Часлаў, сакратар Камітэту; Пецюкевіч Марыян, дырэктар бел. вучыц. курсаў пры К-це.

Адчыняючы паседжаньне, інж. Клімовіч Адольф зрэфэраваў прысутным, што ў віленскай польскай газэце «Goniec Codzienny» № 57 б.г. і праз віленскае радыё падана да публічнага ведама вестка, што ў Вільні арганізуецца беларуска-расейская гімназія і мае ўжо вызначанага дырэктара. Сакратар К-ту Найдзюк Ч. у гутарцы з дыр. Беларускай Прагімназіі Анцукевічам Мікалаем даведаўся ад яго, што вышэйпаданая вестка паходзіць ад шк. уладаў, якія яго назначылі і дырэктарам ды арганізатарам гэнайжа беларуска-рускай гімназіі. На гэта Анцукевіч Мікалай згадзіўся і прыступіў да дзела, просячы за пасярэдніцтвам Найдзюка Ч. помачы К-ту ў атрыманьні новага памешканьня для арганізаванай ім гімназіі. Дзеля таго, што Камітэт раней дастаў згоду шк. уладаў на арганізацыю асобнай беларускай гімназіі, дык вышэй паданыя факты дамагаюцца высьвятленьня і азначэньня належнага становішча К-ту адносна іх.

У абгаворцы справы першы забраў голас кс. Станкевіч Адам, які выразіў свае засьцярогі адносна беларуска-расейскай гімназіі, падчырківаючы, што такі твор з узглядаў палітычнага характару і пэдагагічнага можа аказацца для беларусаў шкодным. Дзеля таго кс. Станкевіч А. запрапанаваў катэгарычна аднесьціся нэгатыўна да спробы шк. уладаў арганізацыі беларуска-расейскай гімназіі. Прапанову кс. Станкевіча падтрымалі другія сябры К-ту, як Пецюкевіч М., Стэцкевіч Ф., Найдзюк Ч.

У дыскусіі паўстала прапанова прыняць у справе беларуска-расейскай гімназіі наступную рэзалюцыю: *У зьвязку з нататкай у прэсе аб пастаноўленай арганізацыі «беларуска-расейскай гімназіі» ў Вільні і «вызначэньні дырэктара» («Goniec Codzienny» № 57), Б.Н.Камітэт сьцьвярджае, што: 1. школьныя літоўскія ўлады дагэтуль гаварылі і пастанаўлялі арганізаваць гімназію беларускую, 2. справа арганізацыі гімназіі беларуска-расейскае для Бел. Нац. К-ту зьяўляецца справай зусім новай, 3. у прынцыпе Б.Н.К-т проціў сумеснасьці беларуска-расейскай гімназіі, 4. дзеля высьненьня цэлай справы Камітэт дэлегуе да школьных уладаў грам. грам.: Клімовіча Адольфа, Пецюкевіча Марыяна і кс. Станкевіча Адама.* Апроч гэтага пастаноўлена, на прапазыцыю Пецюкевіча Марыяна, прызнаць скончыўшым слухачам бел. вуч. курсаў пры К-це падаркі ў форме кніжкі І.Дварчаніна «Хрыстаматыя бел. літэратуры» і кніжыцы кс. Станкевіча Ад. «Др. Фр. Скарына — першы беларускі друкар».

**ПРАТАКОЛ** *паседжаньня сяброў Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні 30.IX-41 г. у собскім памешканьні пры вул. Гэдыміна 4-11.* Прысутныя: праф. Іваноўскі В., інж. Клімовіч, Шутовіч Я., Найдзюк Я., Найдзюк Ч. і пасьля дакааптаваньня: Аляхновіч Ф., Грабінскі Б. На парадку дня: 1. Дэлегаваньне фахоўцаў у Менск. 2. Дакааптаваньне двух новых сяброў. 3. Справа выезду некаторых сяброў К-ту і зарэгістраваных у Камітэце фахоўцаў у розныя асяродкі Беларусі. 4. Арганізацыя працы ў Камітэце. 5. Фінансавыя справы К-ту. 6. Курсы: а) вучыцельскія, б) нямецкай м., в) адміністрацыйна-гандлёвыя. 7. Справа Ашмяны. 8. Справа памешканьня для Музэю. 9. Бягучыя справы.

Да 1-га. Дэлегуюцца ў Менск: 1. сакратар Найдзюк Я. для сталай працы над арганізацыяй друкарскай і выдавецкай працы; 2. Більдзюкевіч Адам, у справе адміністрацыйна-гандлёвых курсаў. Да 2-га. Згоднай пастановай грам. грам. Аляхновіч Ф. і др. Грабінскі Б. прыняты ў лік сяброў Камітэту. Да 3-га. Выяжджаюць у Менск у найбліжэйшым часе праф. Іваноўскі В., др. Грынкевіч Ст. Дэлегаваць на сакратарку пры Генэральным Камісары ў Менску грам. Концэвіч З. Падабраць і накіраваць у Менск кадры ў паліцыйную школу. Дэлегаваць у Ліду на дарадчыка пры Гебітскамісары інж. Клімовіча Ад., на заступніка бурмістра Ліды Мурашку Юстуна, на тлумача Рамука В. Агулам старацца аблягчыць выезд як найбольшай колькасьці безработных фахоўцаў, зарэгістраваных у К-це, у тыя асяродкі, дзе іх не хапае. Да 4-га. Прырыхтаваць адпаведных кандыдатаў на месца выехаўшых ці маючых выехаць сяброў Камітэту. Запрасіць на сакратарку грам. Чэркасянку Л. з Коўна, а на тлумача грам. Качкурэвіча. Прысьпяшыць справу тэлефону ў К-це. Устанавіць нутраны рэгулямін працы для працаўнікоў К-ту. Зрабіць вывеску аб парадку працы ў К-це, з азначэньнем гадзінаў прыйма інтэрэсантаў і падзелу працы. Як найхутчэй здабыць хлапца або дзяўчыну да пасылак. Забавязаць прыбірачку да пастаяннага дазору памешканьня К-ту з правам перанясьціся з ейнай цёткай на сталае жыцьцё ў памешканьні К-ту. Увольніць сакратара ад лішняй работы і агранічыць ягоную працу да вядзеньня працы ў сакратарыяце цераз: перадачу касы ў рукі кс. Станкевіча Ад.; даручэньне асобнай асобе вядзеньня бугальтэрыі; помач хлапца да пасылак. Прыняць на працу ў сакратарыят практыкантку, якая знае беларускую мову, крыху нямецкую і ўмее пісаць на машыне. Да 5-га. Упарадкаваць і перадаць касу кс. Станкевічу Ад. Вясьці ў парадку рахунковыя кніжкі. Выплаціць працаўнікам Камітэту залеглую плату наступным парадкам: за месяц верасень устанаўляюцца такія стаўкі: 1. Найдзюк Ч., сакратар, 600 рб. 2. Концэвіч З., II сакратар, 500 рб. 3. Стэцкевіч Ф., канцэліст, 4ОО рб. 4. Міхневіч Г., тлумач, 400 рб. 5. Гэрмановіч Л., прыбірачка, 250 рб. 6. Паўлюкоўскі Ул., карэктар і экспэдытар, 250 рб. 7. Курэйша Ул., экспэдытар, 200 рб. За ранейшы час працы на 20% менш, з выняткам Паўлюкоўскага Ул. і Курэйшы Ул. Найдзюку Ч. улічаецца толькі адзін месяц працы да 1.IX-41 як платны ў 480 рб. Даручыць вядзеньне рахунковасьці Ермалковічу Віктару. Агульны месячны бюджэт К-ту прадбачваецца каля 4 тыс. рубл. Прызнаць грам. інж. Клімовічу Ад. права крэдыту да 800 рб. Пастаноўлена, што старшыня мае дыспозыцыйны фонд у суме 1000 рб. у месяц. Каўшанцы З. прызнаецца 66% ад прыходу, з даплатай да 400 рб. у працягу 2 мес., калі б 66% аказаліся меншай сумай. Да 6-га. Усе тры роды курсаў, прадбачаныя ў парадку дня, пастаноўлена сарганізаваць. Арганізацыя вучыцельскіх курсаў даручаецца грам. Шутовічу Я., адміністрац.-гандл. — Більдзюкевічу Ад. Да 7-га. Копіі ўсіх папераў адносна палажэньня ў Ашмяне пераслаць у Менск з просьбай зрабіць інтэрвэнцыю. Да 8-га. Даручаецца грам. Шутовічу Я. рабіць адпаведныя захады. Да 9-га. Напісаць адпаведнае пісьмо да камісара аб беларуска-расейскай гімназіі. Далей вясьці ўсе раней распачатыя справы К-ту: кнігарні, друкарні, газэты і інш.

**ПРАТАКОЛ** *паседжаньня сяброў Камітэту 10.X-1941.* Прысутныя: Грынкевіч Станіслаў, Грабінскі Б., Шутовіч Я., Аляхновіч Ф., Найдзюк Ч. і пад канец паседж. старшыня Іваноўскі В. Праектаваны парадк дня: 1. Грашовыя справы Камітэту. 2. Прыняцьце кaштарысу беларускіх вучыцельскіх курсаў ад

## «Fräulein... ад беларускага камітэту»

*(Працяг са старонкі 2)*

* * *

Мая праца ў БНК пачалася. Праф. Іваноўскі пайшоў са мной у некаторыя нямецкія ўстановы, перадусім у вакруговы камісарыят і гестапа, і сказаў, што я буду прадстаўніком ад БНК ва ўсіх справах. Я пры гэтым гатовая была праваліцца скрозьдоньне. Мне здавалася, што немцы кпяць сабе з такога прадстаўніка. Праф. Іваноўскі меў вялікі арганізацыйны талент, умеў навязваць кантакты й рабіў уражаньне сваім аўтарытэтам. А што ж я?

Хутка высьветлілася й яшчэ адна перашкода. Я свабодна чытала па-нямецку, але весьці гутарку мне ніколі не даводзілася, бо проста не было з кім. Сяк-так выказвала свае думкі, але вельмі мала разумела з таго, што казалі яны. Я гатовая была плакаць з адчаю. Аднак прайшоў месяц, можа, крыху больш, я пачала лепш разумець, асвойталася са сваёй працай.

Празь нядоўгі час праф. Іваноўскі паехаў у Менск. Мейсца старшыні спачатку заняў Клімовіч, а пасьля, калі ён пераехаў на працу ў Ліду, старшынём стаў д-р Грынкевіч. Але Грынкевічу цяжка было пагадзіць працу ў Камітэце са сваім прафэсыйным заняткам. Ён працаваў у касе хворых, мусіў весьці прыём згодна з раскладам, і выходзіць у Камітэт хоць на гадзіну было яму немагчыма. А Камітэт працаваў па восем гадзін у дзень, як кожная ўстанова, і прысутнасьць старшыні была неабходная. Апрача таго, жыў Грынкевіч у Еразалімцы, транспарту не было, і ён мусіў хадзіць пешшу ці езьдзіць роварам па сем кілямэтраў у Вільню й зь Вільні. На становішчы старшыні яго зьмяніў д-р Грабінскі.

Грабінскі меў прыватны дантыстычны кабінэт і мог прызначаць сваім пацыентам час, які быў яму дагодны. Дый жыў Грабінскі зусім блізка ад Камітэту. Ст.Грынкевіч застаўся віцэ-старшынём. Скарбнікам быў Адам Станкевіч. Сакратар Камітэту хутка выехаў на Беларусь, і мне было запрапанавана прыняць таксама й абавязкі сакратара.

Такім чынам, урад Камітэту складаўся з Грабінскага, Грынкевіча, А.Станкевіча й Аляхновіча. Гэтыя шляхотныя, самаахвярныя людзі, якія ніколі ня йшлі на кампраміс са сваім сумленьнем, засталіся для мяне назаўсёды сьветлым прыкладам.

Мая праца сакратара была такая, як і ў кожнага сакратара, — я вяла канцылярыю, прыймала інтарасантаў, калі не было старшыні. Грабінскі прыходзіў у Камітэт на адну гадзіну — ад 11 да 12. Я казала яму пра бягучыя справы, ён прыймаў інтарасантаў, якія хацелі гаварыць зь ім асабіста, падпісваў некалькі чыстых канцылярскіх блянкаў, на якіх я пісала пасьля тое, чаго вымагалі бягучыя справы. Давер паміж сябрамі ўраду быў поўны.

* * *

Як юрысконсульту мне было даручана абараняць інтарэсы беларускага насельніцтва, якое апынулася на тэрыторыі Летувы, і гэта сталася галоўным зьместам мае працы. Напрыклад, прыходзілі людзі, якім трэба было вырабіць пропуск на праезд чыгункай або патэнт на дробны гандаль і падобныя гаспадарчыя справы. Я пісала адпаведную заяву ды зьвярталася зь ёю ў вакруговы камісарыят. Ад акруговага камісарыяту залежалі і ўсе культурныя мерапрыемствы, а таксама школьныя справы. З усім гэтым я мусіла зьвяртацца да намесьніка акруговага камісара — штабсляйтара.

Штабсляйтар быў малады аўстрыяк, вельмі ветлівы, як наогул аўстрыякі, і я даволі хутка асвойталася. Штабсляйтар, відаць, працай перагружаны ня быў ды нудзіўся, шукаў, з кім бы пагаварыць. Аднойчы ён сказаў, што яму сумна без жаночага таварыства, а знайсьці яго тут нялёгка, бо з полькамі ім навязваць знаёмства забаронена, а летувіскі ўсе надта нецікавыя. Найбольш вольнага часу ў яго было, мусіць, пасьля абеду, і ён тэлефанаваў, каб я прыйшла, бо ёсьць нейкая справа.

Штабсляйтар сядзеў у сваім вялізным кабінэце перад вялікім сталом, я сядала насупраць у фатэлі для інтарасантаў, і пачыналася гутарка на тэмы, далёкія ад службовых пытаньняў. Ён паказваў мне фатаграфіі свае жонкі й сына, які ляжаў у вазку, свае вілы на поўдні Аўстрыі. Я захаплівалася прыгажосьцю ягонага сына, хоць, на мой погляд, усе дзеці адно да аднаго падобныя й ніякай прыгажосьці я ў іх ня бачу. Але чаму ня схлусіць, калі гэта нікому ня шкодзіць, а дапаможа навязаць асабісты кантакт. Якую вагу маюць асабістыя кантакты, я вычула зь першых дзён працы з праф. Іваноўскім. Праўда, аўтарытэтам я ні на каго падзеяць не магла, бо яго ў мяне не было, але кантакты ўсё-ткі навязаць патрапіла.

Штабсляйтару прыйшла ідэя заняцца маім палітычным выхаваньнем, і ён даў мне пачытаць «Mein Kampf». Штабсляйтар быў заўзятым нацыстам. Але, як я ні высільвалася, здолела прачытаць толькі трэйцюю частку кніжкі, на большае не хапіла цярплівасьці. Што ж, калісьці мне ў рукі папаў «Капітал», я адолела толькі адну старонку... На шчасьце, штабсляйтару не прыйшло ў галаву экзамэнаваць мяне з прачытанага, бо правалілася б з трэскам.

Увогуле штабсляйтар ішоў нам насустрач у нашых культурных справах. Аднак не заўсёды ён быў такі лагодны. Аднойчы, на дзень нараджэньня Гітлера — дзяржаўнае сьвята — на цэнтральных вуліцах мусілі быць вывешаныя нямецкія сьцягі. З балконаў нямецкіх установаў зьвешваліся габэлены з партрэтамі Гітлера. Наш Камітэт са свайго балькону зьвесіў бел-чырвона-белы сьцяг, узяты з музэю, а на ім Пагоню. Сьцяг і Пагоня правіселі да вечару. А мясьціўся Камітэт якраз насупраць акруговага камісарыяту.

Назаўтра раніцай, ледзь я ўвайшла ў Камітэт, зазваніў тэлефон. Штабсляйтар патрабаваў, каб я прыйшла. Голас быў злосны, я ведала, што будзе разнос. Не хацелася прыняць усе перуны й маланкі ягонага гневу на сябе, а ў Камітэце, апрача старэнькае прыбіральшчыцы, — нікога.

На прыступках я спаткалася з Аляхновічам, схапіла яго пад локаць і пацягнула з сабой. На яго пытаньні «куды, нашто», адказвала толькі «трэба, трэба», бо баялася, каб ён ня ўцёк.

Штабсляйтар быў вельмі злосны, а я адказвала першае, што прыходзіла ў галаву, маўляў, мы гэткім спосабам хацелі выказаць сваю пашану фюрэру. Штабсляйтар, безумоўна, ня верыў, як ня верыла я сама. Аляхновіч сядзеў, зрабіўшы разумную міну, ды час ад часу паціраў лысіну. Калі мы нарэшце выйшлі на вуліцу, Аляхновіч адытхнуў і сказаў: «Як добра, што я ні слова не разумею па-нямецку, няхай сабе ён бушуе, мяне гэта не датычыць».

Камітэт адчуваў сябе як бы беларускім консульствам у Летуве, хоць працаваў зусім незалежна ад Менску й арганізаваўся па ўласнай ініцыятыве. Фактычна ён і выконваў консульскія функцыі, таму мы й лічылі, што маем права пры нагодзе дэманстраваць свой сьцяг і герб.

* * *

Яшчэ ў мае абавязкі юрысконсульта ўваходзілі справы арыштаваных. Чарадой ішлі да нас заплаканыя жанчыны — жонкі, маткі, сёстры. Арыштаваных было мноства. Безь ніякае прычыны людзі траплялі ў вастрог, і, як звычайна, калі адбываюцца масавыя арышты, ня ведалі, за што яны арыштаваныя.

Тут, згодна зь інструкцыяй праф. Іваноўскага, я мусіла правесьці сьледзтва і, устанавіўшы невіноўнасьць чалавека, зьвярнуцца да немцаў з заявай аб яго звальненьні. Але напачатку выявілася, што гэта проста немагчыма, бо, апрача таго, што казалі сваякі арыштаванага, ніякага матэрыялу я сабраць не магла. Таму я хутка з'арыентавалася, што мне трэба ўстанавіць толькі адно: ці не зьяўляецца гэты чалавек злодзеем, бо за крымінальнікаў Камітэту ўступацца было неяк не да твару. Вось я й старалася ў гэтым з'арыентавацца, выпытваючы сваякоў аб жыцьці іх сям'і. Тады яшчэ беларуская вёска жыла патрыярхальным даваенным жыцьцём, і выпадкі крымінальных злачынстваў здараліся вельмі рэдка. Напісаўшы адпаведную заяву, я йшла зь ёю ў гестапа, дзе зьвярталася звычайна да шэфа палітычнага аддзелу.

Гэты шэф быў доктар тэалёгіі й філязофіі, былы кайзэраўскі афіцэр з часоў першай сусьветнай вайны. Калі ён быў цьвярозы, дык лаяў усё каталіцкае духавенства на чале з папам рымскім. Аднак, нягледзячы на гэта, у ягоным кабінэце вісеў абраз Маці Божай, а пад ім афіцэрская шабля. Калі ж быў п'яны, а гэта зь ім здаралася часта, лаяў усіх нацыстаў з Гітлерам на чале. Гэты доктар, нягледзячы на свае 48 гадоў, яшчэ ня меў жонкі. Аднак я хутка пераканалася, што абыякавы да жанчын ён ня быў. І тут наладзіўся асабісты кантакт, які пайшоў на карысьць маёй працы.

Так павялося, што мужчына, калі хоча прыпадабацца жанчыне, робіць ёй падарункі. Але немцы народ ашчадны. І вось гер доктар прыйшоў да высновы, што найвыгадней яму абыйдзецца «дарыць» мне людзей. Цяпер, калі я прыходзіла з заявай аб звальненьні нейкага арыштаванага, гер доктар казаў камусьці з падначаленых праверыць у картатэцы, ці сапраўды такі арыштаваны знаходзіцца ў вастрозе, і пісаў паперку такога зьместу: «Начальніку вастрога Лукішкі. Такога й такога вязьня sofort entlassen (неадкладна звольніць) і перадаць Fräulein... ад беларускага камітэту». Атрымаўшы такую паперку, я ня йшла, а бегла з усяе сілы. Некалькі сот мэтраў, якія аддзялялі вастрог ад гестапа, выдаўжаліся ў некалькі кілямэтраў... Тады я яшчэ не пазнала таго гнятлівага пачуцьця бязраднасьці, якое выклікаюць вастрожныя сьцены, але вычувала, якой дарагой чалавеку ёсьць кожная хвіліна волі.

Аднойчы, калі я зьявілася ў вастрог з такой паперкай, начальнік вастрогу спытаў, ці я ведаю гэтага чалавека асабіста. Я адказала, што безумоўна ведаю. Тады начальнік кажа: «Я спытаў пра гэта таму, што ў нас ёсьць два арыштаваныя з тымі самымі пэрсанальнымі дадзенымі». Я ня выказала свайго зьбянтэжаньня, і, калі прывялі нейкага хлапца, сказала, што гэта той самы. А сама думала — а што, калі гэта ня той? Праўда, я магла праз нейкі час зьвярнуцца з просьбай аб звальненьні «таго». А што, калі гэты вось які-небудзь злодзей, канакрад? Але мае сумлівы хутка разьвеяліся. Калі мы ўвайшлі ў Камітэт, да нас кінулася маладзіца, спачатку да хлапца, а пасьля пачала цалаваць мне рукі. Памылкі не было.

20.VIII—20.IX-1941 г. 3. Справа кнігарні. 4. Справа газэты. 5. Справа працаўнікоў у К-це.

Да 1. Прынялі да ведама інфармацыі праф. Іваноўскага, што ён атрымаў з дабравольных складак у Менску 3.435 рб. і пастанавілі перадаць гэтыя грошы ў Касу. Да 2. Каштарыс гр. Пецюкевіча М. скарыгаваў др. Грынкевіч... Да 3. Справу зрэфэраваў мгр. Шутовіч Я. Літоўскія ўлады, магчыма, пад націскам нямецкіх уладаў, хочуць перадаць кнігарню пад адміністрацыю беларусаў. Пісьмо з Коўна ад Генэральнага Камісара: скіраваньне К-ту да вырашэньня справы ў начальніка канцэлярыі віленскага Гебітскамісара. Спробы пераняць кнігарню з боку гр. Шутовіча Я. Ягоная гутарка з дырэктарам дзяржаўнага выдавецтва ў Вільні не дала задавальняючага выніку і была толькі характару інфармацыйнага. Візыта ў начальніка канцэлярыі віленскага Гебітскамісара — патрэба вызначэньня камісарычнага загадчыка кнігарні. Спробы Шутовіча Я. дастаць пасьведчаньне камісарычн. загадчыка кнігарні: візыта ў Камісарыяце, у дарадчыка асьветы Германтаса. Злажэньне адпаведных папераў. Кандыдаты ад працаўнікоў К-ту: на загадчыка — Бэкіш Я., Трэпчыха, Антановіч, Біндзюк, Пазьнячыха М. Гэтыя кандыдатуры зацьвердзіць з засьцярогай толькі што да Антановіча, на месца якога па вусным высьненьні можа быць прыняты Я.Багдановіч. Да 4. Аддаць у цэнзуру матэрыял. Справа працаўнікоў. Забавязаць іх да працы ў К-це пад дазорам рэдактара. Да 5. Запрасіць на дарадчыка ў кантакце з беларусамі, прыяжджаючымі з Беларусі з заказамі ў Вільню. Дэлегаваць на працу сакратаркі пры Гебітскамісары Ліды грам. З.Концэвіч.

**ПРАТАКОЛ** *надзвычайнага паседжаньня Прэзідыюму Беларускага Нацыянальнага Камітэту 13.X.1941 г. у сваім памешканьні.* Прысутныя: праф. Іваноўскі В., Аляхновіч Фр., Грабінскі Бр., Шутовіч Я., Найдзюк Я. і Найдзюк Ч. На парадку дня: 1. Выбары загадчыка кнігарні. 2. Даклад Я.Найдзюка. 3. Прызначэньне помачы Косьцевічысе.

Сход адкрыў старшыня Камітэту. Да 1-га. На кіраўніка беларускай кнігарні выбраны Бабок Юльян. На працаўнікоў намечаны Пазьнячыха М., Трэпчыха, Біндзюк. Працу прыбіральніка ў бел. кнігарні запрапанаваць Мілашэўскаму Ал. На экспэдыентак разгледзіць кандыдатуры Кічкайлянкі Я. і Шкадунянкі. Да 2. У Менску абвешчана беларуская нацыянальная аўтакефальная царква. Каталіцкія ксяндзы робяць вялікую работу. Працуюць там кс.кс. Глякоўскі, Малец і Рыбалтоўскі. Таксама разьяжджаюць за Менск, падобна як і праваслаўныя сьвяшчэньнікі. Патрэбныя кніжкі. 20 шк. у Менску. На правінцыі адчыняюцца школы таксама. Цяжка з падручнікамі і пам[illegible]мі. Школьны загад Генэральнага Камісара. Недастатак людзей у спэцыяльных школах, як у гандлёвых, рамесьніцкіх. Усе падручнікі мусяць быць цэнзураваны. Мае быць спэцыяльны часапіс для школьн. моладзі. Патрэбны сакратаркі і тлумачы. Пэрсанальная сытуацыя ў Менску: справа Генэральнай Рады не пасунулася наперад, рашаецца на эміграцыі і ў Бэрліне. Астроўскі не намесьнік і не прадстаўнік пры Генэральным Камісары, а толькі арганізатар Пэдагагічнага інстытуту. Др. Тумаш В. рэзыгнуе з бурмістроўства і хоча ўступіць сваё месца праф. Іваноўскаму. Др. Тумаш хоча перайсьці на працу ў рэдакцыю «Менскай газэты». Агляд друкарняў разам з немцамі. Праект стварэньня аднэй друкарні з многіх малых. Нямецкі шк. інсп. гаворыць па-польску. Цяжка з паперай. У Менску былі Ханяўка і др. Ярмачэнка з Варшавы. Гэты апошні мае задачай арганізаваць самапомач на Беларусі. Да 3. Прызнана 200 рб. як аванс на ганарар.

**ПРАТАКОЛ** *паседжаньня Прэзыдыюму Бел. Нац. К-ту ў Вільні 2.XI-41.* Прысутныя: Грынкевіч Ст., Грабінскі Б., Станкевіч Ад., Клімовіч Ад., Шутовіч Я., Найдзюк Ч., Малецкі Яз. Парадак дня: Справы: I абразоў для школ, II газэты, III кнігарні, IV Прэзыдыюму К-ту, V інтэнданта, VI працаўнікоў, VII статуту, VIII грашовыя, IX асьветныя, X школьныя, XI высылка працаўнікоў, XII даклад інж. Клімовіча з Ліды.

Да 1-га. Выясьніць адносна 5 абразоў, як Багушэвіча, Каліноўскага, Пагоні, Багдановіча, Цёткі. Да 2-га. Др. Малецкі прапануе выдаваць саматугам. Станкевіч Ад. прапануе напісаць яшчэ адзін ліст да Генэральнага Камісара ў Коўне. Прасіць Менск, каб прысылаў больш экзэмпляраў. Да 3-га. Чакаць да 5-га XI.1941 і па магчымасьці пераймаць у свае рукі. Інж. Клімовіч просіць на крэдыт кніжак у бел. кнігарню ў Ліду. Др. Малецкі паведаміў, што і ў Горадню для залажэньня бел. кнігарні патрэбныя кніжкі. Прапануе зрабіць камплекты і трымаць у К-це. Пастаноўлена даць кніжак у Ліду. Выдаць грам. Шутовічу Я. пасьведчаньне, упаважняючае да распараджаньня бел. кніжкамі бел. выдавецтваў, зложаных у Музэй у дэпозыт. Да 4-га. Патрэба вызначэньня [illegible]ступніка старшыні такога сябру, каторы мог [illegible] хоць часова стала працаваць даўжэйшы [illegible] кожны дзень у К-це. Др. Грынкевіч [illegible] прапануе двух кандыдатаў: др. Малецк[illegible] Грабінскага Б. На часовага заступніка [illegible] даў згоду др. Малецкі на жаданьне [illegible] Прэзыдыюму К-ту. Да 5-га. У зьвязку з тым, што грам. Антановіч А. адказваецца ад службы, на яго месца зацьвярджаецца Сурвіла. [illegible] каньне для інтэрнату і бел. [illegible] 6-га. Трэба высьвятліць справ[illegible] пункту гледжаньня. Скрэсліць з ліку [illegible] працаўнікоў [illegible] Лічыць сталымі працаўнікамі [illegible] сакратара, канцыліста, тлумач[illegible] Канцэлістку платную лічыць Бортн[illegible]. Да [illegible] Даручаецца апрацаваньне Шутовічу Я. у [illegible]раноўніцтве з сакратаром. Да 8-га. [illegible] Грынкевіча Ст., павінен [illegible] ў [illegible] на жыцьцёвыя патрэбы К-ту і на апрац[illegible] падручнікаў у форме аконта. Часьць [illegible] уладкаваць у нейкай натуры, напр. на [illegible] Прынята да ведама, што атрыма[illegible] Менску ў суме 3.950 рб. [illegible] даручаецца Дар[illegible] за фатыгу. Да 9-га. Рабіць [illegible] [illegible]лекцыямі беларусаведы... Даручаецца Шутовічу Я. Да 10-га. Інфармацыі Да 11-га. Як найб[illegible] высылаць. Да 12-га. У Лідзе праект[illegible] арганізаваньне настаўніцкіх курсаў і ў сувязі з гэтым патрэба настаўніцкіх сілаў на лекцыі. Патрэба ўтрымаць на свой кошт праўленьня для бел. спраў пры Гебітскамісары ў Лідзе. Пастаноўлена выплаціць інж. Клімовічу [illegible] рб. як аванс за працу ў Лідзе.

**ПРАТАКОЛ** *надзвычайнага паседжаньня Прэзыдыюму Б.Н.К. у Вільні 11.XI-41.* Прысутныя: Іваноўскі, Грынкевіч, Станкевіч, Малецкі, Грабінскі, Аляхновіч, Найдзюк. На парадку дня: 1. Даклад праф. Іваноўскага [illegible] у Менск. 2. Зрачэньне з старшынства.

Да 1-га.

**[illegible] Тэкст пратаколу ў гэтым месцы [illegible] пераказваецца даклад праф. Іваноўскага пра сітуацыю ў Менску [illegible] ды ў іншых гарадох Беларусі. [illegible] поўны фактаў, прозьвішчаў, развагаў і ацэнак дакладчыка. Але гэты тэкст зусім «пункцірны» й мала разборлівы [illegible] патрабуе шырокага камэнтару й [illegible] не датычыць дзейнасьці [illegible] у Вільні, а таму будзе надрука[illegible] адным з наступных нумароў**

[illegible] зрачэньне старшыні са свае функцыі [illegible] Прафэсара пастаноўлена лічыць звычайным сябрам Прэзыдыюму... Старшынёй [illegible] Станкевіча Ст., віцэ-старшынямі: I [illegible] [illegible]бінскі.

[illegible] абраныны.

[illegible] *Прэзыдыюму Бел.* [illegible] *30.XI-41.* Прысутныя: [illegible] Грабінскі, Шутовіч, [illegible] На парадку дня: 1. [illegible] 2. Падвышка платы пра[illegible] [illegible] на кіраўніка [illegible] 5. Нядзельнікаў. [illegible] грам. Бэкіша. 8. Справа [illegible] 10. Матуральных курсаў. [illegible] 12. Кнігарні.

[illegible] Да 2-га. Прызнаецца [illegible] за лістапад, а 50% [illegible] Да 3-га. Даручаецца др. [illegible] справу апекі над Музэям [illegible] дзейнасьць трэба [illegible] Бел. Нав. Т-ва [illegible] Грабінскі Б., [illegible] скарбнік — Сергіевіч, [illegible] сакрат. Падабед [illegible] Мядоўскі, Пада[illegible] [illegible] Камісію: Карнюк, [illegible] Да 5-га. Разважыць [illegible] з сакратаром. Да 6-га. [illegible] аб супрацоўніцтве [illegible] групамі этнічнымі. [illegible] словы «БНК у В. мае [illegible] правы перад дзяржавай». [illegible] Б. — прынялі да ведама, [illegible] пажадана, каб пратаколы [illegible] далучаныя да справы. Да [illegible] цэнзуру. Да 9-га. Робіцца [illegible] Да [illegible]-га. Пагаварыць з Дубіцкім. Да [illegible] Да 12-га. Рабіць захады ў [illegible]

*Сакратар: Ч.Найдзюк*

Былі й іншыя выпадкі.

Жылі мы з маткай удзьвёх на адной з глухіх вулак Антокаля ў невялічкай драўлянай хаце. Навокал — такія ж драўляныя хаты антокальскіх мяшчан. Хата стаяла ў гародзе, за шчыльным дашчаным плотам. На ноч браму зачынялі, бо дзьвюм жанчынам ва ўсёй хаце было ў такі неспакойны час даволі жудасна. І вось аднойчы напрадвесьні рана, яшчэ да ўсходу сонца, нехта загрукаў у браму. Мама выйшла спытацца — хто й чаго. «Ці тут да адвакаткі?» — кажа нехта. Куды ж ён, думаю, заблукаў, у гэтай глухамані ніколі ніякіх адвакатаў не было. А маці адчыніла браму, упусьціла чалавека ў хату й кажа мне: «Уставай, да цябе».

Калі я выйшла, у кухні ля стала сядзеў і піў гарбату прыгожы дзед, такі, як сьвяты Мікола на абразах. Пытаюся, што яго сюды прывяло? «Ды вось, — кажа, — паненка, сын арыштаваны». Ці даўно? «Ды ўжо два гады». Пытаю, чаму да гэтага часу не прыйшоў? «Ды вось, першы год да адвакатаў хадзіў, карову прадаў. Другі год малебны служыў, сьвіньню прадаў. Цяпер людзі нараілі зьвярнуцца да вас».

Я распыталася, як выйшла, што сына арыштавалі. Згары ведала, што нічога ня скажа дарэчы, як і ўсе сваякі.

Прыйшлі зь дзедам у Камітэт, там чакала маладзіца, сястра арыштаванага. Пытаюся, хто арыштаваў, выявілася, што летувіская «саўгума» (saugumas — ахранка). Гэта мне не спадабалася, бо летувісы нашага Камітэту не прызнавалі. Калі б я туды зьвярнулася, мяне б проста зачынілі й адправілі ў ваддзел працы на прадмет вывазу ў Нямеччыну. Трэба было дзейнічаць праз немцаў. Напісала я адпаведную заяву й пайшла ў гестапа. Гер доктар недзе адлучыўся й на гаспадарцы пакінуў вахмайстра. Да гэтага вахмайстра мне ўперад даводзілася зьвяртацца ў некаторых справах.

Вахмайстар сядзеў у сваім кабінэце. Перад ім на стале стаяла пустая паштовая скрынка для пасылкі. Ён глядзеў на яе з такой панурай мінай, быццам зьбіраўся ў ёй кагосьці пахаваць... Пасьля звыклых прывітаньняў («n'Tag» — «n'Tag», «Sonst geht's gut?» — «es geht») вахмайстар кажа: «Маю вялікі клопат, хачу паслаць жонцы пасылку, ды ня маю яек». «Я вам ахвотна дапамагу, — адказала я, — але вось маю паважнейшы клопат — чалавек сядзіць у вастрозе, трэба яго вызваліць». «А, гэта глупства, гэта зробім. Дзе ён сядзіць?» Калі я сказала, што ў «саўгуме», вахмайстар спахмурнеў: «Зь летувісамі гаварыць ist verflucht schwer (страшна цяжка). Але паспрабую, можа ўдасца».

Падперазаўшыся, ён надзеў шапку, а мне сказаў ісьці ў Камітэт і чакаць ад яго званка. Праз якую гадзіну пазваніў і паклікаў да сябе. «Я прыйшоў да летувісаў, — кажа, — і кажу: за што ён тут сядзіць і нашто ён тут сядзіць?»...

Больш ён нічога зрабіць ня мог, бо быў толькі вахмайстар. Я падзякавала й пайшла. Па дарозе зайшла ў нямецкую кнігарню, купіла часопіс «Die Dame». Успомніла, што [illegible] і пайшла па сонечным баку вуліцы [illegible] пад'езьдзе будынку, дзе мясьціўся [illegible], на шыю мне кінулася тая самая малад[illegible], што сталася. Але апрача словаў [illegible], паненачка» нічога не магла зь яе в[illegible]. У мяне захаланула на сэрцы: «Што, няма яго?» «Ды ёсьць, паненачка, ёсьць. Выпусьцілі ж брата», — нарэшце выдыхнула яна.

Цяпер мне заставалася здабыць хлопцу ў вакруговым камісарыяце пропуск на праезд, каб яго па дарозе зноў не схапілі й не засадзілі ў вастрог.

На другі дзень занесла вахмайстру яйкі. З гэтым я ня мела вялікага клопату, бо маці трымала куры. Гэтак за крыху яек я выкупіла чалавека, які невядома за што адседзеў два гады, ды невядома, што б зь ім было далей.

Калі ўвечары я вярнулася дахаты, маці кажа, што прыходзіла маладзіца, прынесла табе сыр і пабегла. Назаўтра дзень я панесла гэты сыр у Камітэт і пытаюся ў свайго шэфа, што мне зь ім рабіць, бо мы нічога ні ад кога ня бралі. Грабінскі й кажа, калі вам будуць даваць прадукты, дык бярыце іх сабе, вам жа жыць трэба.

А жылі мы з маткай з таго, што час ад часу я пісала сабе пропуск на праезд чыгункай, брала нешта з вопраткі й ехала на вёску, пераважна ў Летуву, ды зьмяняла там на прадукты. На шчасьце, вопраткі ў нас захавалася шмат. Так жыла тады вялікая частка насельніцтва Вільні. Але больш мне ніхто нічога не даваў. Той сыр быў мой адзіны «ганарар» за ўсе тры гады працы.

Колькі я за тры гады людзей вывела з вастрожнае брамы, ня ведаю, такое статыстыкі мы не вялі. Аднак ня ўсе справы даваліся лёгка.

Аднойчы былі арыштаваныя тры вучні беларускае гімназіі. Жылі яны недзе на Завальнай вуліцы. Ноччу гестапаўцы акружылі дом. Нехта ўцякаў праз вакно, яго застрэлілі. У хлопцаў было знойдзена шмат падробленых нямецкіх блянкаў і падробленая пячатка акруговага камісарыяту. Справа была шырока вядомая й затушаваць яе было немагчыма. Хлопцам па[illegible]ражала кара сьмерці.

Колькі трэба было пахадзіць у [illegible] Грабінскім і разам з дырэктарам гімназіі Фр.Грышкевічам! Мы гатовыя былі [illegible] іх на каленях. Нарэшце, [illegible] замененая высылкай у Нямеччыну ў рабоч[illegible] лягер.

[illegible] справы й выдаў мне пасьведчаньне, што вывазу ў Нямеччыну не падлягаю, бо зьяўляю[illegible] супрацоўніцай БНК.

З Грабінскім справа была горшая. Ноччу да я[illegible] на кватэру прыйшлі людзі з саўгумы, арышта[illegible]валі й зараз жа вывезьлі ў канцлягер Правені[illegible] як заложніка. Мы з Грынкевічам кожны [illegible] абыходзілі нямецкія ўстановы, дамагаліся [illegible] неадкладнага звальненьня. А штабсляйтар [illegible] пэўніваў, што «вернецца ваш Vater». Пра[illegible] некалькі дзён Грабінскі вярнуўся.

Летувісы думалі, што, арыштаваўшы Грабінскага й выслаўшы ў Нямеччыну мяне, [illegible] зьліквідуюць Камітэт. Трэба сказаць, што [illegible] да летувісаў з боку немцаў быў значна [illegible] чым да нас, і летувісы з гэтага карыст[illegible].

У 43-м гер доктар быў пераведзены ў Коўна. На ягонае месца прыйшоў іншы немец, [illegible] пайшлі горай. Нашыя заявы аб звальн[illegible] арыштаваных ляжалі доўга й часам без [illegible]тыўнага адказу. Паперак «sofort entlassen» [illegible] больш не атрымлівала.

* * *

Раніцою, ідучы ў Камітэт, я праходзіла [illegible] былога вайсковага астрогу, дзе цяпер быў лягер [illegible] ваеннапалонных. Некалькі чалавек пад ахов[illegible] нямецкага салдата мялі вуліцу. Я брала з [illegible] кавалак хлеба й падавала яго салдату. Той [illegible] жа дзяліў хлеб на некалькі кавалачкаў [illegible] раздаваў палонным. Іх выгляд рабіў жахлів[illegible] ўражаньне. Людзкія цені з загаслымі вачы[illegible] якія, здавалася, ужо ня бачылі навакол[illegible] сьвету.

Аднойчы ў Камітэт прыйшла папера, у [illegible] паведамлялі, што мы можам зьвяртацца ў [illegible] ваеннапалонных з заявай аб звальненьні [illegible] іншага вязьня, маўляў, бярэм яго на [illegible] адказнасьць. Але скуль браць пеража[illegible] дадзеныя? Заставалася чакаць, пакуль [illegible] сваякі, і сваякі пачалі прыходзіць.

[illegible] з такой заявай я пайшла ў лягер. [illegible] на другі паверх. Падала заяву ў [illegible] сказалі пачакаць у калідоры. [illegible] вакна й паглядзела ўніз. На [illegible] падворку стаяла грузавая машына. [illegible] выносілі зьдзервянелыя [illegible] кладаб, як бярвеньне. Машына была [illegible] поўная. У мяне перад вачыма [illegible] пачала гайдацца. Я ўчапілася за падваконьне. [illegible] Недзе здалёк пачуўся голас: [illegible] голас пачуўся бліжэй. [illegible] стаяў афіцэр і [illegible] звальненьне палон[illegible] [illegible] у вакно й зразумеў, [illegible] [illegible]агу.

[illegible] колькі гадоў. У будынку былога [illegible] астрогу цяпер мясьціўся пашпартны [illegible] гэтай установе была нейкая [illegible] Я таксама паднялася на другі [illegible] дакумэнты ў той самы пакой, і [illegible] сказалі пачакаць у калідоры. Я [illegible] да таго самага вакна й [illegible] Быў сонечны летні дзень, а [illegible] ўсплыў засьнежаны панад[illegible] [illegible] грузавая машына. Недзе здалёк [illegible] голас: «Гражданка, зайдите». Я не [illegible] і толькі калі голас пачуўся [illegible], што за плячыма стаіць іншы [illegible] Ён не зразумеў, што я там убачыла, [illegible] падворку.

[illegible] консультам (у сьціслым зна[illegible]) пры БНК мне так і не [illegible] вайна, юрыдычныя [illegible] нікому не патрэбныя. Мая праца [illegible] абаронцы, і кіравацца [illegible] законамі, а чалавеч[illegible]

[illegible] характэрнай рысай усіх [illegible] Але не было чалавечнасьці [illegible] вачыма — пакрытая [illegible] Аляхновіча. Панурым [illegible] успамін пра трагічную [illegible] праф. Іваноўскага. Сум залягае на [illegible] ніколі ня ўбачу Ст.Грынкевіча [illegible], Фр.Грышкевіча — [illegible]

[illegible] галаву перад іх [illegible]

Зоя Каўшанка

# ТАЯМНІЦЫ ЧАЦЬВЕРТАГА ВЫМЯРЭНЬНЯ

**Калі ўбачыш перад сабою невялікую, дзіўную хмурынку, якая зьмяняецца ўсімі колерамі вясёлкі, не набліжайся, каб заспакоіць сваю пустую цікаўнасьць. Уцякай найхутчэй, як толькі здолееш, бо інакш можаш быць адпраўлены тым бяскрыўдным клубком імглы ў чацьвертае вымярэньне, у нязнаны й пагрозьлівы сьвет надпрасторы.**

Так, прынамсі, лічаць многія, хто прачытаў кнігу Эрнста Мэклембурга «Тунэль часу», якая ў Нямеччыне адразу стала бэстсэлерам.

Капрал чылійскае арміі Арманда Вальдэс зь пяцьцю падначаленымі выконваў нармальную патрульную службу. Быў красавік 1977 году. Раптам жаўнеры замёрлі ў васлупеньні: капрал зьнік. Проста расплыўся ў паветры. Па кольких хвілінах, супакоіўшыся, вайскоўцы пачалі пошукі. Але дарэмна яны гукалі, бегаючы па ваколіцах. Іхні начальнік прапаў як камень у ваду. Калі ж расчараваныя, яны намерваліся ўжо кінуць пошукі, капрал гэтаксама нечакана зьявіўся зноў. Яго́ная адсутнасьць цягнулася ня больш чвэрткі гадзіны, але гладка паголены перад тым твар цяпер пакрывала густое шчацьцё, а гадзіньнік Вальдэса паказваў дату, якая будзе толькі празь пяць дзён. Сам капрал ня здолеў нічога растлумачыць.

Яшчэ больш дзіўная гісторыя здарылася з адным бізнэсмэнам у Варгентыне. Ён сеў у машыну, прыпаркаваную перад гатэлем, каб ехаць дадому. Празь некалькі сэкундаў за 1500 км адтуль на вясковай дарозе адзін шафёр грузавіка падабраў шакаванага аўтастопшчыка, які жэстыкуляваў і казаў нешта невыразнае. Гэта быў той самы дзелавы чалавек, які па прыезьдзе да тэлефону адразу пазваніў у свой гатэль. «Так, — пачуў у слухаўцы, — ваша машына стаіць яшчэ на гатэльным паркінгу з уключаным рухавіком». Пасьля ўжо выслуханы ў паліцыі бізнэсмэн прызнаўся, быццам ня верачы сваім словам: «Я ўжо сядзеў у машыне, калі раптам убачыў па-над асфальтам дзіўную хмурынку, якая паволі плыла ў мой бок. Потым нічога ня памятаю».

Эрнст Мэклембург, які шмат гадоў вывучае пытаньні часу й прасторы, лічыць — а ягоную думку падзяляе вельмі шмат выбітных вучоных — што людзкое зразуменьне гэтых паняцьцяў прымітыўнае. Чалавек успрымае рэчаіснасьць толькі ў трох вымярэньнях. Даўжыня, вышыня й шырыня — зразумелыя й не патрабуюць тлумачэньняў. Тады як, лічаць навукоўцы, існуе яшчэ чацьвертае вымярэньне — вымярэньне часу. Найвялікшыя аўтарытэты сьвету ў фізыцы блізкія да таго, каб прывесьці доказы йснаваньня надпрасторы, таямнічага сілавога поля, у якім ня дзейнічаюць звыклыя законы прасторы й часу. Нельга, на думку аўтара «Тунэлю часу» выключыць, што пры пэўных акалічнасьцях надпрастора можа зьявіцца таксама й на Зямлі.

Спатканьні з надпрасторай звычайна сканчаюцца ня так бяскрыўдна, як у вапісаных выпадках. Людзі гінуць, быццам расплываюцца ў паветры. У 1928 годзе зьнік Альфрэд Лёвэнштайн, адзін з найбагатшых бэльгійскіх банкіраў. На борце свайго прыватнага самалёту, які ляцеў з Лёндану ў Брусэль, ён падаўся ў прыбіральню. Калі праз чвэрць часу занепакоены сакратар адчыніў замыкнутыя дзьверы прыбіральні запасным ключом, памешканьне было пустое. А між тым, тут не было ніводнага атвору, празь які мог бы выпасьці няшчасны фінансіст. Цела Лёвэнштайна празь месяц вылавілі ў канале Ля Манш.

Мястэчка Глястанбэр у вамэрыканскім штаце Вэрмонт ад даўняга часу мела кепскую славу. У 1945 годзе тут зьнік у часе вандроўкі праваднік Міды Рывэрс. А праз пяць гадоў бацька пакінуў там у машыне васьмігадовага сына, Поля Джонсана. Калі праз хвіліну ён вярнуўся, у машыне не было нікога.

Ахвярамі злачыннай надпрасторы становяцца ня толькі людзі, але й самалёты. У 1943 годзе некалькі амэрыканскіх бамбоўцаў В-25, што ляцелі над Бірмай, спаткалі на сваім курсе таямнічыя хмурынкі. Адна з машын, якой кіраваў паручнік Рэйнардс, увайшла ў клуб дзіўнае мглы, і ўжо не вылецела зь яго ніколі.

Нямецкія сакратаркі недаверліва глядзяць на экраны сваіх кампутараў пасьля таго, як прачыталі ў кніжцы Мэклембурга, што гэтыя вынаходкі XX стагодзьдзя могуць быць ужытыя дзеля пераказваньня вестак зь іншага сьвету. Ангельскі настаўнік Кэн Ўэбстэр, які жыў зь сяброўкай, што мела здольнасьць поглядам перасоўваць прадметы, а таму быў прызвычаены да нязвыклых зьяваў, доўга ня мог прыйсьці ў сябе, калі ўбачыў дзіўны тэкст на экране свайго кампутару. Увесь час зьяўляліся надпісы на мове, якую экспэрты прызналі аўтэнтычнай ангельшчынай XVI стагодзьдзя. Таямнічы карэспандэнт у больш чым 300 «сустрэчах» распавядаў сваю гісторыю. Яго звалі Томас Гардэн і ён быў прафэсарам унівэрсытэту ў Воксфардзе, зволены загадам караля Генрыка VIII за тое, што адмовіўся выкрэсьліваць імя папы з малітоўнікаў. Аднойчы са сьцяны выпаў да яго «нязвыклы пасланец», які ўручыў яму «сьвятлістую скрынку», напэўна, кампутар з маніторам, які аднак для ўсіх, акрамя яго, застаўся нябачны. Як спраўджана ў сьпісах прафэсараў Оксфарду, нейкі Томас Гардэн сапраўды выкладаў там у часы Генрыка VIII. Аднак у адзін красавіцкі дзень 1985 году на экране кампутара зьявіліся тэксты на сучаснай ангельскай мове. Кэн Ўэбстэр чытаў, ня верачы сваім вачам. «Прашу прабачэньня, але вы сьцьвярджаеце, што жывеце ў 1985 годзе. Думаю, што вы — з 2109 году, як той чалавек, які перадаў кампутар». Як вынікала з далейшых пасланьняў, у 2109 годзе, недзе ў іншым сьвеце, распачаты экспэрымэнт з часам, паводле якога ўсе нашыя ўяўленьні пра мінуўшчыну й сучаснасьць нагадваюць погляд навародка. У 1986 годзе кампутарны кантакт быў перарваны. А ці скончаны экспэрымэнт?

З друку.


Арганізацыя прапануе:


**цагельныя заводы,**

**ангары,**

**брокерскія паслугі**

Малдова, Кішанёў, тэл. 61-41-77.





аб'явы і рэкляму

Наша Ніва

*друкуе*

БЯСПЛАТНА




*З Новым Годам!*
Н.Н.

Падобна, што Чэслаў Мілаш
і парыская *Kultura*
атрымліваюць сталае мейсца
ў *Нашай Ніве.*
У другім нумары
мы надрукавалі развагі Мілаша
пра Кастуся Каліноўскага,
у трэйцім — пра гістарычнае права
беларусаў на Вільню...
Што рабіць,
калі нобэлеўскі ляўрэат
Чэслаў Мілаш —
бадай, адзіны аўтарытэт
такога рангу,
які пэрыядычна нагадвае сьвету
пра йснаваньне й правы беларусаў.
Хто яшчэ зробіць нам рэнамэ?..

Што такое
«Вялікае Княства Сіліцыянія»?
Гэта шматзначнае нішто,
памылка.
Некалі прыяцель
Тадэвуша Касьцюшкі
амэрыканец Томас Джэфэрсон,
складаючы
кароткую біяграфію сябра,
напісаў,
што Касьцюшка нарадзіўся
ў Вялікім Княстве Сіліцыяніі
(Grand Duchy of Sillicіania),
такім чынам зразумеўшы
неразборлівае ў даведках
слова Літуанія (Lithuania).
Памылка-заканамернасьць.
Сымболь невядомасьці
й таямнічасьці краіны,
якую сёньня мы называем
Беларусь.

# Адам Міцкевіч — жыд, паляк, летувіс, беларус...

*Урывак з эсэ «У Вялікім Княстве Сіліцыяніі»*

Чэслаў Мілаш

Цяжка паверыць, але неакрэсьленасьць дагэтуль спадарожыць размовам пра паходжаньне Міцкевіча. Гэтая неакрэсьленасьць адпавядае няпэўным этнічным падзелам у Вялікім Княстве, на памежжы Летувы й Беларусі. Прозьвішча Міцкевіч там такое ж звычайнае, як у Польшчы Кавальскі, і летувісы налічылі 640 радоў гэтага прозьвішча. Яны хацелі б бачыць Міцкевіча летувісам, аднак Наваградак заўсёды, здаецца, заставаўся па-за летувіскім этнічным абшарам, дык *Lietuviu Enciklopedija* падае, хоць ня ведаю, зь якіх крыніц, што прадзед Адама, Крыштап Рымвід Міцкевіч, які жыў у этнічна летувіскім раёне Радуні, пераехаў на Наваградчыну.

Этымалёгія прозьвішча таксама не дадае пэўнасьці. Каля Вільні ёсьць мяйсцовасьць Міцкуны, а летувіскі Міцкус, напэўна як і Мацкус, належаць да прозьвішчаў, утвораных зь іменаў — першае ад Зьмітра, другое ад Мацея. Тут мелі б ачко на сваю карысьць беларусы, бо калі Мацкус, а сьледам і Мацкевіч, узыходзяць да польскага Мацея, Міцкус выразна паходзіць ад Міцькі, таксама як Касьцюшка ад Косьці. З чаго відаць, як шчыльна спляліся там беларускія, польскія й летувіскія карані. Дзіўным загадам лёсу, калі пры камуністах даўні Унівэрсытэт Сьцяпана Батуры быў перайменаваны ва ўнівэрсытэт Капсукаса, па сутнасьці ён стаў унівэрсытэтам Міцкевіча, бо Капсукас — гэта літаратурны псэўдонім аднаго зь першых летувіскіх камуністаў, сапраўднае прозьвішча якога Міцкевіч.

Маці паэта, Барбара з Маеўскіх. Прафэсар Юлі Клейнэр у сваёй манумэнтальнай працы *Міцкевіч* спыняецца над сьведчаньнем Ксавэрыя Браніцкага, якое нарабіла шмат шуму. Браніцкі ў прадмове да «Брамы пакуты», якая ў перакладзе з габрэйскай выйшла ў 1879 годзе ў Парыжы, прывёў быццам бы словы Міцкевіча: «мой бацька з мазураў, маці мая Маеўская з выхрыстаў». Але з гэтых словаў не вынікала, што дзед ці нават прадзед паэта прывандравалі з мазурскіх земляў, гутарка магла йсьці хіба што пра старую калянізацыю, хоць тады звычайна сьлед захоўваўся ў прозьвішчах. Таксама і «з выхрыстаў» магло значыць, што не сама маці, але нейкія яе продкі былі ахрышчаныя. Так мяркуе прафэсар Клейнэр. Аднак жа хто бачыў тую заяву Браніцкага? Як яна гучала ў сапраўднасьці? М.Боссак у сваёй працы пра жыдоўскае паходжаньне Міцкевіча, выдадзенай у 1953 у Ізраілі (пра гэта паведамляе Самуэль Шэпс у кнізе *Adam Mickiewicz, ses affinites juives,* 1964), сьцьвярджае, што ў сьвеце захавалася ўсяго некалькі асобнікаў «Брамы пакуты», і што іх старанна скуплялі, каб зьнішчыць, асабліва спараднёны з Браніцкімі прафэсар Тарноўскі. А сказ, цытаваны Клейнэрам, гучыць быццам бы так: «Мой бацька быў мазурам, маці ж нядаўна навернутая. У выніку гэтага я напалову ляхіт (чую роспачны крык летувісаў), напалову ізраэліт, чым і ганаруся». Але ж каторая цытата слушная? Ці Клейнэр наўмысна зьмяніў яе, ці ўвогуле ня бачыў арыгіналу? Летувісы цягнулі ў свой бок, зьмяншаючы беларускасьць і роднага краю, і фальклёру, якім жывіўся Міцкевіч. Палякі заціралі жыдоўскія сьляды. На свой бок цягнулі й жыдоўскія дасьледчыкі. А дадзеныя з *Encyclopedia Judaica*, якія прыймаюць за даказанае, што быў жыдам, бо ад маці жыдоўкі, аж занадта сьведчаць пра жаданьне, каб яшчэ адзін вялікі чалавек належаў да жыдоў.

Сам Міцкевіч нідзе непасрэдна пра гэта ня згадвае (хіба што — «ад маці чужой», — што схіляла да домыслаў) і ўкладзенае ў ягоныя вусны знаёмцамі прызнаньне можа быць праўдай, а можа й ня быць. Нямецкі мэмуарыст Карл фон Фарнхаген прывёў словы Караліны Еніш, якая ў часе побыту Міцкевіча ў Расеі была ягонай (амаль) нарачонай, пасьля выйшла за Паўлава й займае сваё мейсца ў расейскай літаратуры як паэтка. Пасьля сьмерці Міцкевіча Паўлава быццам бы сказала: «Міцкевіч быў жыдам». Ці так было на самой справе, а калі так, дык чаму ён лічыў магчымым так сьцьвярджаць, калі ў той час нават жыдоўства па маці не было дастаткова, каб называцца жыдам? І ці можам мы верыць адпрэчанай даме сэрца? Мы ня ведаем нават, ці «жыд» для яе — гэта добра ці дрэнна.

Усялякія дасьледваньні такога роду страчваюць сэнс перад фактам, што ў Міцкевіча няма комплексу ці траўмы ад уласнага паходжаньня, і іх адсутнасьць мусілі б неяк вытлумачыць дасьледчыкі радаводу. Зрэшты, нават досыць нізкі грамадзкі статус ня надта яму перашкаджае, а калі мы прымем вэрсыю, што Марыля аддала перавагу графу, бо Міцкевіч быў убогі, дык і тады клясавая няпрыязь не адбілася на ягонай творчасьці. Што да жыдоў, то вядомыя сымпатыі Міцкевіча да «старэйшага брата Ізраіля» былі відавочныя, а шлюб з франкісткай Цэлінай Шыманоўскай і сувязь праз яе з уплывовай сям'ёю варшаўскіх франкістаў Валоўскіх ці Шораў тыя сымпатыі пацьвярджаюць.

Асабіста мяне продкі Міцкевіча ня надта абыходзяць. Ужо пасьля напісаньня гэтых нататкаў, я прачытаў кнігу Ядвігі Маўрэр *Ад чужой маці*, дзе сабраныя аргументы за жыдоўскае паходжаньне маці. Аўтарка згадвае, што ня толькі франкісты пераходзілі ў шляхецтва, бо ў Літве кожны ахрышчаны жыд быў набілітаваны, і бароніць сваю гіпотэзу пра такога вось выхрыста, сьціплага аканома Маеўскага ў маёнтку Узлоўскіх.

Уся гэтая спрэчка, так і ня скончаная за амаль дзьвесьце гадоў ад нараджэньня Міцкевіча, не пазбаўленая й гумарыстычных акцэнтаў, бо азначае папросту, што ў Вялікім княстве Сіліцыяніі цяжка вызначыцца. Мусіць, патрэбна было, каб тутэйшы вялікі паэт пазьбегнуў нацыянальных падзелаў і стаў прыкладам разнастайна пераплеценых генэалёгій.

*Kultura,* верасень 1991.

# *Міцкевіч — цынік?..*

Кніга Яна Вальца пра Адама Міцкевіча ("Architekt arki", 1991) выклікала бурную палеміку ў польскай прэсе. Аўтара абвінавачваюць у невуцтве і палітыканстве, яго адлучаюць ад паляністыкі. За што?

Міцкевіч, на думку Вальца, пад прыкрыцьцём літаратурнае творчасьці займаўся чыста палітычнымі інтрыгамі. Яго (Міцкевіча) поўная амаральнасьць выражаецца ў тым, што ён выкарыстоўваў міфатворчасьць ды іншыя модныя тады спосабы дурыць людзям галаву, хоць сам быў дарэшты асьвечаным вальтэрыянцам і па сутнасьці цынікам, больш цьвярозым нават, чым тое выпадала. Праўда, усё гэта раней не было выкрыта, але сёньня Вальц адхінае тыя кулісы.

«Можна не любіць і не разумець Міцкевіча, — піша *Gazeta Wyborcza,* — можна не любіць і не разумець рамантызму, можна не любіць і не разумець літаратуры. Але тады належыць тройчы спыніцца перад пісаньнем кніжкі на гэтыя тэмы. Можа так атрымацца, што праца тая будзе бойкай зь ценем, палемікай, у якой аўтар не дапускае, што пісьменьнік у тым, што піша, ня мусіць быць удзельнікам, што чалавекая істота бывае дваістая і што ёсьць у літаратуры нешта — як шматгалосьсе. Што, нарэшце, "маніпуляваньне дзеямі, традыцыяй і фактамі" ад часоў Вяргілія, Дантэ й Талстога ёсьць галоўным складнікам эпікі».

«Адкрыцьцё» Яна Вальца прымусіла крытыкаў прыгадаць часы сталінскага літаратуразнаўства і горка пашкадаваць, што колішні паляніст Вальц, які надоўга сыйшоў быў у палітыку ды займаўся ідэалягічным забесьпячэньнем антыкамуністычнага руху й Салідарнасьці, — што ён цяпер зноў вярнуўся да паляністыкі.

Падобна, што гісторыя з Вальцам — не ўнікальная гісторыя.

# Нобэль'91 у літаратуры

Гэтым разам ляўрэаткай прэміі Нобэля ў літаратуры стала **Надына Гардымэр** з Паўднёвае Афрыкі.

Гэтая прадстаўніца белае меншасьці вырасла ў атачэньні залатых капальняў шахцёрскага паўднёваафрыканскага места. Інтэлектуальныя схільнасьці не былі модныя ў ейным асяродзьдзі. «Экс-бізнэсмэны й работнікі адміністрацыі капальняў зь Яганэсбургу, якія пасьля выхаду з актыўнага жыцьця набылі сабе фэрмы, каб надаць сваёй бязьдзейнасьці нейкі выгляд прадуктыўнага йснаваньня, насілі белыя палатняныя строі ды стварылі атмасфэру рэспэктабельнага клюбу ў паселішчы, куды прыяжджалі па закупкі». Так там і жылі. Маладая пісьменьніца пачувалася зусім самотнай. Хіба што ейная жаноцкасьць, як яна лічыць, дапамагала ёй яднацца з навакольным жыцьцём. «Целам жыла разам з раўналеткамі, а духам — у самотнасьці». Яе кнігі «Напэўна ў нейкі панядзелак», «Сьвет чужых людзей», «Пах кветак і сьмерці», «Ганаровы госьць» — узнаўляюць экзатычныя краявіды Араніі, паўночнага і ўсходняга Трансвалю, Наталю, краіны Зулу, Бэчуаны, сьвет чорных, якія гуляюць у марабарабу, і белых, якія жывуць у бедных дамках на прадмесьцях ці ў пышных рэзыдэнцыях у фэшэнэбельных кварталах.

Кампанія непаслушэнства 1952 году забылася хутка. Ва «Узыходзе Афрыкі», апошнім з тамоў апавяданьняў «Пах кветак і сьмерці», белыя трымаюцца «сваіх клюбаў і дамкоў з гародчыкам на прадмесьці, чорныя — паселішчаў для тубыльцаў і піўных. Гэтыя людзі могуць пражыць тут усё жыцьцё ў спакоі, а на прыканцы перамясьціцца кожны на адвядзёныя яму клады». Такіх герояў мноства ў кніжках Н.Гардымэр. Але больш уражваюць постаці чорных і белых бунтаўнікоў, што стаяць з розных бакоў барыкады. Іхні бунт — гэта ня толькі агрэсыя й бойка. Гэта таксама ўпартае ймкненьне выйсьці з зачараванага кола, напрыклад, здабыць адукацыю, прызнаньне свае пазыцыі ў сфэры палітыкі й сацыяльных праблем.

«Усё, што я напісала, — гэта альтэрнатыўныя лёсы жыцьця, якое тым часам разьвівалася, а я пасьля мела магчымасьць спаткацца з дадзеным чалавекам ці сачыць за ягоным лёсам нават тады, калі ён надоўга зьнікаў з майго поля зроку».

Н.Гардымэр піша апавяданьні. «Напісаць кароткае апавяданьне, значыць, сродкамі літаратуры выцягнуць з унутранага ці вонкавага сьвету жыцьцядайную кроплю: поту, насеньня, сьлёз, сьліны, — якая імкліва пашырыцца на ўсю старонку».

Храналягічны парадак яе твораў становіцца парадкам гістарычным. Гэта Афрыка XX стагодзьдзя. Там свае, няісныя для нас, праблемы, і не існуе нашых. Такі закон існаваньня сьвету. Але Стары Сьвет ня хоча мірыцца з гэтым законам і чарговы раз надзяляе сваёй найбольшай увагай «няісную» Афрыку, даючы яе прадстаўніцы сваю найбольшую прэмію.

# Ганкуры'91

У лістападзе ў Парыжы прысуджаная найвышэйшая ўзнагарода Францыі за літаратурныя творы — Ганкураўская прэмія. Сёлета яе атрымаў **Pierre Combescot** за кнігу «Дочкі Кальварыі» ("Les filles du Calvaire").

Combescot — літаратурны крытык, журналіст і раманіст — быў адным зь пяці кандыдатаў. У ягонай кнізе, якая распавядае пра жыцьцё парыскіх рабочых, дзея адбываецца то ў зусім непрыстойным бары, то ў цырку, а каляртныя постаці герояў не саступаюць тым, якіх стварылі францускія раманісты XIX стагодзьдзя.

Намінальная вартасьць Ганкураўскае прэміі ўсяго 50 франкаў (каля 10 даляраў), але аўтар, які яе атрымае, звычайна выйграе на спрыяльным продажы свае кнігі, якая стала славутай. Рэкляма!



# Наталі Сарот

## Трапізмы

I

Быццам крынічныя ручаі, яны цяклі адусюль, нібы нараджаліся зь цёплага, трошкі волкага паветра, плылі, мякка, нібы сачыліся са сьцен, дрэваў, з лаваў, сквэраў, з бруднага тратуару.

Паміж нежывымі фасадамі дамоў яны выцягваліся доўгімі цёмнымі гронкамі, перад вітрынамі крамаў, сям-там зьбіраліся ў шчыльныя, нерухомыя згусткі, і часам пачыналі ціха круціцца, ціха, як вір, калі плынь натыкаецца на перашкоду.

Ад іх веяла [illegible] дзіўным спакоем, нечым накшталт безн[illegible]га, адчайнага задавальненьня. Яны [illegible] разглядалі стосы споднай адзёжы на Выста[illegible] бялізны, адмыслова складзеныя ў выглядзе сьнежных гор, ці ляльку, у якой вочы й зубы праз аднолькавыя інтэрвалы загараліся й гасьлі, загараліся й гасьлі, загараліся й гасьлі, увесь час праз тыя самыя інтэрвалы, зноў загараліся й зноў гасьлі.

Яны доўга глядзелі, стаялі тут, перад вітрынамі, нерухомыя, загіпнатызаваныя, як ахвяры, увесь час адкладаючы яшчэ на імгненьне той час, калі трэба будзе ісьці. І маленькія, ціхія дзеткі, што трымалі іх за руку, ужо стомленыя ад глядзеньня, няўважлівыя й цярплівыя, чакалі, стоячы каля іх.

II

Зь вялікаю неахвотай яны адрываліся ад люстраных шафаў, у якіх вывучалі свой твар. Яны падымаліся з ложкаў. «Сьнеданьне на стале, сьнеданьне на стале», — гукала яна. Яна зьбірала сям'ю на сьняданак. А яны хаваліся, кожны ў сваім бярлогу, нелюдзімыя, злосныя, змораныя. «Ды што гэта зь імі, чаму ў іх заўсёды такі зьнямоганы выгляд?» — казала яна, калі гаманіла з кухаркай.

Яна гаманіла з кухаркай гадзінамі, і завіхалася ля стала, увесь час завіхалася, раскладала ім порцыі, гаманіла й крытыкавала тых, што прыходзілі ў дом, іх сяброў: «... а ў той валасы яшчэ пацямнеюць, і будуць, як у яе маці, простыя; шанцуе, шанцуе тым, каму ня трэба рабіць пэрманэнт». «У паненкі прыгожыя валасы, — казала кухарка, — густыя, прыгожыя, хоць і не кучаравыя, праўда». «А той — я нават ня ўпэўненая, каб ён вам нешта пакінуў. Яны скупыя, усе скупыя, хоць і маюць грошы, маюць, вось што агідна. І нічога сабе не дазваляюць. Не, я гэтага не разумею, не». «О, што вы, — казала кухарка. — Ды не. Не зьнясуць жа яны іх з сабой. А іх дачка? Яна ж дагэтуль яшчэ ня замужам. А яна сымпатычная, у яе прыгожыя валасы, маленькі носік, і ногі — таксама зграбныя». «Але, але, прыгожыя валасы, што праўда, то праўда, — казала яна, — але яе ніхто не кахае, разумееце, яна не падабаецца. Вось ужо сапраўды дзіва!»

Ён адчуваў, як з кухаркі сачылася брудная, зашмальцаваная думка, і тапталася, і тапталася ўвесь час на адным мейсцы, увесь час на

*(Працяг на наступнай старонцы)*

## Ці толькі ў Сыбіры мы трымаемся разам?

Альгімантас Чакуоліс

**Летува-Беларусь,
сем стагодзьдзяў зьвязаныя
адным лёсам,
цяпер усё больш аддаляюцца
адна ад аднае.
Летува катэгарычна ня хоча
лучнасьці зь якім заўгодна
масквацэнтрысцкім саюзам,
у полі якога,
насуперак гістарычнаму досьведу
й патрэбам будучыні,
застаецца Беларусь.
Летува шукае спосабу сыйсьці,
а Беларусь шукае спосабу застацца.
І ці не найлепшы варыянт
для абедзьвюх — існаваць разам —
выглядае ўсё больш нерэальна.
Ідэя Балтыйска-Чарнаморскае
садружнасьці,
выказаная пару гадоў таму,
паступова страчвае
сваю актуальнасьць,
так і не дачакаўшыся
цэнтральнага зьвяна
гэтай садружнасьці —
незалежнае Беларусі.**

**Але куды сыходзіць Летува?
Як уяўляюць сабе гэты сыход
летувіскія палітыкі.
Пра гэта —
у вартыкуле
галоўнага рэдактара
газэты *Gimtasis Kraštas*
Альгімантаса Чакуоліса**

На агульных мітынгах у часе Балтыйскага шляху мы кляліся ў братэрстве трох Балтыйскіх краінаў. У вадзін кулак спляліся рукі трох братоў у жудасныя студзеньскія ночы. Але як толькі націск ворага спадае, кожны зноў ідзе палоць свае буракі.

Беспэрспэктыўныя, пагібельныя настроі й палітыка.

Найбольш з-за іх акупанту так лёгка было прыйсьці у нашыя краіны. У 20-я гады Францыя й Англія казалі кіраўнікам трох нашых дзяржаваў: стварыце малую Антанту. Дазвольце да яе прымкнуць Польшчы. Захад, вядома, меў свае рэзоны — яму быў патрэбны санітарны кардон супраць саветаў. Але ці ж нам было б кепска? Ды не, кожны глядзеў толькі на свой пуп.

Прычыны гэтага важкія й зразумелыя. Псыхалягічныя: 1) столькі марыўшы пра незалежнасьць, кожны хацеў, каб яна была «свая»; 2) у Савецкай Расеі была разруха, суседка выглядала слабой, акрамя таго, яна падпісала такія прыгожыя пагадненьні: «Адмаўляемся на ўсе часы...» Палітычныя: 1) Летува не магла мець нічога агульнага з Польшчай, якая адарвала Вільню; 2) Латвія й Эстонія пазьбягалі ўблытвацца ў гэты канфлікт. Дыпляматычныя: Саветы між тым, ці то разруха, ці не, а торкалі палкі ў колы. (Ведаў каршун, дзе індычкі выводзяцца). Эканамічныя: землляробчая Летува баялася, што яе зацісьне прамысловасьць Латвіі. Латвія — танных прадуктаў сельскай гаспадаркі і працоўнаі сілы Летувы, Эстонія наогул глядзела толькі на Фінляндыю й Швэцыю.

Зараз становішча падобнае. Але ня будзем падманваць сябе. Расея ніколі ня будзе слабая й было б супраць законаў прыроды, калі б яна ня стала багатай. Балтыйскія прыстані, гістарычная памяць Расеі, яе схільнасьць да Захаду заўсёды будуць штурхаць яе на нашыя землі. Паглядзіце, як аблудна напісаны ўказ аб прызнаньні. А калі гэтай зімой будзе голад, то новае, навучанае пакаленьне пучыстаў можа перамагчы.

Але 1990-я адрозьніваюцца ад 1920-х.

Ступень індустрыялізацыі ўсіх нас трох больш менш роўная, амаль няма паралельных прадпрыемстваў, г.зн. дапаўняем адзін аднога, а якасьць прадуктаў усюды аднолькава дрэнная.

Няма пытаньня Вільні, зусім няма праблемы межаў. З Польшчай мы можам сябраваць у любой форме, як з Чэхаславаччынай або Вугоршчынай.

Аднак найвялікшае адрозьненьне нашага часу тое, што краіны дэмакратычных прыватных ініцыятываў навучыліся сучаснай эканоміцы, на свае вочы ўбачылі, што, злучыўшыся эканамічна, яны адразу пачынаюць квітнець і нястрымана йдуць наперад. Найлепшы прыклад — агульны эўрапейскі рынак. Нябачаны росквіт ад Грэцыі да Нарвэгіі. Іспанія й Партугалія доўга чакалі, каб быць прынятымі, а калі гэта адбылося, дык за два гады непараўнальна падняліся. У свой агульны рынак толькі што злучыліся ЗША, Канада й Мэксыка. У свой — злучаецца Лацінская Амэрыка, яшчэ ў іншы — краіны Ціхага Акіяну. Зразумела, чаму гэта адбываецца. Згуртаваныя рэсурсы, магчымасьці для дынамізму, свой шырокі рынак для новага прадукту перад яго выхадам у канкурэнтную барацьбу — гэта нашмат лепш, чым зачыняць тыя сілы ў васобныя клеткі.

Наіўны скажа — дык далучаймася да агульнага эўрапейскага рынку. Нас ня прымуць яшчэ шмат, шмат гадоў. Там гульні дарослых людзей. Асацыяваным чальцом — так, але гэта зусім што іншае.

Тады, скажа, далучаймася да Паўночных краінаў. Па-першае, гэта не эканамічны саюз, па-другое, яны будуць нас гладзіць па галоўцы, прыгожа гаварыць, але таксама ня прымуць.

Пра савецкі блёк ня варта й казаць. Дамовы — так, блёк — не. Група былых сацыялістычных краінаў яшчэ толькі думае, зь імі будзем супрацоўнічаць, але там таксама будзем маленькія й ня вельмі патрэбныя.

Калі ж мы хочам захаваць і ўмацаваць незалежнасьць, ня быць жабракамі, нашае выйсьце толькі адно — Балтыйская канфэдэрацыя.

Так, скура з усіх нас злупленая, і нас трасе ад аднаго слова «саюз». Хочацца спакойна пажыць у сваім двары пад сваім клёнам. Толькі бяда, што беднасьць тут, і ў гэты двор лёгка ўпаўзае танк.

## Наталі Сарот

### Трапізмы

мейсцы, круцілася ваўчком, ваўчком, нібы ў іх круцілася ў галаве, а яны не маглі спыніцца, нібы ім было млосна, а яны не маглі спыніцца, як тады, калі грызеш пазногці, як тады, калі кавалкамі абдзіраеш скуру, калі абгарэў, як тады, калі чухаесься, калі крапіўная ліхаманка, як тады, калі круцісься ад бяссоньня ў ложку — каб было прыемна й адначасна — балюча, пакуль ня зможасься, пакуль ня зойме дыханьня...

«А можа, у іх усё іначай», — думаў ён, і прыслухоўваўся, лежачы ў ложку, а іхняя думка, нібы клейкая сьлізь, зацякала ў яго, ліпла, напаўняла яго зьсярэдзіны.

Рабіць не было чаго. Не было чаго. Унікнуць было немагчыма. Паўсюль, у самых розных выглядах, — «здрада» («А сонейка сёньня здрадлівае, — казала кансьержка, здрадлівае, толькі й чакай, што падхопіш хваробу. Вось так і мой муж, нябога, аж ён за здароўем глядзеў...»), паўсюль «здрада», нават у выглядзе самога жыцьця, праглынае зьлёту — калі прабягаеш паўз кансьержчын закутак, калі адказваеш па тэлефоне, калі сядзіш за сямейным сьняданкам, запрашаеш сяброў, пачынаеш гаворку з кім-небудзь.



Ім трэба адказваць, падбадзёрваць іх, мякка, ласкава, і галоўнае — галоўнае не даваць ім адчуць, не даваць ні на імгненьне адчуць, што лічыш сябе інакшым. Гнуцца, гнуцца, скручвацца ў нуль: «Але, але, так, так, праўда, вядома», — вось што ім трэба казаць, і глядзець прыязна, пяшчотна, іначай — усё паляціць, паламаецца, разьдзярэцца, здарыцца нешта зусім нечаканае, жудаснае, нешта такое, чаго аніколі яшчэ не было, і гэта будзе жахліва.

Яму здавалася, што тады, у раптоўным прыліве дзейнасьці й сілы, ён іх страсяне на ўсю моц, як старыя завэдзганыя анучы, скруціць, разьдзярэ й зьнішчыць ушчэнт.

Але, адначасна, ён ведаў, што такое ўражаньне, вядома, падманлівае. Раней, чым ён пасьпее да іх наблізіцца — яны, з тым беспамылковым абаронным інстынктам, з тою гнуткай жывучасьцю, у якой крыецца іх небясьпечная сіла, павернуцца да яго і — ён нават сам ня ведае як — адразу заб'юць.

### III

Некалі яны прыехалі сюды й пасяліліся недзе на гэтых маленькіх спакойных вулачках, што за Пантэонам, можа на вуліцы Гэй-Люсака, а можа й на Сэн-Жак, у кватэры з вокнамі, што выходзяць на цёмны двор, але даволі прыстойнай, з камфортам.

Тут яны маглі сабе гэта дазволіць, гэта — і свабоду рабіць, што захочуць, хадзіць, дзе захочуць, у любых, самых нязграбных строях, зь любым выразам на твары, гуляць па гэтых ціхіх маленькіх вулачках.

Тут ад іх не патрабавалі ніякага ўменьня трымацца, ні супольнасьці зь іншымі, ніякіх пачуцьцяў, ані ўспамінаў. Ім гарантавалася забясьпечанае й адначасова пустое жыцьцё, падобнае да жыцьця пачакальні на бязьлюднай прыгараднай станцыі, голай, шэрай і цёплай, з драўлянымі лавамі ўздоўж сьцен і чорнаю печчу пасярэдзіне.

І яны былі задаволеныя, ім падабалася тут, яны адчувалі сябе амаль як дома, былі ў добрых адносінах з пані кансьержкаю, з малочніцай, аддавалі адзеньне ў чыстку, у самую добрасумленную й самую танную пральню ў квартале.

Яны ніколі не стараліся прыгадаць тую вёску, дзе некалі гулялі ў дзіцячыя гульні, ніколі не стараліся ўспомніць тыя колеры й пахі таго мястэчка, у якім расьлі, яны ніколі не адчувалі, каб у іх раптам узьнік, — калі яны крочылі па вуліцах свайго кварталу, разглядалі крамныя вітрыны, пачціва віталіся з кансьержкаю, праходзячы міма яе закутка, яны ніколі не адчувалі, каб у іх памяці ўсплыў той родны мур, за якім кіпела жыцьцё, ці брук на двары, магутны й адначасова пяшчотны, ці ласкавыя прыступкі на ганку, дзе яны сядзелі ў дзяцінстве.

На лесьвіцы ў сваім доме яны часам сустракалі «суседа зьнізу», выкладчыка ліцэю, што вяртаўся пасьля заняткаў, а чацьвертай гадзіне, з дваімі сваімі дзецьмі. Ва ўсіх траіх у іх былі доўгія галовы з бясколернымі вачыма, гладкія й бліскучыя, як вялікія касьцяныя яйкі. Дзьверы іхняй кватэры на імгненьне крыху адчыняліся й прапускалі іх усярэдзіну. Было відаць, як яны ступаюць на маленькі лямцавы кабэрац на паркеце каля ўваходу — і моўчкі зьнікаюць у цёмнай глыбіні калідору.

### V

Сьпякотнымі ліпеньскімі днямі сьцяна насупраць скідала ў маленькі ссырэлы двор цяжкае й рэзкае сьвятло.

Пад гэтаю важкай гарачынёю ўтваралася пустая, бяздонная прорва, і цішыня, і ўсё нібы завісала, чулася толькі пранізьлівае, агрэсыўнае скрыгатаньне крэсла па кафлянай падлозе, бразганьне дзьвярэй, і раптам, у гэтай гарачыні, у гэтай цішы — нечаканы холад, шчымлівая туга.

Яна ляжала й не варушылася, на самым краёчку ложка, стараючыся займаць як мага менш мейсца, напружаная, нібыта чакаючы, што зараз нешта выбухне, нешта наваліцца на яе з гэтай пагрозьлівай цішыні.

Часам такое пачуцьцё ўзьнікала ад сакатаньня цыкадаў у скамянелай пад сонцам, нібыта мёртвай прэрыі — пачуцьцё холаду, самоты, пакінутасьці ў цэлым варожым сьвеце, дзе рыхтуецца нешта трывожнае.

І тады ляжыш, нерухомы, у траве, пад пякучым сонцам, прыслухоўваесься, і чакаеш.

Яна чула, як скрозь цішыню, паўз старыя, у сінюю палоску шпалеры ў калідоры, паўз пакрытыя бруднаю фарбай сьцены, да яе далятае шоргат ключа ў замочнай шчыліне. Яна чула, як зачыніліся дзьверы ў кабінэт.

Яна ляжала, па-ранейшаму скурчаная, і нерухома чакала. Найменшы рух — пайсьці ў лазенку вымыць рукі, пусьціць з крану ваду — здаваўся ёй дзёрзкім выклікам, раптоўным скачком у прорву, учынкам, поўным адвагі. Такі нечаканы шум адкрытай вады ў гэтай навіслай цішы быў бы як сігнал, як заклік да іх, як той непрыемны дотык, калі кончыкам палкі дакранаесься да мэдузы й потым з агідай чакаеш, як яна скаланецца і зноў распаўзецца.

Яна адчувала, што й яны, выцягнуўшыся, нерухома ляжаць за сьцяной і гатовыя ў любы момант ускінуцца, заварушыцца.


Яна не варушылася. І здавалася, увесь дом, уся вуліца, — ухваляюць яе, лічаць гэтую нерухомасьць зусім натуральнай.

Здавалася абсалютна бясспрэчным, што, адчыніўшы дзьверы й зірнуўшы на лесьвіцу, зь якой веяла непарушнай, безасабовай і бясколернай супакоенасьцю, лесьвіцу, на якой, здаецца, не заставалася ні ценю людзей, якія па ёй прабягалі, нават — каліва ўспаміну пра іхнія сьляды, здавалася, што, стоячы ля вакна й гледзячы на фасады дамоў, лаўкі, старых кабетаў і дзяцей, што праходзяць па вуліцы, трэба як мага долей — чакаць, стаяць вось так, нерухома, не рабіць нічога, не варушыцца, бо найвышэйшае разуменьне, сапраўдная мудрасьць — якраз і ёсьць: варушыцца як мага меней, не рабіць нічога, бязьдзейнічаць.

Самае большае — можна было зь вялікай перасьцярогай, каб не пабудзіць нікога, спусьціцца па змрочнай і мёртвай лесьвіцы й ціха рушыць па вуліцы, уздоўж сьцен, каб крыху падыхаць, каб парухацца, ня ведаючы, куды йдзеш, не жадаючы нікуды йсьці, а потым вярнуцца дадому, сесьці на край свайго ложку ды зноў, схіліўшыся, нерухома чакаць.

### VI

Кожную раніцу яна ўсхоплівалася з ложку раней за іншых і бегала па кватэры, заўсёды незадаволеная, крыклівая, зьедлівая, размахваючы рукамі, задыхаючыся ад абурэньня, гатовая ў любы момант учыніць «сцэну». Яна адзін за адным абходзіла ўсе пакоі, урывалася на кухню, гнеўна грукала ў дзьверы занятае некім лазенкі, ёй паўсюль рупіла ўлезьці, кіраваць, страсянуць іх, спытаць, колькі яны зьбіраюцца там сядзець — гадзіну? — нагадаць, што ўжо позна, што яны спозьняцца на трамвай ці на цягнік, што ўжо вельмі позна й яны са сваёй нехлямяжасьцю, з падобным сваім нядбайствам абавязкова некуды не пасьпеюць, што сьняданак даўно гатовы, што ён даўно ўжо астыў, што ён дзьве гадзіны як на стале і ўжо абярнуўся ў лёд. І здавалася, у яе вачох няма нічога больш вартага пагарды й больш невычэрпнага, больш дурнога й больш брыдкага, што няма больш яўнае прыкметы нізасьці, прыкметы слабасьці, чым прымусіць астыць, прымусіць чакаць сьняданак.



Ніякага «саюзу» мы ня бачылі. Нас білі, стралялі, вывозілі, а называлі гэта прыгожым словам.

Балтыйская канфэдэрацыя, або Агульны рынак (садружнасьць) мусіць абапірацца на наступныя прынцыпы:

1. Палітычная незалежнасьць кожнай дзяржавы; абраныя народам прэзыдэнт, парлямант, імі назначаны ўрад; свае ўзброеныя сілы й паліцыя; Вярхоўны Суд, Міністэрства ўнутраных спраў; свая сістэма адукацыі, пошты, чыгунак і падобнага; усеагульнае ўзбраеньне грамадзянаў па прыкладзе саюзу стральцоў. Агрэсыя супраць аднаго чальца садружнасьці роўная агрэсыі супраць усёй садружнасьці.

2. Рада садружнасьці, якая складаецца з аднолькавай колькасьці прадстаўнікоў кожнай дзяржавы, мае паўнамоцтвы арганізаваць агульнае і прапарцыйнае дыпляматычнае чалецтва садружнасьці за мяжой (выключаючы ААН), кіраваць агульнай абаронай і дыслякацыяй нацыянальных узброеных сілаў, як гэта робяць краіны НАТО, усюды ў трох дзяржавах забясьпечыць свабоду дзеяньняў усіх грамадзянаў садружнасьці.

3. Межы паміж трыма дзяржавамі пазначаныя, сьвятыя й зусім вольныя для руху грамадзянаў, тавараў, грошай.

4. У кожнай дзяржаве свая грашовая сістэма. Літ, лат і крона абменьваюцца між сабой 1 : 1 у неабмежаванай колькасьці, без адлічэньняў банку, апэрацыі якога аплочваюцца зь бюджэту. Эмісыя — толькі пры аднагалоснай згодзе.

5. Кожная краіна можа выйсьці абы калі — з заявай свайго парляманту, папярэдзіўшы партнэраў пра выхад за дванаццаць месяцаў.

Ці трэба казаць, што гэта адзіны шлях, які мы маем? Што ўсе астатнія — сабачыя сьцежкі?

Утрыманьне сьціплага пасольства за мяжой каштуе найменш 0,5 млн даляраў на год, а дом трэба купіць. Яшчэ 2-5 мільёнаў. Маючы каля 30 пасольстваў, трэба плаціць 15 млн. у год. Для трох краінаў — 45 млн.

Схапіўшыся за галовы, мы шукаем, дзе будаваць нафтавую прыстань Летувы. Для пачатку гэта абыйдзецца ў 40 млн даляраў і, дзе б не пабудавалі, прывядзе да забруджваньня асяродзьдзя. А Вентспілс і Ліепая будуць бяз працы.

Мы павінны вырабляць невялікія трактары для гаспадароў, невялікія камбайны, бульбакапалкі і г.д.

Мы ў вадзіночку вынаходзім ровар, і не шанцуе. Дамо пазыку аб'яднаньню прыватызаваных прадпрыемстваў трох дзяржаваў, той хто прапануе найлепшыя ўмовы на абвешчаным банкам (не Ўрадам) конкурсе, той і пачне праз паўгода працаваць. Тут падбягуць Фэргюсон і Таёта, прапануючы маньціраваць свае машыны, вырабляць кампанэнты, пасьля пярэймуць усю вытворчасьць, прынясуць капітал. Усюды, дзе зьяўляецца шырэйшы рынак, яны прыбягаюць кумяльгом.

Мы дзеці зямлі. Умеем лічыць, што й за колькі. Але ёсьць рэч, грашыма вылічыць якую немагчыма. Гэта незалежнасьць. Лінію Манэргэйма, як фіны, мы не збудуем. Наша мяжа з Усходам вельмі доўгая, дый што тыя лініі цяпер абароняць!

Будучы садружнасьцю з 8 мільёнамі чалавек, мы становімся ў Эўропе дзяржаўнаю адзінкаю сярэдняга памеру. Да такой і кіпцюры выпускаць цяжэй. І такую можна прыняць у большае абаронча аб'яднаньне.

Канфэдэрацыя — ня толькі спосаб устаць на ногі й выпрастацца. Нямеччына й Францыя, ворагі ў вапошнюю тысячу гадоў, — аб'ядноўваюць свае індустрыі. Тэлевізары Даніі вырабляюць італійцы. Ва ўсёй Заходняй Эўропе касуюцца мытні, у хуткім часе не застанецца і паліцэйскіх-памежнікаў. Дзяржаўныя межы застануцца. З Новага году будзе адзіная грашовая сістэма. Гэта ўнівэрсытэт сучаснай палітыкі й эканомікі. Калі мы ня хочам, каб хваля дабрабыту й волі спынілася ў Лазьдзіяй (пункт на мяжы Летувы з Польшчай), то мусім ужо цяпер ісьці ў пачатковую школу.

Добра, што нашыя лідары ўжо глядзяць у гэтым кірунку. Дарэчы іх нядаўняе мала заўважанае падарожжа ў Брусэль, дзе яны знаёміліся са структурай садружнасьці, яе перавагамі й вопытам. Дасьведчаныя палітыкі Захаду — нашы сябры — выхавана раяць тое самае. Яны кажуць: вы паказалі рашучасьць, баронячы незалежнасьць? Пакажыце сталасьць, баронячы яе й пакажыце глыбіню палітычнага мысьленьня.

Грамадзтва павінна падтрымаць гэтую тэндэнцыю.

Нам спатрэбіцца шмат цярплівасьці, шмат паблажлівасьці, уменьня йсьці на кампрамісы. Будзе цяжка. Вельмі. Але ўсё іншае цяжэй. Лянівы пазяхне, пашкрабецца: «А навошта мне гэта трэба? Ёсьць гарэлкі, сала й цыбулі? Дык і хопіць». Ён будзе шукаць вінаватых, калі абудзіцца ў цялячым вагоне.

Пераклад зь летувіскае К.Б.

Тыя, хто ўсё гэта ведаў, — дзеці — стараліся не спазьняцца. Але іншыя, бесклапотныя й няўважлівыя да падобных рэчаў, ня ведаючы ўсёй іх магутнасьці ў гэтым доме, прыязна адказвалі, вельмі ласкавым і натуральным тонам: «Вялікі дзякуй, але не хвалюйцеся, я з задавальненьнем вып'ю і трошкі астылай кавы». Гэтым, чужым, яна не насьмельвалася нічога адказваць, але за адно гэтае слова, за адну гэтую караценькую ветлівую фразу, якой яны мякка, нібы паміж іншым, адштурхоўвалі яе, не зьвяртаючы нават увагі, ні на імгненьне не спыніўшы на ёй свайго позірку, ужо за адно гэта яна пачынала іх ненавідзець.

Рэчы! Рэчы! Гэта была яе сіла. Крыніца яе магутнасьці. Інструмэнт, якім яна інстынктыўна, бясхібна й беспамылкова карысталася, каб перамагаць, пляжыць усіх і ўся.

Тыя, хто жыў побач зь ёю, адчувалі сябе вязьнямі рэчаў, рабамі, сагнутымі пад іх цяжарам, зьмярцьвелымі й прыгнечанымі, увесь час пільнаванымі й цкаванымі імі.

Рэчы. Прадметы. Званкі. На іх ніколі нельга было забывацца, нельга было прымусіць чакаць. Яна карысталася імі, як зграяй сабак, якую напускала на іх штохвіліны: «Звоняць! Звоняць! Хутчэй, варушыцеся, вас жа чакаюць!»

І нават калі яны сядзелі ў схованцы, зачыніўшыся ў сваім пакоі, яна прымушала іх сьцепануцца: «Вас там спытваюць! Вы што — ня чуеце? Тэлефон. Дзьверы. Адкуль пройма? Вы не зачынілі дзьверы, дзьверы на лесьвіцу!» Гахала вакно. Грукалі дзьверы. Парыў ветру пралятаў па кватэры. Трэба было бегчы, хутчэй, пад праклёнамі, спатыкаючыся, устрывожана, усё кінуць і бегчы, з гатоўнасьцю дагадзіць.

## VIII

Побач з гэтымі сьвежымі, гэтымі юнымі йстотамі, побач з гэтымі бязьвіннымі чалавечкамі, у яго заўсёды ўзьнікала жаданьне, хваравітая, неадольная патрэба — узяць іх у свае неспакойныя пальцы, пакруціць, памацаць, наблізіць як мага больш да сябе, зрабіць іх сваімі.

І калі яму выпадала йсьці з кім-небудзь зь іх на вуліцу, весьці каго-небудзь зь іх прагуляцца, ён браў маленькую ручку і, пераходзячы на другі бок дарогі, моцна сьціскаў яе ў сваёй цёплай, сваёй дужай руцэ, стрымліваючыся, каб не раздушыць гэтых малюпасенькіх пальчыкаў, калі яны пераходзілі на той бок вуліцы ды зь бязьмежнаю асьцярогай глядзелі спачатку налева, потым направа, каб упэўніцца, што перайсьці насьняваюць, пераканацца, што ніякай машыны няма, каб ягонае золатка, яго мілае дзіцятка, гэтая маленькая жывая істота, кволая й такая даверлівая, за якую ён нясе такую адказнасьць, не была раздушаная пад коламі.

І, пераходзячы вуліцу, ён вучыў яго, што трэба спачатку доўга счакаць, і быць уважлівым, уважлівым-уважлівым, быць вельмі-вельмі ўважлівым, калі пераходзіш вуліцу, нават па пераходзе, бо «трэба так мала, досыць усяго сэкунды няўвагі, каб здарылася непапраўнае».

І яшчэ ён любіў гаманіць зь імі пра свой узрост, свой стары век, і пра сваю сьмерць. «Што ты скажаш, калі ў цябе ня стане дзядулі, ня будзе твайго дзядулі, бо ён старэнькі, ведаеш, вельмі старэнькі, і хутка яму прыйдзе пара паміраць. Ведаеш, што робяць, калі памруць? А ў яго ж таксама, у твайго дзядулі, у яго была мамачка. А? Дзе яна цяпер? Эх-эх, дзе яна цяпер, мой даражэнькі? Пайшла. Няма болей мамачкі, яна даўно ўжо памерла, ягоная мамачка, пайшла, няма яе больш, усё, памерла яна».

Паветра было шэрае й нерухомае, бяз пахаў, абапал вуліцы высіліся будынкі, роўныя, крэпкія й змрочныя гмахі, што абступалі іх, калі яны павольна рушылі па тратуары, трымаючыся за ручкі. І малое адчувала, як нешта душыць, цісьне, скоўвае яго. Нешта мяккае й задушлівае, што яго абавязкова змушалі прыняць, увабраць, пад ласкавым і няўмольным націскам, зьлёгку затуляючы яму нос, каб ён праглынуў, каб ня здолеў супраціўляцца, — і гэтае нешта пранікала ў яго, пакуль малое, дробна й паслухмяна тэпала па тратуары, пакорліва трымаючыся за руку, вельмі разумна, згодна ківаючы галавой і слухаючы, як яму тлумачаць, якім заўжды трэба быць асьцярожным, калі пераходзіш, і глядзець — налева, направа, — і быць вельмі ўважлівым, каб ня здарылася непапраўнае, калі пераходзіш па пераходзе.

## XI

Яна выведала сакрэт. Вынюхала, дзе хаваецца тое, што павінна лічыцца — для ўсіх — сапраўдным багацьцем. Цяпер яна ведала «шкалу вартасьцяў».

Зь ёю — ніякіх размоў пра транты, пра розныя там капялюшыкі ад Рэмона. Чаравікі з тупымі насамі выклікалі ў яе пагарду.
Нібыта макрыца, яна неўпрыкмет падкралася да іх і — каварна, як котка, якая, мружачы вочы, аблізваецца перад здабытым гарнушкам сьмятаны, — падслухала, дзе, у чым яна, «самая сапраўдная ісьціна».

Цяпер яна ведала. Яна ўжо не адступіцца, яе не саб'юць. Яна слухала, убірала ў сябе, прагная, няўтольная, хцівая. Нішто, нішто, што належала ім, не павінна было выпасьці з-пад яе ўвагі: карцінныя галярэі, сьвежыя кнігі... Яна ўсё гэта ведала. Яна пачынала зь «Летапісаў», цяпер пераходзіла ўжо да Жыда, а хутка — будзе хадзіць у «Саюз за Праўду» і, зь пільным, панадлівым позіркам, — натаваць, натаваць.

Паўсюль, дзе толькі можна было нешта знайсьці, яна рыскала, нюхала, перабірала й мацала ўсё сваімі пальчыкамі з абстрыжанымі пазногцямі, і як толькі дзесь цьмяна заходзіла пра гэта гамонка — вочы ў яе запаляліся й прагавіта выцягвалася шыя.

Іх усё гэта невыказна гідзіла. Схаваць ад яе — хутчэй! — пакуль не пасьпела пранюхаць. Стаіць, ня даць датыкнуцца — яе дотык усё прыніжае... Але позна — яна ўжо ведала, яна руйнавала іх пляны. Ад яе немагчыма было схаваць касьцёл у Шартры. Пра яго яна ведала ўсё. Яна нават чытала, што пра яго думаў Пэгі.

Яна лезла паўсюль сваімі сквапнымі пальцамі, у самыя патаемныя закуткі, у самыя непадступныя скарбы. Уся зь сябе — «інтэлігентнасьць». Ёй гэты было неабходна. Ёй. Бо цяпер яна ведала сапраўдную цану рэчам. Ёй патрэбная была інтэлігентнасьць.

Іх было шмат, такіх як яна — згаладалых, бязьлітасных паразітаў, п'явак, што адразу накідваліся на кожны новы артыкул, сьлімакоў, што прыліпалі паўсюль, пэцкаючы сваёй сьлізьзю Рэмбо, смокчучы Малярмэ, кідаючыся ад аднаго да другога й душачы сваёй клейкаю, брыдкаю кемлівасьцю «Уліса» ці «Мальтыйскія дзёньнікі» Лаўрыдса Брыгге.

«Як гэта чароўна!» — казала яна і, зь непадробнай натхнёнасьцю распальваючы вочы, запальвала ў іх «боскую іскарку».

## XIV

Яна заўсёды маўчала, ціха сядзела ў куточку, сьціпла схіліўшыся, лічучы шапатком — яшчэ накід, дзьве пяцелькі направа, тры налева, цяпер направа ўвесь радок, — такая жаноцкая, непрыкметная (не зьвяртайце ўвагі, мне тут вельмі добра, мне нічога ня трэба) — але яны ўвесь час адчувалі, чулі яе прысутнасьць.

Яны ні на хвіліну ня зводзілі зь яе вачэй, як загіпнатызаваныя, з прыхаваным страхам сачылі за кожным словам, кожнай ледзь прыкметнай зьменай інтанацыі, самым лёгкім яе адценьнем, за кожным рухам, за кожным позіркам; яны хадзілі на дыбачках, азіраючыся на ўсякі выпадак — бо яны ведалі: тут паўсюль таямнічыя пасткі, да якіх нельга ані падыходзіць, ані дакранацца, інакш, пры самым найменшым дотыку, — званочкі, як у казцы ў Гофмана, тысячы маленькіх званочкаў, з чыстымі, нібыта дзявочымі галасамі, — закалоцяцца, зазьвіняць.

Але часам, ня гледзячы на ўсе перасьцярогі, на ўсе намаганьні, калі яны бачылі, як яна, нібы крохкая й кволая падводная расьліна з рухавымі, натапыранымі ва ўсе бакі атожылкамі, ціхутка сядзіць пад сьвятлом, што спадае ад лямпы, яны адчувалі, што пачынаюць сьлізгаць, пачынаюць падаць усім цяжарам, падмінаючы пад сябе ўсё, і тады зь іх так і лезла — бязглуздыя досьціпы, кпіны, жудасныя гісторыі пра канібалаў — усё гэта так і лезла, і яны не маглі сябе стрымаць. А яна млява скурчвалася — ах! як гэта жахліва! — яна ўспамінала пра свой пакойчык, свой мілы прытанак, дзе можна схавацца, дзе яна ўкленчыць на кабэрчыку каля ложка, у глухой палатнянай сароцы пад самае горла, такая па-дзіцячаму шчырая, па-дзіцячаму чыстая, — Тэрэза зь Лізьё, сьвятая Кацярына, Бляндына... — і сьціскаючы ў пальчыках залаты ланцужок на шыі, памоліцца за ўсе іх грахі



(Працяг на наступнай старонцы)

# Тлумачэньне Дастаеўскага

*Абяцаны артыкул*

С.Д.

Фёдар Дастаеўскі з паходжаньня беларус. Гэта так. Але прыўлашчыць знакамітасьць альбо прыўлашчыцца да яе — яшчэ ня значыць адбыцца. Тым больш, што некалькі цытатаў з Дастаеўскага пра беларускі народ і літоўскую дрыгву, а таксама кнігі Літоўскае мэтрыкі са шматлікімі продкамі — ягонымі й нашымі ад 16-га стагодзьдзя — ніяк не высьвятляюць, якім чынам памяць роду й памяць генаў адбілася ў ягоных творах. І ў нашых душах.

Мы маглі б задаволіцца простай канстатацыяй беларускага паходжаньня чужога генія толькі ў тым разе, калі б за апошнія 150 гадоў самі адарваліся ад гэтага «з паходжаньня», пайшлі. Цяпер жа — вось станоўчы бок нашага адмоўнага становішча — у нас ёсьць магчымасьць зразумець Дастаеўскага лепш, чым тады, калі б мы ўжо адказалі на сваё нацыянальнае пытаньне, адбыліся.

І першае тут агульнае — мова. Мова, якой няма, але...

Пры ўсёй незвычайнасьці стылю Дастаеўскі даволі лёгка перакладаецца на беларускую мову. Некалі я нават выпісваў зь яго беларускія, як мне здавалася, словы: *кутья; лядащий; цугундер; я скитался за казармами, смотрел, отсчитывая их, на пали крепкого острожного тына*.. У яго амаль няма дзеепрыметнікаў. Пішу «амаль» не таму, што падлічваў. Проста не заўважаў чытаючы.

Хто ведае, можа, стыль Дастаеўскага таму й здаецца незвычайным, што лёгка перакладаецца на беларускую мову?..

Між тым, беларускай мовы Дастаеўскі ня ведаў. Вось адно толькі сьведчаньне: «ОБРАЗИТЬ — словцо народное, дать образ, восстановить в человеке образ человеческий».

Другая агульнасьць. Як гэта ня дзівіць, а генэтычнае паходжаньне Дастаеўскага выявілася ў ягоных развагах пра нацыянальнае. Якраз тут, на маю думку, ён найлепш ідэнтыфікуецца з сучасным беларусам. Дакладней, беларус ідэнтыфікуецца зь ім. А дзівіць таму, што сам Дастаеўскі дзесяткі разоў назваў сябе рускім, вялікарускім патрыётам, мацёрым славянафілам. Ды ці ня гэткі й наш сучасны беларус? Той, «пашпартны» беларус, які без ваганьняў называе сябе рускім?

У справе Расеі й рускасьці рацыянальны этык Дастаеўскі ператвараецца ў ірацыянальнага маралізатара.

«Но, однако, в чем выгода России? Выгода России именно, коли надо (*Падкрэсьлена мною.* — С.Д.), пойти даже и на явную невыгоду, на явную жертву, лишь бы не нарушить справедливости. Не может Россия изменить великой идее, завещанной ей рядом веков и которой следовала она до сих пор неуклонно. *(Зьвярніце ўвагу на гэты «гістарызм», мы яшчэ вернемся да яго).* Эта идея есть, между прочим, и воссоединение славян; но воссоединение это — не захват и не насилие, а ради вселужения человечеству *(лёгіка «железная»).* Да и когда, часто ли Россия действовала в политике из прямой своей выгоды? Не служила ли она, напротив, в продолжение всей петербургской своей истории всего чаще чужим интересам с бескорыстием, которое могло бы удивить Европу, если бы та могла глядеть ясно, а не глядела бы, напротив, на нас всегда недоверчиво, подозрительно и ненавистно. Да бескорыстию в Европе и вообще никто и ни в чем не поверит, не только русскому бескорыстию, — поверят скорее плутовству и глупости. Но нам нечего бояться их приговоров: в этом самоотверженном бескорыстии России — вся ее сила, так сказать, вся ее личность и все будущее русского назначения. Жаль только, что сила эта иногда довольно-таки ошибочно направялась».

Апошні сказ у гэтай цытаце — пробліск ratio, магчыма, выпадковы. Дастаеўскі, канкрэтны й лягічны ў прыватнасьцях, пераходзячы да рэчаў агульных — Расеі, Эўропы, чалавецтва, зусім ня часта завяршае свае працяглыя эмацыйныя сэнтэнцыі гэткім цьвярозым сумлівам. Часьцей наадварот.

«Повторяю: судите русский народ не по тем мерзостям, которые он так часто делает, а по тем великим и святым вещам, по которым он и в самой мерзости своей постоянно воздыхает... Нет, судите наш народ не по тому, чем он есть, а по тому, чем желал бы стать».

Нібы самі эмоцыя й ratio — процілеглыя два Дастаеўскія: той, які зьяўляецца аўтарам працытаваных радкоў, і той, які аналізуе судовыя працэсы й ніколі ня стане аспрэчваць ісьціну пра тое, напрыклад, што няведаньне законаў не пазбаўляе ад адказнасьці. Такім чынам, Дастаеўскі мае дзьве акрэсьленыя й часта процілеглыя праўды — для Расеі й для асобна ўзятага канкрэтнага чалавека.

Напэўна, гэта й ёсьць той самы парадокс Дастаеўскага, які ажыўляе, адухоўлівае творчасьць пісьменьніка.

Славянафільства Дастаеўскага нельга атаясамліваць з славянафільствам сучасных расейскіх патрыётаў. У двух гэтых славянафільстваў розныя прычыны й тлумачэньне.

Справа ў тым, што калі Дастаеўскі-практык абапіраецца на канкрэтныя сітуацыі, на ўласны досьвед, а нават і на законы крыміналістыкі, дык Дастаеўскі-ідэоляг — на грамадзкі настрой, на ідэю, на інтарэсы афіцыйнае ўлады (ён ужо й па ўзросьце лібэрал).

«Ввиду горячего патриотического настроения народа... ввиду пламенной и благоговейной веры народа в своего царя...»

Сучасныя расейскія славянафілы, апрача свайго славянафільства, ня маюць нічога. У іх няма ratio на іншую тэму, як у Дастаеўскага. Да таго ж яны не ўяўляюць сабой чыстага афіцыёзу, яны хутчэй апазыцыя.

Але вернемся да Фёдара Дастаеўскага.

Другая прычына ірацыянальнасьці ягонага славянафільства ў тым, што ён даволі прыблізна й несамастойна (апасродкавана) ведае расейскую гісторыю. Гэта той самы, згаданы вышэй «гістарызм». «У нас одно изучение России сколько времени возьмет, потому что у нас лишь редчайший человек знает нашу Россию». Да навуковае канкрэтыкі Дастаеўскі-ідэоляг ставіцца крыху пагардліва, як, відаць, і кожны афіцыёзны ідэоляг: «Но что же такое эта «Славянская идея в высшем смысле ее»? Всем стало ясно, что это такое: это, прежде всего, то есть прежде всяких толкований исторических (*Падкрэсьлена мною.* — С.Д.), политических и проч., — есть жертва, потребность жертвы даже собою за братьев, и чувство добровольного долга сильнейшему из славянских племен заступиться за слабого...» і г.д.

Ён абапіраецца на пафас і веліч гістарычнае інтэрпрэтацыі, на аўтарытэт гісторыкаў (хоць бы й Карамзіна), а не на гістарычныя факты, хоць бы й вычытаныя ў тых самых гісторыкаў. Словам, ягоны падыход тут чыста эмацыйны, процілеглы тому, зноў жа, якім ён дасьледуе, напрыклад, крымінальныя сітуацыі, дзяржаўную сістэму выхаваньня, паводзіны людзей, што вядомыя яму непасрэдна.

І больш таго. Дастаеўскі ірацыянальны ў нацыянальнай праблематыцы ўвогуле (а яна, дарэчы, і ёсьць у яго толькі ўвогуле, нават калі ён канкрэтна гаворыць пра Расею й рускасьць. Напрыканцы нашае гутаркі мы яшчэ скажам пра гэта). Ірацыяналізм — гэта ягонае слабое мейсца, зыб (спадзяюся, чытач увесь час праводзіць паралель з сучасным беларусам і ўжо зрабіў выснову пра слабое мейсца нашага нацыянальнага адраджэньня). І колькі ні мацуе ён гэтае мейсца жалезабэтонным пафасам, яно застаецца хісткае, бяздоказнае, пры ўсёй прэтэнзіі аўтара на аксіяматычнасьць («Мы, русские,.. любим наши святыни, но потому лишь, что они в самом деле святы». Так і собіць прытачыць тут знакамітую цытатку з імпэрскага спадкаемцы пра вучэньне Маркса, якое «всесильно, потому что верно». Але гэта іншая тэма). Магчыма, што тут, у гэтай хісткасьці й адбіваецца генэтычная «нестабільнасьць» вялікарускага ідэоляга Дастаеўскага. А паколькі ўсё нацыянальнае прыцягвае яго нібы магнэсам (гэты парадокс уласьцівы й сучаснаму «пашпартнаму» беларусу, пра што мы ўжо пісалі, — дзьве крайнасьці змыкаюцца ў ім: нацыянальная індыфэрэнцыя й патрэба нацыянальнае ідэнтыфікацыі), яно — хісткае — уносіць раскол у маналіт ягоных практычных экзістэнцыяльных распрацовак. Гэта той самы парадокс Дастаеўскага, але ўбачаны зь іншага боку. У гэтым вось сутыкненьні, на гэтым зломе Дастаеўскі й разьмяшчае сваіх герояў.

Схематычна ўсё гэта выглядае так. Калі цалкам вылучыць зь ягоных твораў нацыянальную праблематыку, — застануцца ўрыўкі лягічных сітуацый Ж.-П.Сартра, пазбаўленыя ў дадзеным выпадку фэнамэнальнасьці і, вядома ж, — «тайны Дастаеўскага», ягонай, скажам так, містычнасьці (а на справе — ужо згаданага тут парадоксу).

Калі гэтыя ўрыўкі, гэтую лёгіку спалучыць з рацыянальнай (вызначанай, «адказанай», завершанай) нацыянальнай праблематыкай, — атрымаецца, можа быць, маналітны Л.Талстой.

Калі тыя вылучаныя эмацыйныя нацыянальныя фрагмэнты разглядаць асобна — атрымаем містыфікаваны пафас «Дзёньніка пісьменьніка».

І — нарэшце — калі спалучыць ірацыянальную этыку нацыянальнага зь ірацыянальнай этыкай сітуацый, — атрымаецца ці не сацыялістычны рэалізм «заўтрашняга дня».

Гэтак у творчасьці. Гэтак і ў творцы.

Ratio — сам Дастаеўскі, яго асоба, ягоная сутнасьць як чалавека. Няпэўныя гены далі яму вострае (магчыма, што й падсьвядомае) зацікаўленьне нацыянальнай праблематыкай (дапусьцім, Ленін меў рацыю, пішучы пра іншародцаў-звышвялікаросаў). Усё гэта суб'ект Дастаеўскага. А Расея сталася аб'ектам згаданага зацікаўленьня.

Але трэба рабіць высновы.

Эмоцыям Дастаеўскага ня варта давяраць безаглядна, тым больш нельга рабіць зь іх догму, пэўныя максімы (як гэта сталася, напрыклад, зь вядомай сьлязой дзіцяці. У іншым мейсцы Фёдар Дастаеўскі прыме і ўхваліць гібель соцень людзей, калі гэтая гібель «апраўданая», напрыклад, пэўным гераізмам).

«О, я не идеалист», — піша Дастаеўскі ў вадным мейсцы, а праз паўсотні старонак: «Я неисправимый идеалист». І тут няма супярэчнасьці. Ва ўсім малым, канкрэтным і практычным Дастаеўскі, безумоўна, не ідэаліст. Ён тут амаль прагматык. Ва ўсім жа вялікім, абстракным і беспрадметным ён, няма сумліву, ідэаліст. Амаль містык.

Ня варта давяраць эмоцыям, якія ў ім часта выяўляюцца праз раздражнёнасьць ("Кто вбил нам в голову этот глупый предрассудок?").

Варта давяраць ratio Дастаеўскага. У развагах пра нацыю, грамадзтва, дзяржаву яно сустракаецца нячаста і ўсё ж сустракаецца. Як, напрыклад, гэтая вось актуальная выснова:

«... калі ў краіне валоданьне зямлёю сур'ёзнае, тады і ўсё ў гэтай краіне будзе сур'ёзнае, ва ўсіх адносінах, і ў самым вялікім і ў малым. Дбаюць, напрыклад, у нас пра асьвету, пра народныя школы, а я вось веру толькі ў тое, што школы тады толькі прымуцца ў нас сур'ёзна й грунтоўна, калі землеўладаньне ды землекарыстаньне наша арганізуецца ў нас сур'ёзна й грунтоўна, і што хутчэй не ад школы атрымаецца добрае земляробства, а наадварот, ад добрага толькі земляробства... атрымаецца добрая школа, але ніяк не раней. Паралельна з гэтым прыкладам і ўсё: і парадкі, і законы, і маральнасьць, і нават сам розум нацыяў, і ўсё, нарэшце, усялякае слушнае йснаваньне нацыянальнага арганізму арганізуецца толькі тады, калі ў краіне ўсталюецца трывалае землеўладаньне. Тое самае можна сказаць і пра характар землеўладаньня: будзе характар арыстакратычны, будзе дэмакратычны, але які характар землеўладаньня, такі і ўвесь характар нацыі».

Практыка XX стагодзьдзя стала крытэрыем слушнасьці гэтых словаў.

Цікава, які характар у сучасных беларусаў — зь іхнімі спусьцелымі вёскамі, дэградацкімі калгасамі, сьвінакомплексамі, мэліярацыяй, радыяцыяй?.. І калі б Дастаеўскі ўсьвядоміў сябе беларусам, ці ж мог бы ён гэтак жа ўзьнёсла сказаць: я беларус, як казаў ён: я рускі. Мусіць, ня змог бы. Таму б і не ўсьвядоміў...

(Вы яшчэ не забыліся на паралель з сучасным беларусам?)

Але скончу я яшчэ адным, абяцаным тлумачэньнем Дастаеўскага. Ён піша як беларус (хай сабе проста як нярускі, хай сабе нават толькі на ўзроўні згаданае генэтычнае нестабільнасьці) пра Расею й рускасьць — увогуле. Айчына й патрыятызм існуюць для яго ў вадцягненаадзінкавым варыяньце. Значыцца, ягоныя развагі пра айчыну й патрыятызм я магу разглядаць як развагі пра Беларусь і беларускі патрыятызм (у дадзеным выпадку хутчэй — нацыяналізм). І калі гэта пазытыўныя развагі, пазбаўленыя дэструктыўнае містыкі, — тады й мы ў нашых пошуках і блуканьнях можам разглядаць досьвед Дастаеўскага як свой. Гэты досьвед, далібог, важней, чым тое нават, што Фёдар Дастаеўскі з паходжаньня беларус.

# Наталі Сарот

## Трапізмы

Але часам бывала й так, што, калі ўсё ішло добра, калі яна ўжо ўтульна ўладкоўвалася, з асалодаю прадчуваючы, што зараз пачнуць гаманіць пра тое, што ёй так даспадобы, калі гамонка рабілася шчырая й сур'ёзная, яны — раптам — высьлізвалі нейкім блазенскім выкрутам і расьпяльвалі твар у ідыёцкай, гідкай усьмешцы.

### XV

Ёй так падабаліся такія старыя дзядкі — такія, як ён, зь імі можна было пагаварыць, яны столькі ўсяго разумелі, столькі зьведалі ў жыцьці, сустракаліся з рознымі цікавымі асобамі (яна ведала, што ён быў некалі сябрам Фэлікса Фора й цалаваў у руку імпэратрыцу Яўгенію).

Калі ён завітаў да яе бацькоў на вячэру, яна, з такой дзіцячай шчырасьцю, з такой пачцівасьцю (ён такі мудры), трошкі нясьмелая, але ўся трапяткая ад нецярплівасьці (гэта так павучальна — пачуць, што ён думае), першая прыбягала ў салён, каб скласьці яму кампанію.

Ён цяжка ўставаў: «Ага! Вось і вы! Ну і што? Як вашыя справункі? Чым займаецеся? Што добрага зрабілі сёлета? Ага, зноў едзеце ў Ванглію? Вунь што?»

Яна зноў зьбіралася ў Ванглію. Сапраўды, ёй так падабаецца гэтая краіна. Бо калі з ангельцамі пазнаёмісься бліжэй...

Але ён перапыняў: «Англія... Ну, але ж, Англія... Шэксьпір? Га? Га? Шэксьпір. Дыкенс. А ведаеце, я, калі быў малады, памятаю, забаўляўся перакладамі з Дыкенса. Тэкерэй. Ведаеце Тэкерэя? Th... Th... Так, здаецца, яны вымаўляюць? Га? Thackeray? Так? Яны ж так гэта кажуць?»

Усё — ён ужо ўчапіўся ў яе, трымаў, заціснуўшы ў кулаку. І глядзеў, як яна ледзь прыкметна брыкаецца, нязграбна, зусім па-дзіцячаму дрыгае ў паветры нагамі, і па-ранейшаму ўсьміхаецца, міла, прыязна: «Ну але, па-мойму, менавіта так. Але. Вы добра вымаўляеце. Сапраўды, t-h... Tha... Thackeray... Але-але, слушна. Вядома, я ведаю «Vanity Fair». Так-так, гэта ён напісаў».

Ён трошкі яе паварочваў, каб лепей разгледзець: «Vanity Fair? Vanity Fair? Ага! Вы ўпэўнены? Vanity Fair? Гэта ён напісаў?»

Яна яшчэ квола торгалася, зь нязьменнаю ветлівай, мілаю ўсьмешкай, і прагна шукала вачыма чагосьці. А ён сьціскаў усё мацней — усё мацней, мацней: «І кудой вы едзеце? Праз Дуўр? Праз Кале? Dover? Га? Праз Dover? Так яны кажуць? Dover?»

Ніяк немагчыма высьлізнуць, спыніцца. А яна — яна столькі чытала... столькі думала пра розныя рэчы... Ён жа ўмеў быць такі чароўны... Але, відаць, дзень выдаўся ў яго няўдалы, ён быў не ў найлепшым гуморы. І ён будзе цяпер гаварыць, гаварыць, ня ведаючы літасьці, не даючы перадыху: «Dover, Dover, Dover? Га? Га? Thackeray? Англія? Дыкенс? Шэксьпір? Га? Га? Dover? Shakespeare? Dover?» — а яна будзе старацца вызваліцца, мякка, не асьмельваючыся зрабіць рэзкага руху — гэта можа яго ўгнявіць, — і будзе адказваць ледзь прыкметна пагаслым галасочкам: «Ага, слушна, Dover. Вы, напэўна, часта тудою езьдзілі... Па-мойму, праз Дуўр зручней. Ага, слушна... Dover».

І толькі калі ён убачыць, што ўжо прыйшлі бацькі, ён нарэшце апамятаецца й расслабіць кулак, і яна, трошкі пачырванелая, трошкі ўскудлачаная, у крыху пакамечанай прыгожай сукенацццы, нарэшце адважыцца, не баючыся яго раззлаваць, — уцячы.

### XVI

Яны былі ўжо старыя, пашараваныя, «як старая, доўга служылая мэбля, што аджыла свой век», і часам (гэта было ў іх своеасаблівым какецтвам) яны ціха ўздыхалі, і гэты гук, падобны да сухога рыпеньня, быў поўны пакорлівасьці, поўны супакаеньня.

Цёплымі веснавымі вечарамі яны разам хадзілі гуляць — «цяпер, калі мінула маладосьць, калі згасла былая палкасьць», яны проста хадзілі гуляць, «падыхаць крыху перад сном сьвежым паветрам», пасядзець у кавярні, пагаманіць.

Зь вялікай перасьцярогаю яны выбіралі закутак, дзе б іх нішто не трывожыла («не-не: гэта якраз на скразьняку, і там таксама: каля самае прыбіральні»), нарэшце яны сядалі — «Ах! Гэтыя старыя косткі, што зробіш, старэем... Ах! Ах! — зноў чулася іх сухое рыпеньне.

Сьвятло ў залі было нячыстае й халоднае, гарсоны бегалі надта хутка, абыякавыя, крыху нават жорсткія, і ў люстэрках адбіваліся змардаваныя твары з прыжмуранымі вачыма.

Але яны нічога іншага не патрабавалі, так дык так, цяпер яны гэта ведалі — ня трэба нічога чакаць, і патрабаваць ня трэба: усё ёсьць так, і нічога болей, гэта й ёсьць — «жыцьцё».

Нічога іншага й нічога болей, тут ці там, усё адно, цяпер яны гэта ведалі.

І ня трэба было бунтаваць, летуцець, чакаць ці намагацца, ці кідацца на ўцёкі, трэба проста ўважліва выбраць (гарсон чакаў): «возьмем гранатавы сок зь мінеральнай ці каву? чорную ці зь вяршкамі?» — і сьціпла пагадзіцца жыць, тут ці там, неяк бавячы час.

### XVII

Калі наставалі пагодныя дні, у сьвяты, яны выбіраліся ў прыгарадныя лясы — на шпацыр.

Кусьцістыя лясныя зарасьнікі былі сымэтрычна

# Томас Венцлава

## *Музэй у Хабарце*

*Спакон бязьлюдны край. Глухі басальт.*
*Спрадвечных хваляў маятнік рухавы.*
*Дакладней, хоць тубыльцаў ёсьць няшмат,*
*што ацалелі пасьля трох аблаваў,*
*ды гэта неістотна. Вось іх спрат —*
*паўвыспа з прахам продкаў. Іх паставы*

*убогія прыкмеціўшы, паэт*
*заўважыць нехаця: «Люд занядбаны...»*
*(Яшчэ нядаўна тут ляжаў шкілет,*
*аднак яго спалілі — мо з пашаны,*
*а мо як абрыдлелы ўсім прадмет,*
*каб мейсца не займаў). Але ж заганна,*

*калі пустуе мейсца. І наноў*
*зацягваюцца у прасторы дзюры.*
*Сьвет узнавіла жменька мастакоў,*
*спакусьнікаў, абранцаў авантуры,*
*ня надта вінаватых. А бяз слоў —*
*Гулаг брытанскі у мініятуры:*

*Пазьней у небыцьцё сыйшоў і ён...*
*Тут самы мірны кут на ўсёй плянэце.*
*Усё мінула. І магнітафон,*
*здараецца, у хібах прызнаецца.*
*І зь вечнасьці паўстаўшы, аўтахтон*
*застрашыць нас з экрану марна пнецца:*

*Нахіленая голаў, нізкі лоб,*
*які ня раняць церні. Сёньня клопат*
*уладаў нават мёртвыя ўзахлёб,*
*напэўна, славілі б. І недахопаў*
*у яго мове, пэўна, менш было б.*
*Ды ўсё гэта, бадай што, сфэра ўтопій.*

*Хіба што на сваім напрамку час*
*сьвет й турмы ўдасканальвае патроху.*
*Каля муроў акруглых вабіць нас*
*бляск ветразяў, казыча вецер бронхі,*
*а той, хто зьведаў гарадзкіх прыўкрас,*
*назад білет свой не вяртае Богу,*

*як і кампанія «Ансэт». Спакой.*
*Прылады племя зьніклага. Кайданы*
*за шклом нябіткім зьедзены іржой.*
*Гісторыя, бы сьцёрты грош мядзяны.*
*І антарктычнай поўняцца імглой*
*уступы гор і роўнядзь акіяну.*

*Сякера ў каранях. Валун. Для вас*
*я ўжо ня брат, хоць і сусед па зале,*
*дзе часу вэртыкаль расьсекла час,*
*дзе здымкі й альфабэты жоўкнуць сталі,*
*дзе штось яшчэ крычыць разьбіты сказ*
*і попел у вітрыне ў немым жалю.*

*Што значыць забыцьцё? Цурчыць ручай*
*і капаюць кляпсыдры. Лямпа сонна*
*гайдаецца, успыхвае адчай*
*з сусьветам цесным побач ці з адхонам.*
*Пласты пяску, міргаьне майгача.*
*На ветры знакі. На вадзе пісьмёны.*

* * *

*Абрыс дзьвярэй, вядро, і крэсла, і замок —*
*бы ў воблаку. Даўно за поўнач. Ад парога*
*адсунецца ў журбе адліву зорка ў змрок,*
*каб госьця ў доме не магла пазнаць падлога.*

*Струмок над вогнішчам збляднее*
*на вачах,*
*хісьнецца долу і прыгне сьцяблін*
*галовы,*
*а човен сам адвяжацца, і ў небе птах,*
*па завядзёнцы, перагоніць*
*марнасьць слова.*

*Мо ўздумаў мёртвы гаспадар*
*дамоў прыйсьці*
*і, не знаходзячы запалкі, з кута*
*ў кут блукае,*
*і штось вышэйшае ад нас існуе*
*ў небыцьці,*
*што быццам музыка і лёд нас сустракае.*

*Разломіць цішу ручая цяжар ступні,*
*нябачная рука з суглінку здыме дзёран,*
*і сувязь рэчаў уваскрэсьне ў цішыні,*
*надоўга, пэўна, абясцэніўшы прастору.*

Пераклаў зь летувіскае А.М.



*Здымак Алены Адамчык.*

раскрэсьленыя простымі прасекамі, якія, сыходзячыся, утваралі правільныя скрыжаваньні. Трава была яшчэ рэдкая, патаптаная, але сям-там на галінках пачыналі ўжо распускацца лісточкі; іх яркасьці яшчэ не ставала, каб крыху асьвяжыць навакольную няўтульнасьць, і яны больш нагадвалі дзетак у бальнічным пакоі, што кісла ўсьміхаюцца, моршчачы тварык пад сонцам.

Яны ладкаваліся сьнедаць каля сьцяжынак, на аблыселых прагалінах і, здавалася, нічога вакол не заўважалі: яны былі вышэй за ўсё гэта, — іх не абыходзіла піскляваe чырыканьне птушак, кволыя пупышкі, скамечаная трава; густая, непраглядная атмасфэра, у якой яны жылі кожны дзень, не пакідала іх і тут, яна сачылася зь іх, як цяжкае, едкае мроіва.

Яны прывозілі сюды з сабой і нязьменнага спадарожніка свайго адпачынку — сваё адзінае дзіця.

І калі малое бачыла, што яны пачынаюць прыладкоўвацца ў выбраным мейсцы, яно раскладала зэдлік, ставіла яго побач і, сеўшы, пачынала грэбсьці зямлю, зьбіраючы ў кучу каменьне й сухую лістоту.

Яго ахіналі іхнія словы, іхнія фразы, пераблытаныя зь неспакойнымі пахамі гэтай нядошлай вясны, нібы поўныя ценяў, пад якімі зьбіраліся й варушыліся нейкія цьмяныя формы.

Густое паветра, нібы прапітанае клейкім вільготным пылам, дрэўнымі сокамі, ліпла да яго, прыстаючы да скуры, лезучы ў вочы.

Малое не хацела адыходзіць ад іх, ісьці на поплаў гуляць зь іншымі дзецьмі. Яно, нібы прывязанае, сядзела на мейсцы і са змрочнай прагнасьцю паглынала ўсё, што яны казалі.

### XVIII

Гэта — пад Лёнданам, у катэджы з паркалёвымі фіранкамі, з маленькім пастрыжаным паплаўцом на заднім двары, асьветленым сонцам і мокрым пасьля дажджу.

На поплаў выходзяць вялікія зашклёныя дзьверы мастацкай майстэрні, з абодвух бакоў ад дзьвярэй — вазоны з гліцыніямі.

На цёплым каменьні, заплюшчыўшы вочы, просты, як струна, сядзіць кот.

Перад дзьвярыма бялявая дзяўчына з ружовымі, крыху фіялетавымі шчокамі, чытае ангельскі ілюстраваны часопіс.

Яна сядзіць, вельмі напружаная, вельмі чапурыстая, вельмі ўпэўненая ў сабе ды ў іншых, трывала асталяваўшыся ў сваім маленькім сьвеце. Яна ведае, што праз колькі хвілін зазвоніць званок і яе паклічуць да гарбаты.

Кухарка Ада, на ніжнім паверсе, за сталом, накрытым белай цыратай, абірае гародніну. Яе твар нерухомы, яна, як відаць, ня думае ні пра што. Яна ведае, што хутка настане час сьпячы «buns»* і пазваніць у званок, каб паклікаць на гарбату.

### XX

Калі ён быў маленькі, ён сядаў сярод ночы на ложку й клікаў. Яны прыбягалі, запальвалі сьвятло, бралі ў рукі бялізну, сурвэткі, розную вопратку й паказвалі яму: нічога няма. У іх руках прадметы адразу рабіліся бяскрыўдныя, нібыта меншалі, нерухомелі, ябарочваліся мёртвымі ў электрычным сьвятле.

І цяпер, калі ён ужо вырас, ён па-ранейшаму, як і тады, клікаў іх да сябе, каб яны прыйшлі, паглядзелі, пашукалі паўсюль, каб яны знайшлі тыя страхі, што схаваліся ў ім у далёкіх закутках, каб яны ўзялі іх у рукі й разгледзелі пад сьвятлом.

Яны прызвычаіліся прыходзіць, глядзець, і ён цяпер сам ішоў наперадзе, сам запальваў сьвятло, каб ня чуць, як яны мацаюць у цемры рукамі. І яны глядзелі — ён стаяў нерухомы, не адважваючыся дыхнуць, — але нічога нідзе не было, нічога страшнага, усё, здаецца, было ў парадку, на мейсцы, яны бачылі вакол толькі звычайныя, даўно знаёмыя рэчы, і паказвалі яму: нічога няма, чаго ён спалохаўся? Часам, сям-там, у якім-небудзь куточку нешта ледзь прыкметна дрыжэла, ледзь адчувальна пацепвалася, але яны адным рухам, адразу ставілі ўсё на мейсца; гэта ж нічога — зноў адзін зь ягоных звычайных страхаў — яны бралі, паказвалі яму: што, дачка ягонага сябра ўжо выйшла замуж? Гэта? Ці той, з аднаго зь ім выпуску, атрымаў падвышэньне ці высунуты на ўзнагароду? Яны ўладжвалі, усё выпраўлялі: тут нічога такога няма. Ён на імгненьне адчуваў сябе трошкі мацнейшым, сабраным, больш-менш зьлепленым у цэлае, але рукі й ногі ў яго зноў пачыналі цяжэць, рабіліся абсалютна бязьдзейныя, нібыта драньцьвелі ў застылым чаканьні, і, нібы перад непрытомнасьцю, у яго пачынала казытаць у носе; яны бачылі, як ён раптам замыкаўся ў сабе й рабіўся нейкі дзіўна адсутны й засяроджаны; і тады, лёгка пляскаючы па шчоках, — а вясельнае падарожжа Віндара, а Лебрэн, а пяць сястрычак-блізьнятак — яны прыводзілі яго да прытомнасьці.

Але калі ён нарэшце апрытомваў, і яны пакідалі яго аднаго, падчышчанага, падцыраванага й падкручанага, як сьлед адладжанага й адрамантаванага, страх зноў пачынаў нараджацца ў ім, выпаўзаючы з розных маленькіх скрыначак і шуфлядачак, якія яны толькі што адчынялі і, нічога ня ўбачыўшы, зачынялі зноў.

*buns (анг.) — булкі з разынкамі.

*(Працяг на наступнай старонцы)*

# Абхаскія занатоўкі

Антон Бакіноўскі

## Сабакі

Увечары я прагульваўся ўздоўж мора.

Удзень быў вецер, а на моры — штыль. Пад вечар вецер аціх, а мора расхвалявалася. Сонца сплывала ў асмужаны далягляд. Апускалася яно хутка ды адначасова набраквала чырваньню й цемраю.

З бамбукавых зарасьцяў мне насустрач выбеглі чатыры сабакі. Адзін зь іх, большы, нагадваў гіену. Поўсьць чорная ў рудых падпалінах і сівых пісягах. З-за такой поўсьці нават даўгаваты сабачы нос выглядаў карацейшым, рыхтык гіена.

Сабакі падбеглі й заматлялі хвастамі.

У мяне было яйка, што засталося ад вячэры. Я раскрышыў яго, нават не абабраўшы. Сабака, падобны да гіены, зьеў толькі жаўток. Давялося абіраць, каб і бялок зьеў.

За такі пачастунак сабакі беглі за мной уздоўж мора кілямэтры са два.

## Разуменьне

Зразумець можна ўсіх, але ня ўсім можна даравадь.

## Сігнал

Абхаскія шафёры перарабляюць сігналы ў сваіх машынах, замест працяглых гудкоў робяць пераліўстыя, падобныя да нейкіх шлягерных мэлёдыяў. Начную цішу раз-пораз перарываюць такія вось пераліўы.

Занадта дасьціпны адпачыньнік пацікавіўся ў гатэльнай прыбіральшчыцы, нашто абхазы ставяць такія непрыгожыя сігналы.

— Ён едзе, сігналіць, і ўсе ведаюць, што ён вязе рускіх аслоў.

Вось табе й маеш за цікаўнасьць. Зрэшты, усе сігналы падобныя да крыку асла.

## Чача

Чачу я каштаваў, даволі моцная й рэзкая самагонка зь вінаграду, а на другі дзень у мяне была жахлівая пякотка.

Брат казаў, што таксама ня мог піць ні чачы, ні самаробнага віна, а купляў крамнае.

Яшчэ брат распавядаў, як аднаго разу піў у абхаскім гатэлі з маскоўскімі пісьменьнікамі. Яны набылі чачы, а ён віна. У пакой нечакана зайшла прыбіральшчыца. (Што да абхаскіх прыбіральшчыц, дык сьціпласьці ім сапраўды бракуе. Сьпяваюць на калідорах і ў пакоях на поўны голас. Заходзяць у нумар, пачынаюць прыбіраць, а на гаспадароў нават увагі не зьвяртаюць. Азія. І хай сабе Грузія ды Абхазія лічацца за Эўропу, а я вам скажу, гэта — Азія...)

— Чачу ў Джаніко куплялі? — пытаецца прыбіральшчыца.

— У Джаніко, — адказаў нехта з маскалёў.

— Гэтай чачай у гарах нябожчыкаў абмываюць, а вы яе п'яцё, — паведаміла вясёлая жанчына й дадала, — ґуляйце, а падлогу я заўтра памыю.

Брат казаў, што яго ледзь не званітавала, а расейцы адно пасьмяяліся і зноў налілі сабе чачы.

Наогул, расейцы менш ґідуюцца за беларусаў.

## Доўгажыхары

Калі ў габрэйскіх размовах заўсёды знаходзіцца разумная цётка Сара (Бася, Роза, Эня), якая мае розум і здольнасьці, ня меншыя за Салямона, дык у вабхазаў ідуць спасылкі на нейкіх міфічных доўгажыхароў.

— Даўно такой задухі не было, — кажа гандлярка газэтамі й дадае: — гаворань доўгажыхары.


Яна ўпэўненая, што выраз «гавораць доўгажыхары» надасьць яе словам вагу. Гэта відаць па яе твары, такія твары яшчэ бываюць у людзей, што прыкладаюць да папераў круглую пячатку.

## Хлопчык на вяроўцы

Гагра — курортнае мястэчка, над якім навісаюць горы, а над імі — хмары.

У XIX стагодзьдзі з-пад самых хмараў абхазы стралялі ў расейскіх заваёўнікаў. Каўкаскую вайну горцы прайгралі...

Па асноўнай гаграўскай вуліцы я прайшоў кілямэтраў зь пяць, змогся й ня ўбачыў нічога адметнага. Нават да экзотыкі хутка прызвычайваесься. Яшчэ ўчора зьдзіўляў гарачы лаваш, кубачак кавы ў кавярні пад платанамі, шорхат марской жарствы... А сёньня





# Наталі Сарот

## Трапізмы

### XXI

Гэта была дзяўчынка надзвычай «простая», заўжды ў чорным альпаковым фартушку, зь вечным крыжыкам на грудзях, вельмі разумнае й паслухмянае дзіцё: «Прабачце, пані, а гэта для дзяцей?» — пыталася яна ў гандляркі ў папяровай лаўцы, калі была ня вельмі ўпэўненая, купляючы ілюстраваны часопіс ці кніжку.

Яна ніколі ня здолела б, о не, ні за што на сьвеце яна не змагла б, ужо ў тым узросьце, выйсьці з лаўкі, адчуваючы, як ёй глядзяць у сьпіну, яна не здолела б нават адчыніць дзьвярэй, каб выйсьці, з гэтым поглядам, упёртым у самую сьпіну, з гэтым гандлярчыным позіркам.

Цяпер яна была ўжо дарослая — рыбка вырасьце й будзе зусім вялікая, — але, час ідзе хутка, ах, як толькі мінае дваццаць, гады пачынаюць бегчы й бегчы, усё хутчэй і хутчэй, праўда ж? яны таксама так думаюць? — яна сядзела насупраць, у заўсёдным чорным сваім гарнітурчыку, які добра да ўсяго пасаваў, — сапраўды, чорны колер, апроч усяго іншага, заўжды надае гэткую прыбранасьць... — яна сядзела, скрыжаваўшы рукі на сумаццы, падабранай пад тон, і ўсьміхалася, ківаючы галавой, з жаласьлівымі вачыма, так, так, вядома, яна чула, ёй расказвалі, яна ведае, як доўга й пакутліва памірала іхняя бабка, яны была заўсёды такая моцная, дзіва што — яны ўсе былі не такія, як мы, у сваім узросьце яна нават ніводнага зубу ня страціла... А Мадлена? Муж у яе... Ах, каб гэтыя мужчыны маглі самі нараджаць дзяцей, дык ніколі больш за аднаго ня мелі б, вядома; яны ні за што не згадзіліся б паўтарыць яшчэ раз, — маці яму, небарака, заўсёды гэта казала — эх-эх! бацькі, сыны, маткі! — першая ж у іх дачка, а яны так хацелі спачатку сына, не, не, ну, пра гэта яшчэ вельмі рана, яна не зьбіраецца йсьці з хаты, зьехаць, яна й ня думае пакідаць іх, яна пакуль яшчэ будзе тут, побач зь імі, зусім побач, як мага бліжэй да іх, вядома, яна разумее, гэта так прыемна, старэйшы — сын, яна ківала галавой, усьміхалася, о не, каб яна — першая, не, тут яны могуць быць абсалютна спакойныя, яна й пальцам не варухне, о не, яна — не, яна ніколі ня зможа ўсё разам так паламаць. Маўчаць; глядзець на іх; і раптам, у самы разгар бабчынай хваробы — узбунтавацца і, зрабіўшы жудасную праломіну, выскачыць, абдзіраючыся аб зазубраныя краі, і бегчы, з крыкам, міма дамоў, што зыраццa, прытаіўшыся, уздоўж шэрых вуліц, уцякаць, пераскокваючы праз ногі кансьержак, што дыхаюць сьвежым паветрам, седзячы на ганку каля дзьвярэй, бегчы, разьдзіраючы рот, гарлаючы, не сьціхаючы ні на хвіліну, каб кансьержкі падымалі галовы, забываючыся на вязаньне, і іх мужы апускалі на калені газэты й утаропліваді ёй у сьпіну свой позірк, пакуль яна не паверне за рог.

### XXII

Часам, калі яны яго ня бачылі, ён мог ласкава, нібыта шукаючы побач нешта жывое, цёплае, правесьці рукой па буфэце... яны ж не заўважаць, а калі й заўважаць, можа, падумаюць, што ён проста — гэта ж звычайнае і ўвогуле бяскрыўднае дзівацтва — што ён проста хацеў «пастукаць па дрэве», ад сурокаў.

Калі ён адчуваў, што ззаду за ім назіраюць, ён — як той злачынца ў камэдыйным фільме, які, адчуўшы сьпінай шпегаў позірк, раптам бясклапотна завяршае рух ужо занесенай рукі, стараючыся надаць яму натуральнасьць і бяскрыўднасьць, — ён таксама, каб не ўзбудзіць іх падазрэньня, стукаў трыма пальцамі правае рукі тры разы тры, самае дзейснае закляцьце ад сурокаў. Але ўсё адно за ім сачылі цяпер болей, асабліва пасьля таго, як у сябе ў пакоі ён быў засьпеты за чытаньнем Бібліі.

Рэчы таксама яму не давяралі, ужо вельмі даўно, яшчэ з таго часу, як ён, зусім маленькі, стараўся іх дамагчыся, чапляўся, прыліпаў да іх, хацеў аб іх пагрэцца, — яны не хацелі ўвайсьці зь ім «у змову», адмовіліся быць для яго тым, чым ён хацеў, — «паэтычнымі ўспамінамі дзяцінства». Яны былі добра вымуштраваныя, выдрэсіраваныя, у іх заўсёды быў нязьменны, безаблічны й безымены твар, — добра вышкаленыя служкі, яны ведалі сваю ролю й адказвалі яму, баючыся, вядома, што праз гэта іх звольняць.

Але апроч гэтага, сарамлівага й вельмі рэдкага ў яго руху ён нічога сабе не дазваляў. Яму ўдалося паступова задушыць усе былыя неразумныя дзівацтвы, і цяпер ён меў іх нават меней, чым яму звычайна даравалі; ён нават не зьбіраў ужо маркі — хоць нармальныя людзі займаюцца гэтым ва ўсіх на вачох. Ён ніколі ўжо не спыняўся пасярод вуліцы, каб нешта разгледзець — як раней, калі ягоная нянька (ды хадзем жа! хадзем!) цягнула яго, — ён пераходзіў хутка й ніколі не замінаў руху на праезнай частцы; нават міма самых прывабных, самых жывых прадметаў ён праходзіў спакойна, ня кідаючы ім змоўніцкіх позіркаў.

Увогуле, нават тыя зь ягоных сяброў, зь ягоных крэўных, хто былі зацятыя аматары псіхіятрыі, нават тыя ні ў чым не маглі папракнуць яго, хіба што, можа, побач з гэтай адсутнасьцю ў яго бяскрыўдных прыхамацяў, якія даюць немалую аддуху, побач зь ягоным згодніцтвам праз празьмерную паслухмянасьць — у лёгкай схільнасьці да астэніі.

Але яны даравалі гэта; калі добра падумаць, гэта было ня так ужо страшна, ня так непрыстойна.

Час ад часу, зрэдку, калі ён бываў вельмі стомлены, па іхняй парадзе ён дазваляў сабе трошкі прайсьціся. І тады, гуляючы, адзін, на захадзе дня па захутаных сьнегам і поўных мяккай спагады вулачках, ён гладзіў рукамі чырвоныя й белыя цагліны дамоў і, прыпаўшы да муру, перагнуўшыся наўскасяк, баючыся сваёй нясьціпласьці, глядзеў праз асьветленую шыбу ў пакой на першым паверсе, дзе перад вакном на парцалянавых сподках стаялі вазоны зь зялёнымі расьлінамі, і адкуль, цёплыя, важкія, налітыя нейкай таямнічаю ґустатой, рэчы пасылалі яму — і яму таксама, хоць ён быў чужы, незнаёмы — часьцінку свайго прамяністага зьзяньня; дзе й рог стала, і створкі

заняты адно сабою: галаўны боль ледзь чутны, але непрыемны; пякучая смага; пот, ад якога нагавіцы прыляпіліся да сьцёгнаў; жаданьне хутчэй схавацца ў задушлівым, але ж ценю.

І раптам каля кінатэатру «Руставэлі» я ўбачыў хлопчыка на вяроўцы. Белы шпагат, на такім беларускія вяскоўцы водзяць быдла, тугой пятлёю абхопліваў хлапечую паясьніцу. Праз мэтры два за хлопчыкам кульгала старая цётка ў хімічна-зялёнай ваўнянай кофце з доўгімі рукавамі. І як гэта можна па такой гарачыні хадзіць у тоўстай вязанай кофце? — падумалася мне. Другі канец вяроўкі быў наматаны на левую далонь старое каўказкі. Пэўна ж, яна сьляпая, і хлопчык яе вядзе. Але не пасьпеў я так падумаць, як хлапчанё ірванулася да газэтнага шапіка. Вяроўка напялася. Цётка крыкнула, а хлапчанё замахала рукамі й пачало нешта тлумачыць. Старая супакоілася й падыйшла да шапіка. Яна гартала ілюстраваны грузінскі часопіс. Тым часам хлапчанё засунула руку ў шапік ды выцягнула адтуль гумовы шарык. Старая паспрабавала адабраць здабычу, але хлопец адбегся на даўжыню вяроўкі й засунуў шарык за шчаку. Цётка вярнула часопіс, заплаціла за шарык і зноў загаварыла да хлопчыка. Той унурыўся й пайшоў наперад, гучна пляскаючы запыленымі кедамі па гарачых плітах ходніка. Праз якіх сто мэтраў ён дастаў з роту шарык і паспрабаваў надзьмуць, але старая раптам павярнула ў краму «Садавінагароднiна» і рэзка тузанула за шпагат, так што хлапчанё ледзь утрымалася на сваіх клыпаватых нагах. Старая схавалася ў цёмную крамную прахалоду. Сьледам забег туды й чарнагаловы хлопчык з шарыкам у зубах.

А я накіраваўся ў знакамітую гаграўскую краму «Тры бочкі», дзе на разьліў прадаюць сухое віно. Я пастаяў каля вітрыны, што была спрэс застаўленая пляшкамі гарэлкі. Бяры — колькі панясеш. (А ў Менску талёны, адна пляшка на месяц.) Я падыйшоў да стойкі і ўзяў усяго за адзін рубель цэлую шклянку віна. Прагна выпіў шклянку ружовабурштынавага халоднага эрэці.

Калі вам надарыцца быць у Гагры, абавязкова зайдзіце ў краму «Тры бочкі» ды выпіце за здароўе хлопчыка на вяроўцы.

## Вецер

На пляжах у Піцуньдзе людзей няшмат, калі параўнаць з Сочы ці Ялтай, дзе адпачыньнікі ляжаць адзін пры адным, як батоны ў паддонах.

Я прыйшоў на мора і знайшоў добрае мейсца паміж украінскай сям'ёю, што гучна абмяркоўвала вартасьці прадуктаў, раскладзеных тут жа на ручніку, і маладой жанчынаю ў чорных акулярах, якая ляжала на сьпіне. Яна, пэўна, зашмат апалялася ў папярэднія дні, таму й накрылася сукенкай.

Я пайшоў плаваць.





Мора спакойнае, над нізкімі хвалямі дзьме цёплы ветрык, лёгкасьць ва ўсім — кайф. Так бы плыў і плыў, як кажуць: да самай Турцыі. Толькі ў мора плысьці лягчэй, чымся на бераг.

І калі я, крыху стомлены, выйшаў на гарачыя камяні, дык убачыў, што вецер скінуў сукенку з маладое жанчыны. Яна спала цалкам аголеная. Сьветлыя неабпаленыя грудзі й яшчэ сьвятлейшая паска ад майткаў асьляплялі. А блакітна-чорны трохкутнік прымусіў адвярнуцца.

Украінская сям'я зь цікаўнасьцю пазірала ў мой бок. Каб не яны, я б, напэўна, яшчэ разглядаў аголеную.

Паспрабаваў чытаць, але думкі вярталі мяне да спакусьлівага трохкутніка. Каб выйсьці з гэтай сітуацыі, я ўзяў каменьчык і шпурнуў яго. Ён чокнуўся каля жаночае рукі. Жанчына прачнулася. Я адвярнуўся й пачаў гартаць «Падарожныя занатоўкі» Караля Чапэка.

Я чуў, як жанчына зьбіралася й прайшла зусім побач са мною, але не падняў вачэй ад старонкі.

## Віно

Пад невысокай крываватай сасною на шарым пляжным пяску ўладкаваліся на абмытых морам карэньнях два мажныя абхазы. Паміж імі стаяў на газэце трохлітровы слоік сьветлага віна. Каля слоіка ляжалі колькі пучкоў сакаўнай зеляніны, чатыры яркія памідоры дый пара-тройка накроеных гуркоў. На абхазах сьвіціліся белыя кашулі, расшпіленыя на цёмных валасатых грудзях. У тоўстых пальцах мужчыны сьціскалі поўныя шклянкі. Адзін гаварыў, другі слухаў.

Як далёка яны былі ад стракатага пляжнага тлуму!

І мора, і сосны, і віно належалі толькі ім.

## Крылы

У ластаўкі шэсьць крылаў.

Ліпень 1990.

*Здымкі Алены Адамчык.*

ў буфэце, і кожная саломіна ў плеценым крэсьле выходзілі з прыцемку й пагаджаліся быць для яго — праз міласэрнасьць сваю, для яго таксама, бо ўжо ўсё адно ён тут і ўжо ўсё адно чакае, — зрабіцца маленькім кавалкам зь ягонага дзяцінства.

## XXIII

Усе яны брыдкія, шэрыя, звычайныя, безаблічныя, надта ўжо старамодныя, сапраўдныя клішэ, думала яна, яна бачыла гэта ўжо столькі разоў, паўсюль, усё гэта даўно апісана ў Бальзака, Мапасана, у «Пані Бавары», клішэ, копіі, копіі з копіяў, думала яна.

Ёй так бы хацелася іх адштурхнуць, схапіць у кулак і як мага далей закінуць. Але яны, спакойныя, ціхія, былі тут, побач зь ёю, яны ўсьміхаліся ёй, прыязна, але зь вялікай годнасьцю; увесь тыдзень яны працавалі, усё жыцьцё разьлічвалі на адных толькі сябе, яны нічога не патрабавалі, нічога апроч таго, каб зрэдку, каб час ад часу ўбачыцца зь ёю, крыху паднавіць тую сувязь, што зьвязвала іх і яе, што яна па-ранейшаму ёсьць, як і заўжды на мейсцы, гэтая нітка, што злучае іх і яе. І ім нічога болей было ня трэба, толькі проста спытаць — бо гэта так натуральна, так усе заўжды робяць, калі прыходзяць на госьці да крэўных ці да сяброў, — спытаць у яе, што ў яе добрага, ці шмат яна прачытала за апошні час, ці часта куды хадзіла, ці бачыла гэта, ці глядзела гэтыя фільмы й ці ня лічыць яна, што яны ўдалыя... А ім так спадабаліся Сімон Мішэль і Жувэ, яны так сьмяяліся, такі цудоўны быў вечар...

А ўсё гэта, — клішэ, копіі, Бальзак, Флабэр, «Пані Бавары», — г-ох! яны гэта ведалі, ім усё гэта было выдатна знаёмае, ну дык што, яны не баяліся — яны глядзелі на яе, міла, усьміхаючыся, і здавалася, адчувалі сябе побач зь ёю ў бясьпецы, здавалася, яны ведалі, што іх ужо столькі разоў разглядалі, размалёўвалі, расьпісвалі, што іх ужо так абсмакталі, што яны зрабіліся зусім гладкія, як рачныя каменьчыкі, выпаліраваныя й без адзінай задзірынкі, так што й няма за што ўхапіцца. І яна нічым не магла б іх падкалупнуць. Яны надзейна былі ахаваныя.

Яны стаялі вакол, цягнуліся да яе рукамі: «Мішэль Сімон... Жувэ... Ах, сапраўды! Гэта ж трэба было паклапаціцца замовіць мейсцы загадзя... Бо потым ніякіх квіткоў ня можна было знайсьці, ці па нейкіх жудасных коштах, дый тое — толькі у ложы ды бэнуар...» Яны трошкі сьціскалі повязь, мацней, але вельмі паволі, зусім незаўважна, каб не зрабіць балюча, напіналі, нацягвалі тонкую нітку...

І паступова, патроху, слабасьць, млявасьць, раптоўная патрэба падысьці да іх бліжэй, быць імі ўхваленаю прымушалі яе ўвайсьці ў іхняе кола. Яна адчувала, як ціха, пакорліва (Алеале... Мішэль Сімон... Жувэ...), вельмі пакорліва, як добрая, паслухмяная маленькая дзяўчынка, яна падае ім руку й пачынае зь імі кружыцца.

Ах, ну вось мы нарэшце й разам, такія ціхмяныя, добрыя, і робім усё толькі тое, што ўхвалілі б нашыя бацькі, вось — стаім тут, разам, і прыстойна, хорам сьпяваем песеньку, як мілыя дзеткі пад наглядам нябачнай дарослай асобы, што міла стаюць у танок і бяруць адно аднаго за вільготныя, сумныя ручкі.

## XXIV

Яны рэдка бывалі на людзях, вечна сядзелі, зашыўшыся ў кватэрах, у глыбіні сваіх цёмных пакояў, і заўсёды былі напагатове.

Яны тэлефанавалі адзін аднаму, выведвалі, прыпаміналі, накідваліся на найменшую прыкмету, на самы драбнюткі знак.

Некаторыя захапляліся, выразаючы з асалодай аб'яву ў газэце, дзе казалася, што ягонай маці патрэбная швачка за падзённую аплату.

Яны памяталі ўсё, і раўніва сачылі; яны абступалі яго, трымаючыся за рукі й злучыўшыся ў шчыльнае кола.

Іх паслужлівае, пакорлівае братэрства, зь безаблічнымі, сьцёртымі тварамі — карагодам вакол яго.

І калі яны бачылі, як ён, сарамліва поўзаючы, спрабаваў прасьлізнуць між іх, яны жвавенька, разам, сядалі на кукішкі, апускаючы свае пераплеценыя рукі, і пільна ўтаропліваліся на яго свае пустыя і ўпартыя вочы, і амаль па-дзіцячаму ўсьміхаліся.


Пераклаў з францускае З.К.

**Генадзь Сагановіч**

НЕВЯДОМАЯ ВАЙНА

**Невядомая вайна — гэта вайна з Маскоўскай дзяржавай 1654-1667 гадоў, самая стратная для Беларусі за ўсю яе гісторыю. Акупанты зьнішчылі кожнага другога жыхара нашага краю, разрабавалі ды зруйнавалі амаль усе беларускія гарады й вёскі...**

*Гісторык Генадзь Сагановіч на грунце архіўных зьвестак аднавіў карціну таго часу, распавёў пра жорсткія бітвы, пра ганебную чыннасьць маскоўскіх акупантаў на беларускай зямлі, пра абарончыя дзеяньні беларускага войска й беларускіх партызанаў...*



Калі вам патрэбная такая кніга, паспрыяйце яе выданьню. Дзеля гэтага ў любой кнігарні можна аформіць паштоўку-замову. Кнігу «Невядомая вайна» ў 1992 годзе пляе выпусьціць менскае выдавецтва «БЕЛАРУСЬ».

# ШТО ЗДАРЫЛАСЯ?

***Анталёгія НН***

## На Каляды

*Сяло Хоміна Магілёўскай губэрні Горацкага павету.* У наша сяло зьехаліся на сьвята ўнукі аднаго паважанага чалавека, якія вучыліся ў горадзе. На першы дзень Калядаў, калі сьцямнела, яны паначаплялі бароды, прыляпілі вусы і, ходзячы пападваконьню вёскі, крычалі: «давайце грошы, а то спалім, заб'ем!» Пры гэтым вучні страшылі палкамі й палілі бэнгальскія серчыкі. Сяляне зачыняліся, як ад сапраўдных разбойнікаў, пакуль адзін з гаспадароў Д., выскачыўшы з хаты, не засьвяціў аднаму вучню качаргой па лбе. Само сабой, калі гэтыя хлопцы вырастуць і выйдуць у «людзі», то яны ня будуць шанаваць таго народу, паміж каторым узгадаваліся, бо цяпер, яшчэ дзяцьмі будучы, ужо вось што яны вытвараюць з простым чалавекам.

## Пасьля прадстаўленьня

*Пецярбург.* Навапабудаваны народны дом у Пецярбурзе пасьля прадстаўленьня, як ужо разыйшлася публіка, згарэў. Страты лічаць на соткі тысяч рублёў.

## Умерз

*У вёсцы Белым Віленскай губэрні Вялейскага павету* адзін чалавек, прапіўшы свайго кажуха, пайшоў дамоў па марозе і пад вакном свае хаты Богу душу аддаў. Засталася жонка з малымі дзеткамі.

Зьмітрок Бядуля.

## Урад падажджэ

*Бэрлін.* Нямецкі ўрад на пісьмо кітайскага пасла аб прызнаньні кітайскай рэспублікі адказаў, што падажджэ, пакуль кітайскую рэспубліку прызнаюць іншыя дзяржавы.

## Здарылася ўбіўства

*Вільня.* У Вільні ў нядзелю здарылася ўбіўства ў белы дзень, сярод людняй вуліцы. Інжынэр Мажэйка, спаткаўшы на рагу вуліцы Віленскай і Ягораўскага праспэкту жонку сваю, каторая ішла са студэнтам Ліфшыцам, нічога ня кажучы, дастаў з кішэні рэвальвэр, стрэліў у Ліфшыца й забіў яго на мейсцы. Пасьля ўбіўства Мажэйка сеў аддаў рэвальвэр паліцыі, а сам, сеўшы на ізвозчыка, паехаў у паліцыю і аддаўся ў рукі паліцыі.

## Стрэльбу ў рукі ня ўзяў

*Менск.* Ваенны суд разглядаў справу салдата Салаўёва, каторы адмовіўся браць стрэльбу ў рукі, бо, як ён казаў, грэх вучыцца людзей забіваць. Салаўёва прысудзілі на 4 гады ў арыштанцкія роты.

## За што арыштавалі камуністаў

*Масква.* Нядаўна арыштавалі ў Маскве 12 чалавек анархістаў-камуністаў, у каторых пры вобыску знайшлі бомбы. Пасьля гэтага, зрабіўшы вобыскі ў акалічных гарадох, маскоўская ахрана арыштавала яшчэ 30 чалавек, а ў Бранску адкрылі цэлую фабрыку розных ладункаў і бомбаў, таксама колькі людзей арыштавалі.

## Неадэкватная мера

*У прысёлку Сідаравіч* у аднаго багатага гаспадара была парадная сямейка, як баб так і мужчын, і самы малодшы зь іх крэўчык быў яшчэ не жанаты і яму, як відаць, заманулася жаніцца, а тут старэйшыя не пазваляюць, хоць ты ім кол на галаве чашы. Тады ён прыдумаў вось якую штуку: прыгледзеўшы, як бабы варылі зацірку на вячэру, падсыпаў туды добрыя прыгаршчы блёкату, а тыя як нахлёбаліся, дык і пайшлі выранджаць усялякія штукі. Адныя пяюць, другія выюць, трэйція галосяць: дзеці пазалазілі пад печ ды дзяруць казлы, а старыя скачуць па хаце, паскідаўшы сарочкі, як кажуць, у прапрадзядоўскім уборы: аж жудка, што там нарабілася. Назаўтра, казалі, прывозілі знахара, але беднаму крэўчыку жаніцца як не давалі, так і не даюць.

Стары Улас.

## Два выхады з аднае сітуацыі

*Каля Воўпы Гарадзенскай губэрні.* Любілі два хлопцы адну дзяўчыну, але яна не хацела выходзіць за ніводнага зь іх замуж. Вось аднаго разу пайшла гэтая дзяўчына ў царкву, у лесе дагналі яе тыя хлопцы й забілі. Быў суд: хлапцоў засудзілі на 15 гадоў катаргі.

*В.Лойсьцікі, Гарадзенскай губэрні.* У нас да аднэй дзяўчыны прыехала чацьвёра сватоў з другіх вёсак, а хлопец з сваёй вёскі, каторы тую дзяўчыну любіў, сеў за печ і давай плакаць. Сваты пайшлі ні з чым.

А.Т.

Наша Ніва, 1912.


Культурна-асьветная суполка беларусаў МАШЭКА

*стварыла аргкамітэт дзеля падрыхтоўкі*

**сусьветнага фэстывалю беларускае песьні,**

*які мае адбыцца ў Магілеве ў траўні 1992 году.*

Усіх ахвотных замежных і тутэйшых беларускіх выканаўцаў і гурты запрашаем да ўдзелу ў гэтым фэстывалі.

Тэл. для даведак 22-54-19 у Магілеве.
Наш часовы адрас: 212000, Магілеў, Дом Саветаў, п.650.


*Віленскі клюб аматараў беларускае народнае творчасьці «Сябрына»*

*шчыра дзякуе аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Кліўлендзе (ЗША) за грашовую дапамогу ў памеры $ 500.*

На выданьне *Нашае Нівы*

наступныя грошы

# ахвяравалі:

**Г.Давідзюк** *зь Менску* 100 р.
**Агей Вайніловіч** *з Клічава* 50 р.
**Мікола Ермалаеў** *з Полацку* 10 р.
**Альбіна Чапкоўская** *зь Менску* 50 р.
**Віктар Супрунчук** *зь Менску* 500 р.
**Ул.Арлоў і В.Аксак** *зь Менску* 100 р.
**Уладзімер Губскі** *зь Вітэбскай вобл.* 50 р.
**Рыгор Яўсееў** *зь Менску* 15 р.
**Валяньцін Рабкевіч** *зь Менску* 15 р.
**Т.Зарыцкая** *зь Менску* 10 р.
**Яўген Лецка** *зь Менску* 50 р.
**Васіль Сёмуха** *зь Менску* 25 р.
**Вольга Куртаніч** зь Менску 9 р.
**Рыгор Барадулін** *зь Менску* 100 р.
**Генадзь Шупенька** *зь Менску* 10 р.
**Віктар Шніп** *зь Менску* 20 р.
**Васіль Зуёнак** *зь Менску* 10 р.
**Адольф Шыдлоўскі** *з Сахаліну* 70 р.
**Г.Канцова** 40 р.
**Студэнт-берасьцеец** 170 р. (1 стыпэндыя)
**Яўген Шыраеў** 10 р.
**Сяргей Панізьнік** *зь Менску* 5 р.
**Уладзімер Дзехцярук** *з Эстоніі* 5р.
**Лілея Плыгаўка** *зь Вільні* 10 р.
**Мікола Ермаловіч** *з Маладэчна* 20 р.
**Невядомы** *зь Менску* 40 р.
**Алег Белагалоў** *з Магілеву* 4 р.
**Генадзь Карчэўскі** *з Магілеву* 10 р.
**Алена Мухіна** *з Магілеву* 5 р.
**Ігар Шары** *з Магілеву* 5 р.
**Суполка «Машэка»** *з Магілеву* 25 р.
**Уладзімер Неўдах** *зь Менску* 15 р.
**П.Тарасевіч** *зь Менску* 100 р.
**В.Скарабагатаў** *зь Менску* 30 р.
**А.Кеда** *зь Менску* 10 р.
**Хор опэрнага тэатру** *зь Менску* 60 р.
**11 зьняволеных** *Наваполацкае калёніі* 23 р.
**Вітаўт Кіпель** *з ЗША* $50
**Часлаў Кудаба** *зь Вільні* 30 р.

**Вялікі дзякуй!**

**Шаноўныя чытачы.**
**Калі вы хочаце й можаце дапамагчы *Нашай Ніве*, дапамажыце.**
**Фундацыю на *НН* трэба пераказваць поштай на адрас:**

232051, Вільня, а/с 2425, Кардзіс Людвіка,

**альбо на разьліковы рахунак закрытага акцыянэрнага таварыства «Наша Ніва» ў Вільні:**

S-TA № 3467685 KOMERCINIANE BANKE «VILNIAUS BANKAS» S-TA № 161303 LIET. BANKE SKYR. KODAS 260101541.

# *Паштовая скрынка*

*Юрасу К. зь Вітэбску.* Статут ВКЛ напісаны старабеларускай мовай. Дзеля таго, каб данесьці сэнс тэксту да сучаснага чытача, трэба цалкам адаптаваць гэты тэкст да сучасных моўных нормаў. Словам, «абсучасьніць» Статут, як юрыдычны дакумант. Гэта адзін варыянт. Другі — індывідуальная літаратурная апрацоўка тэксту, перастварэньне, калі захоўваюцца галоўныя асаблівасьці мовы, каларыт арыгіналу, а сучасны творца робіцца саа ўтарам стваральнікаў арыгіналу. Гэта ўжо «паднаўленьне» Статута, як помніка літаратуры й мовы. Два гэтыя варыянты — дзьве зусім розныя задачы: «тэхнічная» й «лірычная». Вырашаць іх адначасова немагчыма. Інакш атрымаецца тое, што ў Вас і атрымалася. Пераклад ня мае ніякіх функцыянальных ці мастацкіх перавагаў над арыгіналам, і прасьцей карыстацца другім. Адбіваецца яшчэ й вельмі «своеасаблівая» мова, якая не прасьвятляе, а затлумляе сэнс тых думак, якія Вы спрабуеце перадаць, абіраючы для перакладу складаныя тэксты. Кожную літаратуру складаюць эстэтычныя й лягічныя сутнасьці, і чым больш яны празрыстыя, незатлумёныя шматслоўнасьцю й лексічнымі выкрутасамі, тым больш вартая гэта літаратура. З усяго дасланага Вамі ў *НН* такім патрабаваньням адпавядае хіба што «Ухвала сьвітаньню»: «Гары Красна! Гары Красна! Гары Рана! Гары Рана!»

*Міхасю Б. з Полацку.* Пра халоднае сьвята кнігі пісаць позна, але сувязі з Вамі парываць ня хочам.

*Марку Далёкаму з Масквы.* Ад рэальнасьці Вы заканс ьпіраваліся, але гэтага яшчэ мала, каб выйсьці на мастацкае абагульненьне. Гэта крыўда ці помста? Чаму другі асобнік?

*Францішку М. зь Менску.* Калі чалавек адкрывае для сябе мову, суладнасьць гукаў і словаў — гэта цудоўна. Чалавек пачынае складаць вершы. Словы, здаецца яму, значаць нашмат больш, чым на самой справе. Зачараваныя моваю беларусы вельмі часта пачынаюць складаць вершы. І гэта таксама цудоўна. Але складаць вершы й ствараць паэзію — заняткі хоць і падобныя, ды зусім розныя. Пішыце для сябе. Чытайце болей сапраўднае паэзіі. І толькі калі адчуеце, што стварылі нешта арыгінальнае, тады, можа быць, дасылайце ў друк.

*Анатолю Л. зь Дзяржынску.* Вершы сапраўды слабыя, нішто ня сьведчыць пра тое, што гэта ВАШЫЯ вершы. А бяз гэтага ня можа быць паэзіі. Аб'яву таксама друкаваць ня будзем. Бо так ня робяць ані Чэйзы, якія спачатку пішуць, а пасьля прадаюць, ані Купалы, якіх мала хвалюе, ці акупяцца іхнія творы. Схадзіце ў таварыствы фантастаў ці дэтэктыўшчыкаў — пераканайце іх, што Вы — Агата Крысьці. Нас Вы не пераканалі.

*М.Н. з Петэрбургу.* Па адным «падражаньні» Вашага сябра цяжка меркаваць, які ён «таленавіты літаратар», што ён увогуле піша, і што ён, нарэшце, хацеў сказаць.

*Мікалаю Вярынскаму з Бабруйска.* З таго адрасу, які вы даслалі, газэту нам вяртаюць. Што да гісторыі з партызанамі, — напішыце канкрэтна, хто, дзе й калі.

*Лаўрэну Ж. з Гомля.* Усё так, але чаму другія асобнікі?

*Ул.Ірбісу зь Менскай вобласьці.* Пра тое, што вы пішаце, газэты ўжо паведамлялі. Пішыце СВАЁ.

*Юрыю П. зь вёскі Чысьць Маладэчанскага раёну.* Кнігу Генадзя Сагановіча «Невядомая вайна» абяцае надрукаваць выдавецтва «Беларусь», калі яму — выдавецтву — будзе дастаткова чытацкіх замоваў. Вам трэба ў сваёй кнігарні паводле тэмпляну выдавецтва «Беларусь» аформіць паштоўку-замову ці некалькі такіх паштовак. У кнігарні ведаюць, як гэта робіцца. Гутарку з М.Ермаловічам мы не плянавалі, але гэта добрая ідэя. Што да кнігі «Старажытная Беларусь», дык — шукайце дзе на правінцыі.

*Юрку Л. зь Менску.* Добры артыкул, але друкаваць мы яго ня будзем. Бачыце, маладыя крытыкі часам пачынаюць з абструкцыі беларускага літаратуразнаўства і сьцьвярджаюць ягоную непатрэбнасьць. І слушна робяць. Канструктыўна раскрытыкаваўшы шэраг аўтараў і артыкулаў, Вы дэманструеце ўласную перавагу ў лёгіцы й веданьні прадмета. І таксама слушна робіце. Але далей, упікнуўшы чарговую калектывізацыю беларускай крытыкі й заклікаўшы да індывідуалізму, Вы самі пачынаеце ставіць літаратуразнаўству задачы ідэйна-тэматычнага, так бы мовіць, зьместу. А яму не задачы трэба, а вырашэньні. Яшчэ Пікаса сказаў — «не шукаць трэба, а знаходзіць». Бог зь ім, зь непатрэбным нікому літаратуразнаўствам. І Бог яму судзьдзя. Ад Вас жа чакаем чагось самакаштоўнага, хоць бы й на адну з прапанаваных Вамі беларускаму літаратуразнаўству тэмаў. Гэта цалкам можа быць і крытыка, але толькі не не «аргкрытыка».

*Вітаўту К.* Напэўна, гэта ня тыя з Вашых вершаў, якія мы будзем друкаваць.

*Паўлюку Б. зь Менску.* Бачна, што гэта першая Ваша аповесьць. Можа быць, з трэйцяй ці зь сёмай пачнем публікаваць. Болей чытайце, Гарэцкага, напрыклад, Стральцова...

*Валерку Б. зь Менску.* Калі Вы філёляг, дык мусіце ведаць, што такое эстэтыка. Гэта тая ці іншая сума прынцыпаў, паводле якіх творыцца тое ці іншае мастацтва. Гэта кодэкс законаў. Гэта тое, чаго зусім няма ў Вашых вершах.

**ШЛЯХЕЦТВА:**
**сёньня гэта забава,**
**а заўтра, магчыма,**
**эканамічная праблема.**

Калі Вашыя продкі — шляхецкага роду, і Вы хочаце мець выяву свайго гербу, генэалягічную схему ды іншыя дакументы пра свой род — мы дапаможам Вам. Узгадайце хоць бы некалькі імёнаў Вашых продкаў (дзядоў і прадзедаў), мяйсцовасьць іхняга паходжаньня ці зямельных уладаньняў, назву герба. Узгадайце і разам з дакладным напісаньнем Вашага прозьвішча дашліце нам, на адрас рэдакцыі. Вы абавязкова атрымаеце адказ. Пры наяўнасьці паштовага перказу на 25 рублёў наш архівіст адразу пачне пошук. Калі Ваш радавод зацікавіць рэдакцыю й Вы самі ня будзеце супраць, мы надрукуем матэрыялы ў газэце. У іншым выпадку за дадатковую аплату мы дашлем Вам матэрыялы пэрсанальна.

*Наша Ніва* — газэта для Вас і Вашых сяброў. Каб падпісацца на *Нашу Ніву*, перашліце адвольную суму грошай на адрас: **232051, Вільня, а/с 2425, Кардзіс Людвіка**, альбо **220131, Менск, а/с 229, Чубрык Кацярына.** Калі Вы атрымаеце нумароў на дасланую суму, мы паведамім Вам, што падпіску трэба працягнуць. Калі Вы жывеце ў Польшчы, грошы трэба пералічыць на конта **5526-80725-136 II PKO Białystok. Pismo Informacyjno-Kulturalne Wschodniej Białostocczyzny** *Czasopis* **(dla** *Našaje Nivy*). Кошт аднаго нумару 1000 злотых. Штосьці ўдакладніць можна па адрасе: 15-950 Białystok, ul. Suraska, 1. P.skr. 149. Tel. 210-33. У астатнім сьвеце падпіску зьбірае Сяргей Карніловіч з Кліўленду па адрасе: Byelarusian-Amerikan Community Center "Połacak", 11022 Webster Road, Strongville, OH. 44130, U.S.A. Attn: Mr. S.Karniłovič.


**Наша Ніва**
**Naša Niva**

**Беларуская газэта**
**заснаваная ў 1906 г.**
**адноўленая ў 1991 г.**

**Рэдакцыйная Рада**
**Выдавец Павал Жук**

**Адрас для допісаў:**
**232041, Вільня, а/с 2082**
**Адрас для грашовых перказаў:**
**232051, Вільня, а/с 2425. Кардзіс Людвіка.**

**Афсэтны друк.**
**Друкарня МАУ.**

**Замова**


© Naša Niva, 1991.